# Заходняя Эўропа.

Заходняя, або, дакладней кажучы, паўночна-заходняя частка Эўропы мае асабліва выгодны абрыс. Берагавая лінія гэтага краю надзвычайна зьвілістая і даўгая. Морскія затокі і букты глыбока ўразаюцца тут у контынэнт, і ўплывы мора адчуваюцца тут мацней, як у іншых абшарах Эўропы.

Раўніны займаюць тутака значна большую плошчу, як у Паўднёвай Эўропе. Гор і тут досыць многа, але гэтыя горы маюць выгляд звычайна нявысокіх масыўных горстаў з акругленымі вярхамі і адхоннымі схіламі. (Успомні пахаджэньне горстаў). З горстамі чаргуюцца ўзгаркаватыя нізіны і плоскаўзвышшы, часта, асабліва на поўначы, абшарпаныя і паабдзіраныя даўнымі ледавікамі або пакрытыя ледавіковым навалам. На поўдні замест ледавіковых адкладаў ляжаць на паверхні нягрубыя пласты лёэсу, але паўсюды грунты нанесеныя ў адзнаку ад мясцовых грунтоў, пашыраных па горных схілах Паўднёвай Эўропы.

Мерны морскі клімат без сьпякоты, але й без халадоў, пануе паўсюды ў Заходняй Эўропе. Нават тая частка Заходняй Эўропы, што ляжыць на поўнач ад падканцавоснага кола, пад уплывам Гольфштрому мае не халодны, а мерны клімат. Заходнія вятры з акіяну заўсёды прыносяць сюды вільгатнае надморскае паветра. Хмары і воблакі заўсёды плывуць па небасхіле, дажджу хапае як улетку, гэтак і ўзімку. Сьнег выпадае рэдка, ляжыць нядоўга, часта сходзіць і ня зьбіраецца за зіму грубым пластом, як на ўсходзе. З гэтай прычыны рэкі Заходняй Эўропы разьліваюцца не ўвясну, як у нас, а ўлетку, калі там параўнаўча прахалодна; узімку рэдка замярзаюць, і заўсёды зьяўляюцца глыбокімі і поўнаводнымі. Параходны рух адбываецца па рэках бязмаль-што цэлы год без перарываў. Дзікая расьліннасьць на захадзе Эўропы яшчэ меней уплывае на краявід, як на поўдні. Даўнейшыя мяшаныя лясы, якія пакрывалі калісь большую частку гэтага краю, замяніліся на нівы й сенажаці. Чалавек павысякаў, расьцерабіў, выкарчаваў лясы, а там, дзе лічыў патрэбным захаваць іх, завёў правільную лясную гаспадарку. Прыродныя лясы, у якіх пераважвалі букі, дубы, кляны, грабы і ліпы, зрабіліся рэдкасьцю. На іх месцы дзе-ні-дзе зьявіліся штучныя, узгадаваныя чалавекам лясы хвой ды іншых іглыстых дрэў. Толькі пад аховай уласьнікаў у сярэдняй



паласе Заходняй Эўропы засталіся невялікія пушчы, дзе можна знайсьці тыповыя заходня-эўропэйскія дрэвы, сярод якіх побач з ліставымі гатункамі варта заўважыць з іглыстых дрэў: нягной-дрэва або ціс, эўропэйскую ельніцу і эўропэйскую мадрыну. На поўначы, дзе лясоў яшчэ досыць многа, пануюць толькі хвоя, елка ды бяроза, а каля ўзьбярэжжаў Ледаватага мора няма аніякіх дрэўных расьлін, і ўся расьліннасьць складаецца з лішаёў і моху.

Дзікія жывёлы яшчэ меней уплываюць на краявід Заходняй Эўропы. Толькі па парках ды нечапаных пушчах жывуць напалову свойскія алені, даніэлькі, трапляюцца дзікі, сарны, мядзьведзі, ваўкі ды лісы.

Краявід у Заходняй Эўропе залежыць галоўным чынам ад чалавека. Тут гушчыня залюдненьня яшчэ большая, як у Паўднёвай Эўропе. Асабліва густа залюднены краіны, багатыя пакладамі карысных мінэралаў. Там мільёны людзей займаюцца нетракапальнай прамысловасьцю, здабываюць каменны вугаль, жалезную руду, працуюць у руднях, капальнях, гутах і гісэрнях. Лес фабрычных комінаў, дым памешаны з туманам, праз які ледзь прабіваецца ўдзень сонечнае, а ўначы электрычнае сьвятло, закопчаныя твары работнікаў у скураных сьвітках,—вось што застаецца ў памяці падарожніка, які пабываў у прамысловых краінах Заходняй Эўропы. Нетракапальнай і фабрычнай прамысловасьцю займаецца большасьць насяленьня гэтага краю. Сельская гаспадарка стаіць на другім пляне.

Праўда, што і яе становішча тутака вельмі высокае. Зямля вырабляецца старэнна, дае вялікія ўраджаі, але ня можа пражывіць усё насяленьне абшару. З гэтай прычыны заходня-эўропэйскія краіны мусяць купляць збожжа за межамі, у іншых краёх, куды накіроўваюць у замену продукты сваёй нетракапальнай і фабрычнай прамысловасьці.

У Заходняй Эўропе многа болей гарадоў, як у іншых абшарах нашае часткі сьвету. У гарадох жыве большасьць усяго насяленьня. Часта там трапляюцца вялізныя гарады па некалькі сот тысяч насельнікаў у кожным, гарады з вялікімі шматпаверхавымі будынкамі, з буйнымі фабрыкамі, з бойкім гандлем. Дробныя паселішчы рэдка маюць выгляд вёсак. Сяляне жывуць пераважна па фэрмах або хутарох, абкружаных харошымі садочкамі і маленькімі старэнна ўзоранымі палямі.

Заходняя Эўропа зьяўляецца самым культурным абшарам нашага контынэнту і адным з самых культурных на зямлі. Няпісьменных тамака вельмі мала, і нават сялянскія дзеці вучацца звычайна ў сярэдніх школах.

Высокім становішчам асьветы тлумачыцца і высокае становішча ўсіх галін гаспадаркі. Кожны кавалак зямлі, кожнае прыроднае багацьце апрацоўваецца чалавекам як мага пайней. Чалавек карыстаецца ўсімі спосабамі, усімі навуковымі ведамі, каб ня даць якому-колечы прыроднаму багацьцю прапасьці марна або ляжаць бяз ужытку.

Па сваім абліччы насельнікі Заходняй Эўропы выразна адразьняюцца ад паўднёвых эўропэйцаў. Гэта пераважна высокія, сьветласкурыя, бяля-

выя людзі з даўгім чэрапам і блакітнымі вачыма. Сярод моў пераважваюць гэрманскія, хаця на ўскрайках трапляюцца народы, якія ўжываюць іншыя мовы (якія?).

Паважнасьць, пакойнасьць, самапэўнасьць адразьняюць эўропэйцаў паўночна-заходніх ад паўднёвых.

Паводле асаблівасьцяй прыроды і люднасьці Заходнюю Эўропу можна падзяліць на 7 старон: Ісляндыю, Брытанскія астравы, Фінска-Скандынаўскі паўвостраў і Гэрманскую старану, у якіх пераважваюць гэрманскія мовы, Францускую старану з перавагай романскіх моў, і Польшчу і Чэскі масыў, у якіх большасьць складаюць славяне.

## Ісляндыя.

У паўночнай частцы Атлянтычнага акіяну каля падканцавоснага кола ляжыць асобны, досыць вялікі востраў Ісляндыя. (Азнач палажэньне гэтага вострава). Гэта—плоскаўзвышша, складзенае з астыглай лявы і багатае дзейнымі і згаслымі вульканамі. Найвялікшы з дзейных вульканаў Гекла (1557 мэтраў н. р. м.) за апошнюю тысячу гадоў даў 18 магутных страшэнных выбухаў. Апроч Геклы, на востраве ёсьць яшчэ каля двох дзесяткаў дзейных вульканаў, некаторыя з якіх стаяць па некалькі ў шэраг і выкідаюць цераз свае жэралы ляву ўсе разам, адначасна. Месцам лява вылівалася проста праз шчыліны ў земнай кары, якія цягнуцца на дзесяткі вёрст. Згаслых вульканаў тут яшчэ болей, як дзейных; да іх належаць і самыя высокія горы Ісляндыі (Орэфа-Ёкуль мае ўвышкі 1959 м. н. р. м). Выкінутая вульканамі лява месцам астыгла толькі на сваёй паверхні, а пад сподам, у глыбіні, яшчэ й да сяго часу засталася гарачай, можа нават і не ацьвярдзелай. Крыніцы, што выходзяць з-пад зямлі, у такіх месцах маюць цёплую, а часамі гарачую, як вар, ваду. Некаторыя з гэтых крыніц рэгулярна выкідаюць вар фонтанам на значную вышыню ў паветра. Такія крыніцы завуцца гэйзарамі, а выбухі іх тлумачацца тым, што ў гарачай вадзе іх яшчэ пад зямлёй утвараецца пара, якая пэрыодычна раптам вырываецца ў паветра і цягне з сабой ваду.

У ледавіковую эпоху ўсю Ісляндыю пакрываў вялікі ледавік; да сучаснага моманту засталіся толькі маленькія рэшткі яго, але й цяпер прыблізна сёмую частку вострава апранае вечны сьнег і лёд. У тых мясцовасьцях, якія ляжаць пад сьнегам і лёдам, асабліва небясьпечнымі зьяўляюцца выбухі вульканаў. У час выбуху раптам растае шмат лёду і сьнегу, вада ад якіх залівае паселішчы, гароды, поплавы.

Берагі Ісляндыі на поўначы, на захадзе і на ўсходзе зрывістыя, скалаватыя, высокія, пашматаныя глыбокімі вузкімі затокамі, а на поўдні, наадварот,—берагі адхонныя, пескаватыя, нізкія, роўныя. Дзякуючы Гольфштрому, на дарозе якога ляжаць паўднёвыя берагі вострава, мора там не замярзае



ніколі; наадварот, паўночныя берагі знаходзяцца пад уплывам халоднай адканцавоснай плыні, і там па моры заўсёды плаваюць вялізныя крыгі—лёдавыя горы (айсбэргі). У залежнасьці ад гэтых плыняй і клімат Ісляндыі на поўдні значна цяплейшы, хаця наагул паўсюды можа лічыцца мерным, мяккім, морскім, прахалодным.

У сталіцы Ісляндыі Рэйк'явіку сярэдняя тэмп. году +3,3°, сяр. тэмп. самага халоднага месяца (лютага)—3,1°, самага цёплага (ліпеня) +11,8°; ападкаў за год там выпадае 750 мілім.

На поўдні вострава сьнег ляжыць доўга толькі на горах, на нізінах-жа растае і сходзіць некалькі разоў узімку, бо зіма тамака досыць мяккая, маразы чаргуюцца з адлігамі. Затое і лета там хмарнае, халоднае, заўсёды ймгла, туман, рэдка калі на хвілю з-за воблакаў выгляне сонца.

Лес ня можа расьці ў такім клімаце. Для дрэў замала сонца й цяплыні. Хіба толькі хмызьнячкі лазы, падканцавоснай бярозкі ды рабіны сустракаюцца дзе-ні-дзе па паўднёвых схілах Ісляндзкага ўзвышша. Затое трава, мох і лішаі (напрыклад, лішай „ісляндзкі мох") растуць там добра. Шмат ягад даюць буякі ды чарнічнік. Збожжа не дасьпявае ў гэтай староньцы, але бульба, капуста і рэпа часамі прыносяць добры ўраджай. З дзікіх жывёл спатыкаецца пясец або блакітны ліс і зьдзічэлы, завезены туды чалавекам гадоў 150 назад паўночны алень. Даволі многа сустракаецца птушак, пераважна морскіх. Найкарысьнейшай з іх трэба лічыць гагу, каштоўны пух якой насельнікі вострава зьбіраюць ды прадаюць за межы. У моры трапляецца багата рыбы, так што каля 18% люднасьці займаецца рыбацтвам. Па лугох пасьвяць многа дамовай жывёлы, асабліва авечак і быдла (на 95000 насельнікаў краю прыпадае 24000 штукі быдла і 842000 авечак). Сушаная й салоная рыба, воўна, панчохі, бараніна, лой, скура нэрпаў, пух гаг, хутры лісаў вывозяцца за межы.

Насельнікі вострава належаць да даньска-нарвэскай галіны гэрманскіх народаў.

Ісляндыю вынайшлі й залюднілі ў 874 г. даўныя нарвэжцы—сьмелыя мараходцы-вікінгі. Патомкі іх, жывучы далёка ад іншых народаў, не маглі мяшацца з суседзямі і да сяго часу ўжываюць стара-скандынаўскую мову і пяюць песьні ды казкі-сагі аб старасьвецкіх скандынаўскіх асілках. Захаваўшы даўныя звычаі і норавы, ісляндцы аднак паставілі ў сябе досыць высока асьвету. Няпісьменных сярод іх няма, большасьць атрымоўвае сярэднюю і нават вышэйшую адукацыю.

Ісляндцы політычна з даўных часоў залежалі ад Даньскай дзяржавы, але карысталіся самаўрадам. Цяпер Ісляндыя самастойная дзяржава (104785 кв. клм., 95000 населенікаў), мае свой парлямэнт, але лічыцца злучанай з Даніяй, кароль якой адначасна зьяўляецца каралём Ісляндыі.

Сталіца Ісляндыі—Рэйк'явік—па сваёй велічыні зьяўляецца хутчэй вёскай, чымся горадам, але адзначаецца чыстатой і прыгожасьцю, мае гімназію і нават унівэрсытэт з богаслоўскім і мэдыцынскім аддзеламі.

На паўдарозе між Ісляндыяй і Брытанскімі астравамі ляжаць вульканічныя *Фарэрскія* або Авечыя астравы. Клімат гэтых астравоў вельмі вільгатны і параўнаўча цёплы.

(Сярэдняя тэмп. студзеня +3,2°, ліпеня +10,8; ападкаў—1600 мілім.).

Насельнікі зьбіраюць гагачы пух, яечкі розных морскіх птушак, ловяць рыбу, але галоўным чынам займаюцца гадоўляй авечак. Фарэрскія астравы належаць да Даніі.

# Брытанскія астравы.

(Азнач географічную шырыню і даўжыню Брытанскіх астравоў. Якія моры іх атачаюць? Якія пратокі аддзяляюць іх ад контынэнту Эўропы? Якія астравы ўваходзяць у склад Брытанскіх? Якое мора аддзяляе Вялікабрытанію ад Ірляндыі?).

Брытанская старана складаецца з двох вялікіх астравоў: Вялікабрытаніі і Ірляндыі і некалькіх дробных. Па сваёй прыродзе гэта—тыповая частка Заходняй Эўропы, вельмі падобная да суседніх старон контынэнту. Быў час, што Брытанскія астравы былі й самі часткай гэтага контынэнту, а пратокі Ляманш і Па-дэ-Кале, што цяпер адлучаюць Вялікабрытанію ад Францыі, былі сухазем'ем.

Мераючы глыбіню гэтых пратокаў і суседняга Нямецкага мора, знайшлі, што па іх дне пралягаюць падморскія даліны, якія цягнуцца ад вусьцяў сучасных рэк аж да адкрытага Атлянтычнага акіяну. Гэта даліны даўных рэк, што беглі па даўным сухазем'і, якое цяпер перавярнулася ў мора. Падморскі працяг даліны Тэмзы, галоўнай брытанскай ракі, злучаецца з працягам даліны Рэну, які ўліваецца ў Нямецкае мора з контынэнту насупроціў Тэмзы. Адгэтуль відаць, што даўней Тэмза была прытокай Рэну, а Паўднёвая Вялікабрытанія разам з Заходняй Нямеччынай і Паўночнай Францыяй уваходзіла ў склад адзінага рэчнага вадазбору.

Мора, асабліва на захадзе, глыбока ўразаецца ў берагі Брытанскіх астравоў многалічнымі затокамі і буктамі, выгоднымі для прыстою караблёў. (Пераглядзі па карце назовы галоўных заток, урэзаных у Вялікабрытанію). Асабліва глыбока ўразаюцца ў сухазем'е даўгія лейкавідныя затокі (напр., Брыстольская), слынныя тым, што ў іх асабліва моцна адчуваюцца морскія прыплывы. Морскія затокі разьдзяляюць астравы на некалькі асобных паўвастравоў, так што абрыс старонкі крыху падобны да абрысу Грэцыі. (Пераглядзі назовы галоўных паўвастравоў Вялікабрытаніі).

Паверхня галоўных астравоў даволі markedly рознастайная. Спрадвечныя хмурыя горставыя горы чаргуюцца з вялікімі роўнымі або ўзгаркаватымі нізінамі. На поўначы Вялікабрытаніі, у так званай Шотляндыі, горсты маюць плоскія вярхі і зрывістыя схілы, паабдзіраныя даўнымі ледавікамі. У паўднёвай Вялікабрытаніі, а таксама ў Ірляндыі вярхі гор акругленыя, схілы адхонныя, сьлядоў ледавіковай дзейнасьці мала.



Дзякуючы беспасрэднаму ўплыву Гольфштрому клімат Брытанскай старонкі, асабліва на захадзе, вельмі роўны і вільгатны. Бязмала заўсёды кропіць дождж, заўсёды туманна, хмарна. Маразы бываюць хіба толькі ў горах, звычайна-ж зіма цёплая, як у Паўднёвай Эўропе. Рэкі ніколі не замярзаюць; сьнег на нізінах доўга не ляжыць. Улетку сонечныя дні бываюць, дый то ня часта, толькі на ўсходзе. Наагул кажучы, лета такое, як на ўзьбярэжжы Белага мора каля Архангельску. У Шотляндыі па схілах гор растуць хваёвыя бары; Паўднёвая Вялікабрытанія, або Ангельшчына, і Ірляндыя належаць да пасу мяшаных лясоў, але лясоў паўсюды засталося мала (каля 4% прасторы). Большая частка зямлі знаходзіцца пад поплавамі ды пашай, па якой, з прычыны цёплай бясьсьнежнай зімы, жывёлу можна пасьвіць без перарыву цэлы год. Трава паўсюды расьце вельмі добра, як дзе-небудзь на альпійскіх лугох. Павабнай аздобай краявіду зьяўляюцца „паркі", у якіх штучна захованыя гайкі букаў і іншых дрэў чаргуюцца з лугавінамі і сенажацямі. Буйныя землеўласьнікі, да якіх належаць гэтыя паркі, трымаюць там для паляваньня аленяў, лісаў, зайцоў, фазанаў, курапат і г. д. Затое ваўкі й мядзьведзі, якія й да сяго часу трапляюцца ў пушчах контынэнту, даўно ўжо зьвяліся на Брытанскіх астравох.

Насяленьне Брытанскіх астравоў паводле мовы разьдзяляецца на ангельцаў і кельтаў. Паангельску гаворыць 5% усяго насяленьня. Старадаўная кельцкая мова захавалася толькі на захадзе Ангельшчыны (на паўвостраве Уэльсе), на захадзе Шотляндыі, на захадзе Ірляндыі ды па некаторых дробных астравох.

Кельты лічацца пачатковымі тубыльцамі краю, хаця магчыма, што раней за іх тут жылі ібэрыйцы, з якімі кельты перамяшаліся. У час вялікіх перасяленьняў на ўсходзе Вялікабрытаніі асталяваліся розныя гэрманскія пляменьні: англы, саксы і іншыя, якія часткай адціснулі кельтаў на захад, часткай перамяшаліся з імі. З часам (у XI веку) з Францыі сюды перасяліліся яшчэ нормандцы, якія занесьлі адтуль францускую мову і звычаі. Вынікам зьмяшаньня нормандцаў з англа-саксамі зьявілася новая ангельская нацыя. На поўдні Вялікабрытаніі ўтварылася магутная дзяржава Ангельшчына. Толькі паўвостраў Уэльс досыць доўга бараніў ад ангельцаў сваю незалежнасьць, а сваю даўна-кельцкую мову захаваў аж да сучаснага моманту. У Шотляндыі правадыром гэрманскіх пляменьняў не пашанцавала стварыць сваёй дзяржавы. Наадварот, кельты тамака перамаглі перасяленцаў, так што ўтвораная там Шотляндзкая дзяржава была кельцкай нацыянальнай дзяржавай. Таксама ў Ірляндыі кельцкія пляменьні згуртаваліся ў адзіную Ірляндзкую дзяржаву.

Дзякуючы выгаднейшаму палажэньню каля самага контынэнту, дзякуючы роўнай паверхні, лепшаму клімату і лепшым грунтом, Ангельшчына была самай багатай і самай магутнай

з дзяржаў, якія ўтварыліся на Брытанскіх астравох. Спачатку Уэльс, потым Ірляндыя, нарэшце й Шотляндыя падпалі пад яе панаваньне і зьліліся ў адну магутную дзяржаўную адзінку, у гэтак званае Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Ірляндыі, або карацей—у Брытанскую дзяржаву. Ангельская мова, якая лічыцца аднэй з гэрманскіх моў з дамешкай занесеных нормандцамі слоў францускага пахаджэньня, перакінулася на Ірляндыю і на Шотляндыю, так што кельцкія мовы захаваліся толькі ў самых няпрытульных куточках старонкі. Ня гледзячы на запазычаньне ангельскай мовы, ірляндцы й шотляндцы аднак да сяго часу воража глядзяць на ангельцаў і, ня гледзячы на векавую дзяржаўную злучнасьць, імкнуцца (прынамсі ірляндцы) атрымаць самастойнасьць.

У сучасную эпоху ўсе часткі Брытанскай старананы ўваходзяць у склад Брытанскай дзяржавы (312000 кв. клм., 48 мільёнаў насельнікаў). Па сваім дзяржаўным ладзе Брытанская дзяржава лічыцца конституцыйнай монархіяй. На чале яе стаіць кароль, але ўся законадаўчая ўлада знаходзіцца ў руках парлямэнту, які складаецца з дзьвёх палат (палаты лёрдаў і палаты народных прадстаўнікоў). Ірляндыя мае свой асобны парлямэнт. Выканаўчая ўлада ў Вялікабрытаніі належыць да рады міністраў, адказных перад парлямэнтам. Географічнае палажэньне Брытанскай дзяржавы трэба лічыць вельмі выгодным. Ангельшчына пануе над галоўнымі вадзянымі дарогамі Эўропы. Нямецкае і Балтыцкае моры зьяўляюцца лепшай дарогай адгэтуль на ўсход; Эльба і Рэн адчыняюць дарогу ў самае сэрца Нямеччыны; Шэльда і Сэна злучаюць тое-ж Нямецкае мора і Ляманш з сярэдзінай Францускай старонкі. З таго часу, як пачала залюдняцца Паўночная Амэрыка, а Атлянтычны акіян зрабіўся галоўнай сусьветнай гандлёвай дарогай, Ангельшчына апынулася ў самым асяродку культурнага сьвету. Узрастаньню і красаваньню яе дапамагала й самае палажэньне на астравох, бо перашкаджала варожым войскам забірацца ў Ангельшчыну і руйнаваць яе. Пашматаныя выгоднымі буктамі берагі, даступнасьць унутраных частак старана, багацьце на карысныя мінэралы,—усё гэта зрабіла Брытанскую дзяржаву самай гандлёвай стараной сьвету, самай магутнай морскай дзяржавай. Лёндон, яе сталіца, зрабіўся галоўным складачным месцам для тавараў, якія вывозіліся з Эўропы ў Амэрыку і іншыя заэўропэйскія краі, або прывозіліся ў Эўропу з заэўропэйскіх краін. Толькі ў час сусьветнай вайны 1914-18 гадоў Ангельшчына страціла першае ў сьвеце месца па вывазе й прывозе тавараў, бо за час вайны яе перагнала з гэтага боку Паўночна-Амэрыканская Злучаная Рэспубліка (Злучаныя Штаты). Болей за ўсё ў Ангельшчыну прывозіцца спажыўных продуктаў і рознай сырыны, а вывозяцца з Ангельшчыны пераважна вырабы ангельскіх фабрык і карысныя мінэралы.

У склад ангельскага гандлёвага флёту ўваходзіць каля 11000 вялікіх морскіх караблёў, так што на гэтым полі з Ангельшчынай ня можа раўняцца ніводная з іншых дзяржаў сьвету. Толькі ў час вайны ў Злучаных Штатах пачалі будаваць новыя морскія судзіны ў большым ліку, як будуюць у Ангельшчыне.



У 1914 годзе грузаёмістасьць ангельскіх гандлёвых караблёў дасягала 18.800.000 тон (тона=61 пуду), таго часу як нямецкія гандлёвыя караблі зьмяшчалі 5.100.000 тон, паўночна-амэрыканскія (Зл. Шт.)—1.840.000, норвэскія 1.920.000, а іншыя яшчэ меней. Пасьля вайны 14—18 г. грузаёмістасьць ангельскіх караблёў дасягнула 19.290.000 тон, паўн.-амэр.—12.310.000, а нямецкіх толькі 650.000 (бо Нямеччына перадала пераможцам большую частку свайго гандлёвага флёту).

Разам з пашырэньнем ангельскага гандлю павялічвалася і колькасьць брытанскіх уладаньняў. Да Брытанскай дзяржавы належаць найвялікшыя колёніі сьвету, разам з якімі Брытанская дзяржава зьяўляецца найвялікшай у сьвеце. За межамі Эўропы да яе належыць каля 35.000.000 кв. клм., амаль-што $^1/_4$ усяго сухазем'я. На гэтай прасторы жыве болей за 410 мільёнаў людзей, амаль што $^1/_4$ усяго чалавецтва. Апрача таго некаторыя краіны знаходзяцца пад брытанскім уплывам, хаця й ня лічацца яшчэ колёніямі. Сярод эўропэйскіх дзяржаў, якія ўладалі заморскімі колёніямі, Ангельшчына выявіла найвялікшую здольнасьць панаваць над паднявольнымі краямі, выявіла асаблівае мастацтва колёнізатарства. У сваёй колёніяльнай політыцы Ангельшчына заўсёды кіравалася правілам: „падзяляй і ўладай“. Напрыклад, найвялікшае сваё ўладаньне—Індыю—Ангельшчына падзяліла на дзьве групы адзінак. Адны індыйскія дзяржавы абвяшчаліся беспасрэдна неаддзельнай часткай Брытанскай дзяржавы, другім пакідаўся стары фэодальны лад і мясцовыя князькі, якія ня могуць аднак зрабіць аніводнага кроку без дазволу ангельскага прадстаўніка.

Меньш за ўсё мяшаюцца ангельцы ўва ўнутраныя справы тых сваіх колёній, у якіх жывуць эўропэйцы, галоўным чынам выхадцы з Ангельшчыны. Канада, Аўстралія, Новая Зэляндыя карыстаюцца шырокім самаўрадам, маюць свае мясцовыя соймы—парлямэнты—і свае міністэрствы. Фактычна гэтыя залюднены ангельцамі колёніі зьяўляюцца незалежнымі рэспублікамі, а губэрнатары іх, назначаныя мэтрополіяй, ня могуць выдаць ніякага загаду бяз подпісу абраных парлямэнтам міністраў. Аднак сувязь гэтых колёній з Ангельшчынай была да сяго часу вельмі моцнай і грунтуецца на супольных экономічных інтарэсах.

Брытанскія ўладаньні раскіданы ўва ўсіх частках сьвету, ува ўсіх географічных шырынях. У межах брытанскіх уладаньняў, як з пыхаю кажуць ангельцы, ніколі не заходзіць сонца. (Чаму?).

У Брытанскай дзяржаве вырабляецца ўсё патрэбнае для чалавека. Сама Ангельшчына дае вугаль і ўсялякія фабрычныя вырабы; Канада дае збожжа, дрэва, хутры; міжзваротнікавыя колёніі ў Амэрыцы (Ямайка, Бр. Гваяна, Бр. Гондурас і інш.)—цукер, ром, какао, бананы, ананасы, каву. З раўніковай Афрыкі (Нігеры, Бр. Усх. Афрыкі, Сьера-Леонэ, Залатога Берагу і г. д.) вывозяць каучук, пальмавы алей, сланёвую костку; з Эгіпту—рыс, баваўну; з Паўднёвай Афрыкі—воўну, золата, дыямэнты; з Індыі—джут, гарбату, цукер, баваўну; з Інда-Кітаю—рыс і каштоўнае тэкавае

дрэва. Праз Гонг-Конг вывозяцца кітайская гарбата, шоўк; з Малякі дастаўляецца цына; з Аўстраліі ды Новай Зэляндыі—мяса, воўна, золата; з Нью-Фаўндленду—рыба; з Акіяніі—копра (сушаныя кокосавыя гарэхі). Некаторыя з Брытанскіх колёній ня маюць вялікіх прыродных багацьцяў, але зьяўляюцца вельмі важнымі дзеля свайго географічнага палажэньня на гандлёвых морскіх дарогах. Гэта колёніі—морскія станцыі, на якіх грунтуецца вайскова-морская магутнасьць Брытанскай дзяржавы. У іх стаяць ангельскія вайсковыя караблі, на іх знаходзяцца склады вугалю для гандлёвых судзінаў. Ужо ў Эўропе ёсьць такія колёніі: Гібральтар пры выйсьці з Міжземнага мора і Мальта ў сярэдзіне гэтага мора. Такое-ж значэньне маюць: Адэн каля выйсьця з Чырвонага мора ў Індыйскі акіян, Сінгапур на паўднёвым рагу Малякі, Гонг-Конг і Вэй-Хай-Вэй у Кітаі. Грунтуючыся на гэтых колёніях-станцыях, трымаючы ў іх магутны флёт, ангельцы пашыралі свае ўплывы на суседнія старонкі. Так, з Гонг-Конгу і Вэй-Хай-Вэю ангельцы лёгка могуць уплываць на Кітай; асталяваўшыся ў Адэне, яны фактычна заўладалі Арабіяй. Дзякуючы багацьцям сваіх колёній, Брытанская дзяржава перад вайной, можна сказаць, кіравала сусьветным рынкам. Ангельскія грошы лічыліся найбольш пэўнай грашовай адзінкай: Лёндон быў грашовым асяродкам сьвету. Цяпер у значнай меры на гэтым полі Ангельшчыну замяняюць Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі.

Выявіўшы вялікі дзяржаўны розум у адносінах да сваіх заэўропэйскіх колёній, ангельцы часамі не маглі патрапіць здаволіць насельнікаў сваіх эўропэйскіх уладаньняў. Ірляндыю і Шотляндыю ангельцы ніяк не згаджаліся прызнаць за асобныя географічныя адзінкі, якія патрабуюць шырокага самаўраду. Толькі пасьля шматвяковай крывавай барацьбы Ірляндыя здабыла свой уласны сойм—парлямэнт.

Цікава, што маленькі востраў Мэн, які ляжыць у Ірляндзкім моры, з даўных часоў меў асобны парлямэнт, якога ніяк не магла здабыць досыць вялікая Ірляндыя.

Падзел Брытанскіх астравоў на 3 галоўных часткі: Ангельшчыну з Уэльсам, Шотляндыю і Ірляндыю, якія адпавядаюць 3-м галоўным даўным каралеўствам, што ўвайшлі ў склад Брытанскай дзяржавы, захаваўся да сяго часу. Кожная з гэтых частак мае свае асаблівасьці ня толькі ў прыродзе і люднасьці, але таксама ў кіраўніцтве, у справах суду і царквы. Найвялікшая з гэтых частак—Ангельшчына—складаецца з дзьвюх палоў: паўднёва-ўсходняй—раўніннай, у значнай меры сельска-гаспадарчай, і паўночна-заходняй—узгаркаватай або нават горнай, прамысловай. Абедзьве гэтыя краіны Ангельшчыны, зразумела, маюць шмат супольнага, бо люднасьць абедзьвюх складаецца пераважна з ангельцаў, але паводле прыроды і заняткаў насяленьня яны значна розьняцца адна ад аднэй, ды і ў люднасьці абедзьвюх ёсьць асаблівасьці. Кельцкія ўплывы лягчэй можна прымеціць на захадзе, таго часу як на ўсходзе жывуць тыповыя гэрманцы—



высокага росту, бялявыя, сьветласкурыя. Такім чынам асобнымі краінамі Брытанскай старонкі будзем лічыць: 1) Пд.-ўсх. Ангельшчыну, 2) Пн.-зах. Ангельшчыну, 3) Шотляндыю, 4) Ірляндыю.

**Паўднёва-ўсходняя Ангельшчына** зьяўляецца ўзгаркаватай або ледзь хвалістай раўнінай, вельмі падобнай па будове паверхні да паўночна-францускай нізіны, што ляжыць па-за Ляманшам на суседняй частцы Эўропэйскага контынэнту. Пласты земных парод ляжаць тутака паземна, і на поўнач ад ракі Тэмзы хаваюцца пад тонкім слоем ураджайных глiністых грунтоў, нанесеных даўным ледавіком. На поўдзень ад Тэмзы, як відаць, ледавік не дасягаў. Грунты і там пераважна добрыя; толькі на паўднёвым усходзе краіны на паверхню выступаюць неўраджайныя крэйдавыя ўзгоркі.

Як і паўсюды на Брытанскіх астравох, клімат у краіне досыць вільгатны; звычайна пануе хмарнае надвор'е. Маразы тут здараюцца вельмі рэдка, і самы халодны месяц (студзень) мае сярэднюю тэмпэратуру значна вышэйшую за 0° (у Лёндоне+3,5°). Параўнаўча з іншымі краінамі Брытанскага згуртаваньня астравоў, улетку тут значна цяплей (сярэдняя тэмпэратура ліпеня ў Лёндоне+17,9°) і часьцей бываюць ясныя сонечныя дні. Ападкаў у Паўднёва-ўсходняй Ангельшчыне выпадае многа меней, як на захадзе Вялікабрытаніі (у Лёндоне 610 мілім.).

Летняй цяплыні тут хватае для ўзрастаньня яблынь, ігруш, пшаніцы, хмелю і іншых садовых і палявых расьлін. Добра растуць тутака і такія дрэвы, як бук і дуб. Праўда, даўныя лясы гэтых дрэў ужо даўно зьнiклі ў краіне, але асобныя дрэвы і маленькія гайкі сустракаюцца паўсюды сярод лугоў і ніў і дадаюць Паўднёва-ўсходняй Ангельшчыне выгляд вясёлага, прыгожага, вялізнага парку.

Дзякуючы вільгатнаму клімату, рэкі краіны (пералічы галоўныя з іх паводле карты) маюць заўсёды многа вады, а дзякуючы роўнай паверхні яны адзначаюцца пакойным павольным цячэньнем. З гэтай прычыны яны зьяўляюцца добрымі ўнутранымі дарогамі. Вышнявіны гэтых рэк злучаны паміж сабой суднаходнымі каналамі, а лейкавідныя вусьці, дзякуючы морскім прыплывам, даступны для найвялікшых морскіх караблёў.

Выгоды зносін, ураджайныя грунты, параўнаўча цёплы клімат, асабліва-ж блізкасьць да контынэнту здаўна зрабілі Паўднёва-ўсходнюю Ангельшчыну галоўнай, найгусьцей залюдненай, найбагацейшай і найболей культурнай краінай на Брытанскіх астравох. Тут утварылася вялікая ангельская нацыя, энэргічная, здольная да працы і да гандлю, самапэўная, свабодалюбная.

Сумленнасьць, здаровыя погляды на жыцьцё, практычнасьць, уменьне дастасавацца да ўсякіх абставін, перамагчы ўсялякія перашкоды лічацца характэрнымі адзнакамі ангельцаў.

Ангельцы звычайна вельмі пышацца сваёй бацькаўшчынай і часам з пагардай глядзяць на чужаземныя парадкі. Часта ангельцы трымаюцца сваіх звычаяў нават тады, калі яны ўжо аджылі свой век. Характэрнай ангельскай традыцыяй зьяўляецца звычай асабліва ўрачыстага сьвяткаваньня нядзелі. У нядзелю зачыняюцца ўсе крамы, кавярні, корчмы; спыняюць працу ўсе ўстановы, усе фабрыкі і гуты; зьмяншаецца рух цягнікоў і параходаў. Кожны імкнецца правесьці дзень у сваёй хаце, у сваёй сям'і або адпачыць дзе-небудзь на вёсцы, як мага далей ад клуму гарадоў.

Жыць у вялізных будынках пад аднэй страхой з чужымі людзьмі ангельцы ня любяць. Па магчымасьці кожны ангелец імкнецца завадзіць сваю ўласную, хаця-б і невялікую, хату. З гэтай прычыны вялікія ангельскія гарады заўсёды абкружаны вялікімі прадмесьцямі, у якіх месьцяцца гарадзкі люд у асобных будынках у вольны ад працы час. (Звычайна гэтыя будынкі, так званыя котэджы, маюць 2-3 паверхі па адным або па 2-3 пакоі ў кожным паверсе). Люднасьць многапаверхавых камяніц у асяродках гарадоў уначы зьмяншаецца ў некалькі разоў. Толькі ўдзень туды зьбіраюцца людзі з ускрайкаў данага места.

Аднак ангельцы ня ўнікаюць ад грамадзянскага жыцьця. Наадварот, грамадзянства грае ў Ангельшчыне значна большую ролю, як на контынэнце Заходняй Эўропы. Грамадзянства кіруе школьнымі справамі, судом і ўсім мясцовым жыцьцём. Усялякія гурткі, таварыствы, хаўрусы маюць тут асабліва вялікую вагу.

Улюбёнай забавай ангельцаў лічацца розныя тыпы спорту і карысныя для здароўя гульні. На спорце выхоўваецца моладзь, і з гэтай прычыны адзначаецца здароўем і моцнай будовай цела.

Ангельцы выявілі сваю здольнасьць і свой талент ува ўсіх галінах мастацтва і навукі. Дзякуючы ангельскім вучоным, на сучасную вышыню падняліся прыродазнаўства, фізыка, матэматыка. Усяму сьвету вядомы таксама іменьні вялікіх ангельскіх пісьменьнікаў. Аднак асабліва многа зрабілі ангельцы ў галінах тэхнічных навук, у географіі, картографіі, мораходзтве.

Асьвета ў Ангельшчыне стаіць надта высока. Няпісьменных тамака вельмі мала. Усюды апрача пачатковых, сярэдніх і розных тэхнічных школ, ёсьць вячэрнія школы для дарослых; у вышэйшых школах вучыцца слухачоў болей, як у іншых краінах Эўропы*).

Паўднёва-ўсходнюю Ангельшчыну можна зваць сельска-гаспадарчай толькі параўнаўча з Паўночна-заходняй, дзе сельская гаспадарка ня мае ніякай вагі, а пануе выключна нетракапальная і фабрычная прамысловасьць. Заняткі невясковыя пераважваюць і ў паўднёва-ўсходняй раўніне;

*) Сярод дзяржаў Эўропы першае месца па ліку слухачоў вышэйшых школ займае Вялікабрытанія. Перад вайной у Вялікабрытанскіх унівэрсытэтах вучылася 48880 слухачоў, у Нямеччыне 46200, у Францыі 32950, у іншых дзяржавах значна меней.



большасьць насельнікаў і тут жыве па гарадох, але гарады маюць часьцей гандлёвае, чым прамысловае значэньне, дый прамысловасьць іх грунтуецца на апрацоўцы продуктаў сельскай гаспадаркі.

Ральніцтва ў Паўднёва-Усходняй Ангельшчыне стаіць досыць добра, выраб зямлі адбываецца пры помачы найлепшых прылад па палепшаных спосабах гаспадаркі. Сеюць тут пераважна пшаніцу і ячмень, зьбіраюць багатыя ўраджаі, але свайго збожжа не хапае, бо яго вельмі многа вымагаюць буйныя гарады, якіх тут вельмі многа. З гэтай прычыны сюды яшчэ прывозіцца збожжа з-за межаў: з Канады, з Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі, з Паўднёва-Усходняй Эўропы. Большую вагу маюць тэхнічныя расьліны, якія даюць матар'ял для мясцовых фабрык, асабліва хмель. Добра ўзрастае й садовіна: яблыні, ігрушы. Значныя прасторы засяваюцца кармавымі травамі; апрача таго шмат у краіне і натуральных лугоў, так што гадоўля жывёлы знаходзіцца ў добрых варунках. Ангельскія гаспа-



Мал. 43.—Вуліца ў ангельскай вёсцы.

дары панавучаліся выгадоўваць найлепшыя гатункі рознай заводзкай жывёлы. Ангельскія коні вядомы на ўвесь сьвет лёгкасьцю і шпаркасьцю бегу; ангельскія сьвіньні адзначаюцца тлустасьцю і далікатным смачным мясам; па колькасьці авечак параўнаўча з прасторай з Ангельшчынай ня можа спрачацца ніводная краіна сьвету. Лепшую заводную жывёлу з Ангельшчыны вывозяць ува ўсе куты сьвету, але мясам і малаком, як і збожжам, краіна ня можа задаволіць сваё вельмі густое насяленьне, і мусіць гэтыя продукты прывозіць з Голяндыі, з Аргентыны, з Аўстраліі, Скандынавіі, Расіі.

З іншых заняткаў каля ўзьбярэжжаў пашыраны рыбацтва і гадоўля вустрыц. Дзе-ні-дзе ламаюць будаўнічы камень і здабываюць белагліньне (каолін). Фабрыкі краіны апрацоўваюць продукты сельскай гаспадаркі, выробляюць шкло, парцалянавае ды паўпарцалянавае судзьдзе. Толькі каля сталіцы існуе шмат гарбарняў, паперняў, бравароў, хімічных фабрык, карабельных майстэрняў і іншых прамысловых прадпрыемстваў.

Аднак галоўным заняткам люднасьці трэба лічыць гандаль, які, уласна кажучы, і стварыў багацьце і моц Ангельшчыны. Паўднёва-Ўсходняя Ангельшчына зьяўляецца самай гандлёвай краінай сьвету. У апошнія вякі яна была пасярэдніцай у гандлі Эўропы з Амэрыкай і Індыяй, галоўным складам сусьветных тавараў. З тутэйшых прыстаняй штодзень адыходзяць караблі ўва ўсе краі зямлі. Мораходзтва спакон веку цягне да сябе ангельцаў і дае заработкі тысячам людзей.

Для ўнутранага гандлю Паўднёва-Ўсходняя Ангельшчына мае вельмі густую сецьчыгунак, якія ўва ўсе бакі разыходзяцца ад сталіцы. Хіба толькі Бэльгія мае гусьцейшую сець чыгунак, як Паўдн.-Ўсходн. Ангельшчына. Цягнікі ходзяць часьцей і шпарчэй, як у іншых краінах Эўропы. Павольныя і поўнаводныя рэкі краіны зьяўляюцца добрымі прыроднымі дарогамі. Ангельцы злучылі іх каналамі ў адзіны ўклад танных вадзяных дарог.

Вялізныя багацьці, якія, дзякуючы гандлю, скучыліся ў Паўднёва-Ўсходняй Ангельшчыне, вельмі няроўна разьмеркаваліся між яе насельнікамі. Зямля належыць да буйных земляўласьнікаў-лёрдаў, у поўнай залежнасьці ад якіх знаходзяцца арэндары-фэрмэры, што працуюць на гэтай зямлі і жывуць па фольварках-фэрмах. Капіталістыя ўладаюць і фабрыкамі і гандлёвымі ўстановамі. А побач з надзвычайнымі багатырамі жывуць бедакі, якія ледзь могуць пражывіцца з сваёй працы.

Аднак параўнаўча з контынэнтам Зах. Эўропы Ангельшчына адзначаецца большай заможнасьцю працоўнага люду.

Продукты тут танней, а заработкі лепшыя, як на контынэнце, профэсыянальныя хаўрусы болей дбаюць аб дабрабыце працоўнага люду.

Аднак значная частка незаможных ангельцаў не здавальняецца сваім матар'яльным становішчам. Тысячамі яны выяжджаюць з бацькаўшчыны ў Амэрыку, у Аўстралію, у Паўднёвую Афрыку. Там па бязьмежных прасторах ураджайнай зямлі даўныя эмігранты, хутка пабагацелі і пазакладалі новыя дзяржавы яшчэ болей культурныя і болей свабодныя за сваю мэтрополію—Ангельшчыну. У старыя часы эміграцыі з Ангельшчыны дапамагалі рэлігійныя змаганьні. Павыяжджала шмат такіх ангельцаў, якія трымаліся ня тэй веры (англіканскай), якая панавала ў Ангельшчыне і якіх прыцiскаў ангельскі ўрад.

Асяродкам Паўднёва-Ўсходняй Ангельшчыны зьяўляецца сталіца Брытанскай дзяржавы *Лёндон*. Горад гэты ляжыць на галоўнай рацэ краіны—Тэмзе, у тым яе месцы, да якога ў час прыплываў могуць даплываць вялізныя акіянскія караблі. Лежачы разам з гэтым бязмаль-што ў самай сярэдзіне краіны, Лёндон злучае ў сабе выгоды прыморскага і ўнутранага палажэньня. Як на захад і на поўнач, у прамысловыя гарады Заходняй Ангельшчыны, гэтак і на ўсход, на паўвостравы Кент і Норфольк, ад Лёндону праменямі разыходзяцца чыгункі. Лёндон ляжыць ля ўсходніх берагоў Ангельшчыны, значыць бліжэй за ўсё да Бэльгіі, Голяндыі, Нямеччыны, Польшчы, Бальтыцкіх краін, Расіі, а з гэтымі краямі вельмі бойка гандлюе Ангельшчына. Зразумела, што Лёндон, дзякуючы свайму палажэньню, мусіў зрабіцца найгандлёвейшым горадам Ангельшчыны, а разам з тым і ўсяго сьвету. Толькі ў апошнія перад вайной гады яго перагнаў па сваіх гандлёвых абаротах Нью-Ёрк, ды прыстані Заходняй Ангельшчыны пачалі з ім супарнічаць на полі замежнага гандлю ад таго часу, як пашырыўся гандаль з Амэрыкай. Аднак пакуль-што Лёндон яшчэ займае першае месца ў Эўропе (гандлёвы абарот яго дасягаў перад вайной 3482 мільёнаў залатых рублёў).






Мал. 44.—Лёндон. Рух на вуліцах каля гелды.

Лёндон—самы вялікі горад сьвету. У ім жыве, лічачы прадмесьці, 7.500.000 насельнікаў, значыць болей, як ува ўсёй Бэльгіі, Голяндыі, у БССР. або ў Швэдзіі.

Вялікія акіянскія караблі прыстаюць трохі ніжэй Лёндону; там на некалькі дзесяткаў вёрст абапал Тэмзы цягнецца вялізная Лёндонская прыстань. Але й вышэй па Тэмзе мітусяцца ўсялякія параходы, кátэры, лайбы.

Пад зямлёй і над зямлёй па горадзе носяцца трамваі, злучаючы паміж сабой далёка раскінутыя прадмесьці.

Лёндон—тыповы ангельскі горад. Удзень мільёны людзей зьбіраюцца ў асяродку яго, у гэтак зв. Сіты. Уночы ўсе разьяжджаюцца па дамох на ўскрайкі сталіцы, тады як у Сіты на-

чуе якіх 15-20 тыс. чал. Як у сталіцы дзяржавы, у Лёндоне знаходзіцца гаспода ангельскага караля і ўраду. Над Тэмзай уздымаецца вялікі харошы будынак ангельскага парлямэнту (гл. мал. 45).

Як культурны асяродак, Лёндон слыне найлепшымі ў сьвеце музэямі (найбагацейшы з іх, вядомы ўсяму сьвету,—Брытанскі музэй), харошымі ботанічным і зоолёгічным садамі, усялякімі навуковымі ўстановамі, унівэрсытэтам, найлепшай на сьвеце вышэйшай тэхнічнай школай, бібліотэкамі, культурна-асьветнымі гурткамі і ўстановамі і г. д.

Насупроціў Сіты, на правым беразе Тэмзы, лес фабрычных комінаў і вялікіх нязграбных фабрычных будынкаў гаворыць аб магутнай прамысловасьці, згуртаванай у ангельскай сталіцы. На мясцовых фабрыках выробляецца ўсё, што толькі можа быць патрэбна чалавеку. З фабрычнымі будынкамі чаргуюцца старасьвецкія саборы, прыгожыя паркі, густа залюдненыя кварталы работнікаў і багатыя палацы мільёнэраў.

Навокала Лёндону ляжаць сотні прадмесьцяў і дачных мест, бязмаль-што зьлітых з сталіцай у адзін вялікі горад. Сярод гэтых прадмесьцяў выдаецца *Грынвіч* з слыннай обсэрваторыяй. Палудзеньнік гэтага места, як ведама, прымаецца за пачатковы.

Апроч Лёндону ў Паўднёва-Ўсходняй Ангельшчыне ёсьць яшчэ шмат гарадоў па колькі сот тысяч насельнікаў у кожным. Найвялікшы з іх *Брыстоль* (377 тыс. насельнікаў), што ляжыць на захадзе краіны каля вусьцяў аднэй з рэчак (Эвон), што ўліваецца ў Брыстольскую затоку.

У час прыплываў да Брыстолю даходзяць вялізныя морскія караблі, якія прывозяць сюды для Лёндону зваротнікавыя плады з Вэст-Індыі (Сярэдняя Амэрыка) і быдла з Ірляндыі. Такім чынам горад зьяўляецца нібы прыстаньню Лёндону на Атлянтычным акіяне. Лежачы блізка ад каменна-вугальных пакладаў, Брыстоль разьвіў буйную фабрычную прамысловасьць. (Тут многа шкляных гут, ткацкіх фабрык, гарбарняў, цукраварняў і г. д.).

На паўночным-усходзе краіны каля лейкавіднай затокі Хэмбэр ляжыць прыстань *Гуль* (287 тыс. насельн.), якая вядзе бойкі гандаль з Нямеччынай, Скандынавіяй і Расіяй. (Гандлёвы абарот 676 міл. р. золат.).

На паўднёвым беразе на Ляманшы супроць вострава Ўайт ляжаць яшчэ 2 добрых прыстані: *Портсмут* (247000 нас.) і *Саўсэмптэн* (161 тыс. нас.), галоўная станцыя параходаў, што йдуць з Нямеччыны ў Амэрыку. Маленькі *Дуўр* (42000 нас.), што ляжыць на Па-дэ-Кале, зьяўляецца месцам пераезду з Ангельшчыны на контынэнт у францускі горад Кале. *Оксфорд* (55000 нас.), на вышнявіне Тэмзы, і *Кэмбрыдж*, у сярэдзіне Ўсходняй Ангельшчыны, зьяўляюцца ціхамірнымі гарадкамі з слыннымі, добра абстаўленымі унівэрсытэтамі.

Апрача Брыстолю й Лёндону прамысловую вагу маюць толькі некаторыя гарады, якія ляжаць ужо на мяжы з Паўночна-Ўсходняй Ангельшчынай, як, напрыклад, *Лейстэр* (234000 нас.) і *Нотынгэм* (263000 нас.) з фабрыкамі панчох і абуцьця.





Мал. 45.—Лёндон. Будынак ангельскага парлямэнту.

**Паўночна-Заходняя Ангельшчына** зьяўляецца месцам концэнтрацыі сучаснай прамысловасьці і крыніцай сучаснага багацьця Брытанскай дзяржавы. Калі Паўднёва-Ўсходняя Ангельшчына мае выгляд прыгожага ціхамірнага парку, дык Паўночна-Ўсходняя выглядае, як лес фабрычных комінаў, чад ад якіх, зьмешаны з імглой і туманам, зусім хавае сонца і заўсёды вісіць па-над краінай. Калі ў першай за выняткам лёндонскіх ваколіц бязмаль паўсюды аднальковая гушчыня залюдненьня, дык у другой побач з голымі, хмурымі, малалюднымі, скалаватымі прасторамі трапляюцца мясцовасьці з гушчынёю залюдненьня да 900 чал. на 1 кв. клм., падобныя да вялікага бясконцага гораду. Калі багацьце ўсходня-ангельскіх раўнін залежыць ад гандлю і сельскай гаспадаркі, дык багацьце заходня-ангельскіх гор і ўзгоркаў залежыць выключна ад падземных пакладаў карысных мінэралаў і мэталаў.

З захаду ў Заходнюю Ангельшчыну ўразаецца Брыстольская затока і Ірляндзкае мора, разьдзяляючы краіну на 3 паўвостравы: Корнуэльс, Ўэльс і маленькі Кумбэрленд. Хмурыя, завінутыя хмарамі старавечныя горставыя горы запаўняюць гэтыя паўвостравы; у Ўэльсе яны дасягаюць досыць значнай вышыні (найвышэйшая гара Ўэльсу Снаўдон дасягае 1085 м. н. р. м.), на іншых паўвостравах горсты маюць выгляд нявысокіх узвышшаў з адхоннымі схіламі і акругленымі вярхамі. На ўсход ад 3-х горных паўвостраваў цягнуцца прадоўжныя лагчыны, якія аддзяляюць гэтыя паўвостравы ад рэшты Ангельшчыны, а яшчэ далей на ўсход цягнуцца Пэнінскія горы, якія праходзяць з поўначы на поўдзень па Паўночнай Ангельшчыне, і Сярэдня-Ангельскае ўзгор'е, што ляжыць на мяжы з Усходня-Ангельскай раўнінай.

Да Паўночна-Ангельскай краіны трэба далучыць яшчэ астравы: Энглезі, які зьяўляецца адломкам Ўэльсу, і Мэн, які лічыцца адарванай часткай Кумбэрленду. Уся краіна, асабліва-ж Сярэдня-Ангельскае ўзгор'е, мае ў дастатку розных карысных мінэралаў, галоўным чынам каменнага вугалю і жалезнай руды, на якіх грунтуецца дабрабыт Брытанскай дзяржавы.

Клімат краіны залішне вільгатны, ападкаў выпадае болей як трэба. (У горах Кумбэрленду выпадае што-год каля 3600 мілімэтраў дажджу, як дзе-небудзь у раўніковых лясох). Розьніца між летам і зімой тут яшчэ меншая, як ува Ўсходняй Ангельшчыне.

Лівэрпуль, напрыклад, мае сярэднюю тэмпэратуру году +10,3°, значыць такую-ж, як Лёндон, але ў студзені сяр. тэмпэрат. тутака +4,8°, а ў ліпені +16,9°. (Параўняй з Лёндонам).

Балоты й лугі зьяўляюцца тут галоўнымі расьліннымі згуртаваньнямі. На вярхох горставых гор убогая расьліннасьць нагадвае стэпавую, і толькі на паўднёвым захадзе пад забаронай узгор'яў Корнуэльсу трапляюцца даліны з багатай і сьвежай блізка-што паўднёва-эўропэйскай расьліннасьцю.



Вясёлыя куточкі з прыгожым краявідам сустракаюцца яшчэ ў горах Кумбэрленду па берагох выдраных даўнымі ледавікамі вазёрак. Па іншых мясцовасьцях краіны прырода адступае на другі плян перад чалавекам, які з сваімі фабрыкамі й капальнямі ўплывае на краявід болей, як расьліна і глеба.

Нават у параўнаўча бедных падземным багацьцем мясцовасьцях рудні й капальні спатыкаюцца не радзей, як двары ды фэрмы; у тых-жа месцах, дзе здабываюць вугаль, гарады стаяць адзін каля другога, капальні й гуты, рудні й фабрыкі кідаюцца ў вочы ўсюды, куды ні зірнеш.

Паўсюды там ляжаць вялікія кучы вугалю; вугальны пыл лётае ў паветры, вугаль пакрывае тонкім пластком дахі й сьцены будынкаў, твары і адзеньне працоўнага люду. Там няма тэй цішы й пакою, якім адзначаюцца некаторыя мясцовасьці Ўсходняй Ангельшчыны. У вушох зьвініць ад гукаў фабрычных гудкоў, гоману людзкіх галасоў, грукату машын, сьвісту цягнікоў. Усю сваю сілу і здольнасьць чалавек аддае там на тое, каб лепей скарыстаць паклады вугалю. Там усе працуюць, усе заклапочаныя, ніхто ня мае вольнага часу і ў будзённы дзень ніхто ня ведае адпачынку.

Галоўныя мясцовасьці, у якіх здабываюць каменны вугаль, знаходзяцца ў Паўднёвым Ўэльсе, дзе залягае найлепшы ў сьвеце антрацыт, у Сярэдня-Ангельскім узгор'і, абапал паўднёвай часткі Пэнінскіх гор і на крайнім паўночным усходзе, дзе Паўночна-Заходняя Ангельшчына дасягае Нямецкага мора. Больш за ўсё ў краіне вугалю; на другім месцы стаіць здабываньне жалеза. Хаця жалезную руду знаходзяць блізка-што па ўсёй краіне, але па здабываньні яе Ангельшчына ўжо страціла першае месца ў Эўропе.



Мал. 46.—Прамысловая карта Брытанскіх астравоў.

У Корнуэльсе знаходзяць яшчэ цыну, капаюць лепшую парцалянавую гліну, у Ўэльсе і на востраве Мэн трапляецца цынк і волава, у Корнуэльсе і Ўэльсе — медзь, на Кумбэрлендзе ламаюць графіт, у паўночным Ўэльсе—лупняк. Наагул багацьці краіны могуць звацца нязьлічанымі, і толькі Злучаныя Штаты перавышаюць яе па колькасьці карысных мінэралаў ды Нямеччына ў апошнія гады падраўнялася з ёй і можа поплеч ісьці ў паступовым пашырэньні сваёй прамысловасьці.

Большую частку здабытага вугалю ангельцы паляць на ўласных фабрыках. Асабліва многа гэтага апалу ідзе на выплаўку жалеза. З чыгуну, сталі і жалеза ў Паўночна-Заходняй Ангельшчыне вырабляюць

на вываз за межы і для мясцовага ўжытку гарматы, стрэльбы, бліндажы, нажы, розныя машыны і г. д. Яшчэ большую вагу мае выраб крамніны. Няма ніводнай краіны, якая-б магла раўняцца з Паўднёва-Заходняй Ангельшчынай па вырабе баваўнянкі. З Брытанскіх колёній, з Злучаных Штатаў, з Кітаю і Японіі прывозяць сюды баваўняную сырыну, тут перарабляюць і ўжо апрацованую вывозяць адгэтуль ува ўсе староны сьвету. Можна сказаць, што палова ўсіх людзей зямлі апранаецца ў ангельскую баваўняную вопратку.

Пачэснае месца ў прамысловасьці Заходняй Ангельшчыны займае і апрацоўка воўны, выраб сукна, драпу і г. д.

На тутэйшых фабрыках апрацоўваецца як мясцовая, гэтак і чужаземная воўна з Аўстраліі, Паўднёвай Афрыкі, Аргентыны, Расіі. Ангельскія ткацкія фабрыкі перарабляюць беларускі і расійскі лён, індыйскі джут, беларускія, расійскія і украінскія каноплі і г. д. Добрае становішча мае ў краіне апрацоўка каўчуку, медзі, цынку, выраб розных хімічных тавараў, між іншым фарбы і г. д.

Насельнікі Заходняй Ангельшчыны зьяўляюцца патомкамі даўных кельцкіх народаў Вялікабрытаніі; уплывы англа-саксаў на іх адбіліся значна слабей, як на ўсходніх ангельцах.

У Ўэльсе, Корнуэльсе, на астравох Энглезі й Мэн насельнікі могуць лічыцца болей-меней чыстымі кельтамі. Праўда, шматвяковая сувязь з Усходняй Ангельшчынай згладзіла некаторыя асаблівасьці заходніх ангельцаў; насельнікі Корнуэльсу і вострава Мэн ужо 200 гадоў гавораць паангельску, і толькі на Энглезі і ў Уэльсе да сяго часу ўжываецца кельцкая мова.

Нацыянальныя асаблівасьці тут зусім зьнікаюць у параўнаньні з розьніцай між клясамі, якая ў Заходняй Ангельшчыне выяўляецца выразьней, як у іншых краёх Эўропы. З прычыны магутнага разьвіцьця буйной прамысловасьці люднасьць тут спролетарызавалася мацней, як дзе яшчэ. Тут не застаецца месца для дробных уласьнікаў-саматужнікаў. Ня маючы магчымасьці саматугам вырабляць такія танныя тавары, якія вырабляюцца машынамі на фабрыках, саматужнікі мусілі зачыніць свае дробныя майстэрні і йсьці наймацца на фабрыку багатыроў-капіталістых. Такім чынам тут амаль-што не засталося дробных уласьнікаў, і ўвесь народ падзяліўся на дзьве вялікія варожыя адна да аднэй клясы: нямногалічных капіталістых і вялікую граму́ду пазбаўленых уласнасьці работнікаў.

Каб лягчэй трымаць у сябе ў экономічнай залежнасьці работнікаў, капіталістыя злучаюцца ў саюзы, з якіх наймацнейшы—„Фэдэрацыя Брытанскай Прамысловасьці"—ахапляе ўсе бакі брытанскай гаспадаркі і фактычна кіруе ўсёю брытанскаю політыкаю. З свайго боку работнікі Ангельшчыны пачалі, раней як дзе, гуртавацца ў профсаюзы (так званыя трэд-юніоны) для змаганьня з капіталістымі за лепшыя варункі жыцьця. Профсаюзы кіруюць забастоўкамі работнікаў, падтрымліваюць беспрацоўных



і з кожным годам набываюць усё большую вагу ў політычным жыцьці Ангельшчыны. Цяпер гэтыя саюзы гуртуюць амаль-што ўвесь працоўны люд краю. (У 1920 г. ў профсаюзах Вялікабрытаніі лічылася $8^{1}/_{2}$ мільёнаў членаў). Побач з профсаюзамі моцную сілу, варожую капіталістым, складаюць коопэрацыйныя ўстановы, аб'яднаныя ў Ангельскае Таварыства Гуртавых Закупак. Гэтае Таварыства мае больш сотні сваіх уласных фабрык, мае свае плянтацыі і фэрмы ў заморскіх брытанскіх уладаньнях і распараджаецца вялізным капіталам. Вострасьць клясавай барацьбы ў Ангельшчыне зьмякчаецца тым, што багацьце гэтага краю грунтуецца на эксплёатацыі заморскіх брытанскіх колёній. Часта ангельская буржуазія йдзе насустрэч вымаганьням ангельскіх работнікаў і такім чынам прыцягвае частку іх на свой бок, абы захаваць магчымасьць эксплёатацыі сваіх заморскіх уладаньняў. Комуністычная партыя, якая ставіць сваёй мэтай захват усёй улады работнікамі, утварылася ня вельмі даўно ў Ангельшчыне і пакуль што мала вядома шырокім колам працоўнага люду. Іншыя работніцкія політычныя організацыі, і перш за ўсё так званая Працоўная Партыя, працуюць у згодзе з буржуазіяй і маюць мэтай увесьці ў Ангельшчыне соцыялістычны лад шляхам мірнай заваёвы большасьці галасоў у ангельскім парлямэнце. Працоўная партыя аб'яднала 4330000 членаў (у 1920 г.), але ў парлямэнце далёка ня мае большасьці.

Як паўсюды ў багатых прамысловых краінах, у Паўночна-Заходняй Ангельшчыне кожная мясцовасьць спэцыялізуецца на якой-небудзь галіне прамысловасьці. У ваколіцах адных гарадоў вырабляецца толькі баваўняная вопратка, у другіх мясцовасьцях—толькі панчохі, у трэціх—абуцьцё, у чацьвертых—выключна перапрацоўваецца воўна, у пятых—мэталы і г. д. Звычайна ў асяродку кожнай такой мясцовасьці знаходзіцца буйны горад, які вядзе гандаль яе вырабамі. Наагул гарадоў у краіне вельмі многа, значная колькасьць іх належыць да буйных, а 23 гарады налічваюць болей як па 100000 насельнікаў кожны. Большасьць буйных гарадоў гуртуецца ў мясцовасьцях, багатых вугалем. З гэтай прычыны ў Корнуэльсе, які ня мае пакладаў вугалю, мала буйных гарадоў. Толькі на паўднёвым беразе, каля аднэй з найлепшых у Эўропе буктаў, пабудованы 2 гарады: *Плімут* і *Дэвонпорт* (абодва разам налічваюць 210 тыс. н.). У Ўэльсе значныя гарады ляжаць на поўдні, дзе здабываецца слынны ўэльскі антрацыт (найлепшы гатунак каменнага вугалю). Прыстань *Кардыф* (200 тыс. нас.) вывозіць адтуль што-год каля 15 мільёнаў тон (больш за 900 мільёнаў пудоў) вугалю.

У Сярэдня-Ангельскім узгор'і ў вугляроднай мясцовасьці, вядомай пад назовам Чорнай Зямлі, ляжыць *Бірмінгэм* (919000 нас. у 1921 г.), асяродак жалезнай прамысловасьці, слынны вырабам зброі, машын, сельска-гаспадарчых прылад, голак, сталёвых пёркаў і г. д. Апрача таго горад вырабляе ўсялякія прылады з медзі, мосензу (бронза), дарагога каменьня і шкла. Як унівэрсытэцкі горад, Бірмінгэм зьяўляецца асяродкам асьветы ў Чорнай Зямлі. На поўнач адгэтуль, абапал паўднёвых адгор'яў

Пэнінскага ланцуга, знаходзяцца яшчэ дзьве густа залюдненыя мясцовасьці, у якіх, як і ў Чорнай Зямлі, бесьперарыўна цягнуцца гарады, капальні, рудні. На ўсход ад Пэнінскіх гор у *Шэфільдзе* (491 тыс. нас.), як і ў Бірмінгэме, вырабляюцца пераважна мэталёвыя тавары: чыгуначныя рэйкі, паравозы, вагоны, нажы, бліндажныя пліты і г. д. Крышку далей на поўнач у *Лідсе* (458 тыс. нас.), *Брэдфордзе* (286 тыс. нас.) і ў іх ваколіцах гатуюць сукно, перапрацоўваюць воўну, ільняніну, вырабляюць шкло і гліняныя тавары. Усе гэтыя ўсходня-пэнінскія гарады вывозяць свае тавары на ўсход праз Гуль, між іншым, у прыстані Балтыцкага мора і праз іх на Беларусь.

Аднак самы багаты і найгусьцей залюднены куток Ангельшчыны—гэта мясцовасьць Лянкашыр на захад ад Паўднёвых Пэнін. Гэты куток спэцыялізаваўся на апрацоўцы бавоўны, якая падвозіцца сюды па морскім канале проста ў асяродак мясцовасьці—*Манчэстэр* (731 тыс. насельн., а разам з прадмесьцем Сэльфорд каля 1 мільёну нас.). Гэта першы ў Эўропе горад па апрацоўцы бавоўны. У ваколіцах яго меншыя гарады гатуюць баваўнянае прадзіва, другія ткуць, трэція фарбуюць тканіну, чацьвертыя шыюць вопратку, пятыя вырабляюць машыны для апрацоўкі бавоўны. Для ўсіх гэтых гарадоў Манчэстэр зьўляецца гандлёвым і культурна-асьветным (унівэрсытэт) асяродкам. Морскі канал злучае Манчэстэр беспасрэдна з *Лівэрпулем* (803 тыс. нас.), што ляжыць каля лейкавага вусьця р. Мэрсі, вывозіць як манчэстэрскія, гэтак і бірмінгэмскія тавары, і зьяўляецца галоўнай гандлёвай прыстанью Ангельшчыны пасьля Лёндону, першай у сьвеце па гандлі баваўнай (гандлёвы абарот да вайны дасягаў 3182 міл. руб. зол.). Сюды прывозіцца ўся сырына, патрэбная для манчэстэрскіх фабрык, з Эгіпту, Амэрыкі, Індыі; адсюль адыходзяць пасажырскія і таварныя караблі ў Бостон і Нью-Ёрк, з якімі асабліва бойка гандлюе Ангельшчына. Лежачы ў самай сярэдзіне Брытанскага згуртаваньня астравоў, Лівэрпуль зьяўляецца галоўным асяродкам унутранага брытанскага гандлю. Пакуль Ангельшчына гандлявала пераважна з Эўропай, узрастаньню Лівэрпулю перашкаджаў Лёндон, але з таго часу, як пашырыўся гандаль з заэўропэйскімі старонкамі, да якіх Лівэрпуль ляжыць бліжэй, і асабліва ад часу разьвіцьця прамысловасьці Заходняй Ангельшчыны, Ліверпуль пачаў шпарка расьці і цяпер гандлёвымі абаротамі бязмаль зраўняўся з сталіцай.

Тунэль пад ракой Мэрсі злучае Лівэрпуль з *Біркенгідам* (146000 нас.), які ляжыць насупроціў яго і зьяўляецца нібы яго прадмесьцем.

**Шотляндыя** займае паўночную вузейшую частку Вялікабрытаніі, а таксама суседнія астравы Гебрыдзкія, Оркнэйскія і Шотляндзкія. (Адшукай іх на карце). Берагі гэтай краіны яшчэ болей зьвілістыя, морскіх заток, пераважна вузкіх і даўгіх, тут яшчэ болей, як у Ангельшчыне. Асабліва глыбака ўразаюцца ў сухазем'е дзьве пары заток (на поўдні—Клейд з захаду і Форс з усходу, на поўначы—Лёрн з захаду і Морэй



з усходу). Гэтыя заткі цягнуцца насустрэч адна другой і нібы перашнуроўваюць Шотляндыю, так што яна распадаецца на 3 часткі, злучаныя толькі вузкімі пярэсмыкамі, праз якія ўжо пракопаны морскія каналы. Пярэсмыкі гэтыя зьяўляюцца западзінамі—грабэнамі, якія стварыліся праз апусканьне кавалкаў земнай кары, што ляжалі між раўналежнымі шчылінамі. Паўднёвы пярэсмык (што цягнецца ад заткі Клейд да заткі Форс) мае назоў Лёленд, адзначаецца вялізнымі запасамі каменнага вугалю і жалеза і густой залюдненасьцю. Паўночны пярэсмык—Каледонскі (што цягнецца ад заткі Лёрн да заткі Морэй)—запоўнены вузкімі даўгімі вазёрамі. Паўднёвая Шотляндыя, што ляжыць на поўдзень ад Лёленду, складаецца з убогіх нявысокіх узгор'яў і плоскаўзвышшаў. Значна вышэй Сярэдня-Шотляндзкае плоскаўзвышша, што ляжыць між Лёлендам і Каледонскай нізінай. Асабліва высокія горы Грампіанскія (найвышэйшая гара ў іх Бэн-Нэвіс дасягае ўвышкі 1343 м. н. р. м.). Гэта хмурыя, недаступныя, але прыгожыя горы, багатыя ледавіковымі вазёрамі. (Найвялікшае з іх Лёмонд у заходняй частцы краю). На поўнач ад Каледонскага пярэсмыку ляжыць Паўночнае Шотляндзкае ўзвышша, такое-ж дзікае, пустыннае й недаступнае, як і Грампіанскія горы, але значна ніжэйшае.

Сучасны выгляд паверхня Шотляндыі атрымала ў ледавіковыя часы. Тагочасныя ледавікі, спаўзаючы з гор, павыкопвалі на іх схілах шмат вузкіх і даўгіх катлін з крутымі абшарпанымі сьценамі. З цягам часу адны з гэтых катлін напоўніліся дажджавой вадой і зрабіліся вазёрамі, другія, асабліва на заходнім узьбярэжжы, злучыліся з морам і перавярнуліся ў вузкія морскія заткі, г. зв. фьерды.

Клімат Шотляндыі, згодна вышэйшай геаграфічнай шырыні яе, халаднейшы, як у Ангельшчыне, але таксама надта вільгатны. На ўсходзе часамі ўлетку яшчэ здараюцца ясныя дні, а ў горах і на захадзе пануюць вечная непагода, частыя буры, туманнае і хмарнае надвор'е. Цёплае вільгатнае паветра з-над Гольфштрому адразу тут падымаецца на халодныя высокія плоскаўзвышшы і выдзяляе вельмі многа ападкаў (на заходніх схілах гор каля 3000 мм. у год, на ўсходзе—толькі 750 мілім.).

Сярэдняя тэмпэратура году ў Эбэрдыне на ўсходзе краіны +7,9°, сярэдняя студзеня +2,9°, ліпеня +14,2°. На захадзе лета яшчэ халаднейшае.

Бук ужо не расьце ў Шотляндыі; на поўначы яе няма нават і дубоў. Па нізінах і горных схілах пераважваюць хваёвыя бары, а па плоскаўзвышшах застаецца толькі ўбогая травяная расьліннасьць, якой жывяцца статкі аленяў, каторых трымаюць дзеля паляваньня багатыя лёрды.

Ральніцтва мае другараднае значэньне ў шотляндзкай гаспадарцы. Сеюць перш за ўсё кармавыя травы, авёс, а ў Лёлендзе: на захадзе яшчэ ячмень і на ўсходзе — даволі рэдка—пшаніцу. Большую вагу мае гадоўля жывёлы, асабліва авечак, якіх задавальняе самая бедная паша. Вялікія

даходы насельнікам дае рыбацтва. Што-год адгэтуль вывозіцца на некалькі дзесяткаў мільёнаў рублёў золатам селядцоў. У нізіне Лёленд у каменна-вугальных акругах пераважвае нетракапальная і фабрычная прамысловасьць. Там выплаўляюць жалеза, гатуюць розныя жалезныя вырабы, апрацоўваюць баваўну, лён, джут, шоўк і гэтак далей.

Даўная кельцкая люднасьць Шотляндыі захавалася галоўным чынам на захадзе. Людзі там ніжэйшага росту і цямнейшыя, як на ўсходзе. У самых недаступных горах захаду да сяго часу пануе старакельцкая мова. Наадварот, высокія, сьветлавалосыя, доўгагаловыя й доўгатварыя насельнікі Паўднёва-Ўсходняй Шотляндыі зьяўляюцца патомкамі гэрманскіх пляменьняў, якія захапілі гэтую частку краіны ў пачатку сярэдніх вякоў. Гавораць яны выключна паангельску, хаця й ня вельмі любяць запраўдных ангельцаў.

Між іншым ад ангельцаў шотляндцы адразьняюцца сваёй рэлігіяй. Ангельцы афіцыйна належаць пераважна да так званай англіканскай царквы, шотляндцы—галоўным чынам так званыя прэсвітэрыянцы. Англіканская вера займае сярэдняе месца паміж іншымі протэстанцкімі рэлігіямі і каталіцтвам.



Мал. 47.—Плоскаўзвышша ў Шотляндыі.

Гарады Шотляндыі згуртаваліся ў багатай на вугаль і жалеза нізіне Лёленд. Тамака на р. Клейд, у тэй яе частцы, да якой даплываюць вялізныя морскія караблі, недалёка ад заходняга берагу ляжыць горад *Глезго* (1034000 н. у 1921 г.), які бойка гандлюе з Канадай, Злучанымі Штатамі і з Вэст-Індыяй. Сюды прывозяць адтуль цукер і баваўну, а адгэтуль вывозяць выробленыя на тутэйшых фабрыках баваўняныя і шаўковыя тканіны і розныя мэталёвыя тавары, перш за ўсё ўсялякія машыны. Глезго вядомы, як асяродак будаваньня караблёў, гандлёвы і ўнівэрсытэцкі цэнтр Шотляндыі.



На ўсходзе западзіны Лёленд знаходзіцца прыгожы старасьвецкі *Эдынбург* (420 тыс. нас.), даўная сталіца Шотляндыі. Тут знаходзіцца лепшы унівэрсытэт краіны, многа кніжных складаў і бібліотэк. Як прамысловы горад, Эдынбург апрацоўвае сельска-гаспадарчыя продукты. На поўнач адгэтуль каля Нямецкага мора ляжыць прыстань *Дэнды* (168 тыс. нас.), асяродак ільнянай прамысловасьці і гандлю рыбай, а яшчэ далей на поўнач—прыстань *Эбэрдын* (159000 насельн.) вывозіць продукты гадоўлі авечак.

Астравы Гебрыдзкія, Оркнэйскія і Шотляндзкія зьяўляюцца адломкамі Паўночна-Шотляндзкага ўзвышша і адзначаюцца вельмі вільгатным кліматам. На Гебрыдзкіх астравах жывуць кельты, на Оркнэйскіх і Шотляндзкіх—патомкі даўных вікінгаў, якія да сяго часу ўжываюць норвэскую мову.

**Ірляндыя** таксама, як і Вялікабрытанія, мае асабліва на захадзе вельмі многа затокаў, глыбока ўрэзаных у сухазем'е, але затокі гэтыя не такія вузкія і не такія разьвіленыя, як фьерды Шотляндыі.

Таго часу, як дно фьердаў глыбей за суседнія часткі адкрытага мора, дно Ірляндзкіх затокаў пакрысе глыбее ў кірунку ад пачаткаў да вусьця. Як і затокі Паўночна-Заходняй Гішпаніі, затокі Ірляндыі належаць да гэтак званага рыясавага тыпу.

У сярэдзіне Ірляндыі знаходзіцца западзіна, а па ўскрайках уздымаюцца ўзгор'і або нявысокія горы з адхоннымі пакатамі і акругленымі мяккімі абрысамі. Такая будова паверхні выклікае забалочанасьць унутраных прастор краіны. Рэкі асяродкавай нізіны, напрыклад, самая вялікая з іх Шанон, маюць невялікі нахіл дна, цякуць павольна, утвараюць на сваёй дарозе шмат вазёр і балот і ледзь знаходзяць дарогу ўва ускрайных узгор'ях, каб прабіцца праз іх і трапіць да мора. У ледавіковыя часы і тут зямля хавалася пад магутным пластом лёду, але ад тых часоў тут засталося меней сьлядоў, як у Шотланды. Тонкі пласт ледавіковага навалу (морэн) і многалічныя вазёры пакрываюць аднак бязмаль усю краіну.

Блізкасьць да адкрытага акіяну і беспасрэдны ўплыў Гольфштрому робяць клімат Ірляндыі яшчэ вільгатнейшым за клімат Вялікабрытаніі. Асабліва вільгатны, роўны клімат на паўднёвым захадзе краіны.

Сярэдняя тэмпэратура году тамака $+10{,}6^0$, самы халодны месяц сьнежань мае ў сярэднім $+7{,}2^0$, самы цёплы—ліпень $+15{,}1^0$. Ніколі там ня бывае халадней за $-1{,}7^0$ і ніколі цяплей за $+24{,}2^0$. Ападкаў 1500 мм.

Дзякуючы цёплай зіме на паўднёвым захадзе Ірляндыі могуць расьці нават некаторыя вечназялёныя дрэўныя расьліны, як, напрыклад, ляўры й міртэ. Уся краіна адзначаецца багацьцем поплаваў і выглядае пакрытай зялёным дываном сочнай густой травы, якая не перастае расьці нават узімку і заўсёды дае найлепшую спажыву для жывёлы. Вялікія прасторы займаюць балоты і іншыя няўжыткі, так што пад ральлёй, гародамі і

садамі застаецца ўсяго каля 25⁰|₀ прасторы, а лясоў у краіне бязмальшто, зусім няма. Ня гледзячы на малую плошчу ніў, ральніцтва ў Ірляндыі заўсёды грала вялікую ролю, большую, як у Шотляндыі і Ангельшчыне. Тутака вельмі добра ўзрастае *бульба*, і няма ніводнага краю ў сьвеце, у якім бульба мела-б такую вагу, як на гэтым востраве. Бульба тут галоўны страўны продукт, і ў час неўраджаяў на яе насельнікі вострава галадуюць, тысячамі выміраюць і выяжджаюць за межы. Збожжа расьце ў Ірляндыі кепска, хіба толькі на паўднёвым усходзе летняй цяплыні хапае для засеваў аўса ды ячменю. Апрача бульбы і гародніны добрыя ўраджаі дае лён, якога асабліва многа сеюць на паўночным усходзе краіны. На апрацоўцы ільняніны грунтуецца, можна сказаць, уся ірляндзкая прамысловасьць. Фабрыкі згуртаваліся на паўночным усходзе ў беспасрэднай блізкасьці да Шотляндзкіх каменна-вугальных акруг, вугалем якіх яны карыстаюцца, бо свайго апалу ў Ірляндыі няма. За выняткам гэтага прамысловага куточка рэшта Ірляндыі зьяўляецца сельскагаспадарчым краем. Багатыя поплавы даюць магчымасьць гадаваць найлепшае быдла, авечак, сьвіней, якія даюць галоўныя продукты вывазу з вострава.

Першапачатковыя насельнікі Ірляндыі былі ўжо досыць культурным народам, калі ў Вялікабрытанію надышлі англы й саксы, а потым нормандцы. Ірляндцы любілі сваю бацькаўшчыну і шанавалі яе волю й незалежнасьць. Калі англа-нормандзкія войскі перакінуліся на Ірляндыю, яны спаткалі тамака ўпарты адпор. Аднак добра ўзброеныя і абучаныя англа-нормандцы перамаглі ірляндцаў і далучылі востраў да Ангельскага каралеўства. Зямлю ірляндзкіх земляробаў захапілі ангельскія лёрды, якія дазволілі ірляндзкім сялянам жыць на сваёй зямлі толькі ў стане арэндараў. Уладаўшы спакон веку зямлёй, ірляндцы не маглі мірыцца з панаваньнем на ёй чужаземцаў і рыхтавалі паўстаньне за паўстаньнем. Але ангельцы тапілі ў крыві Ірляндыю і трымалі востраў у сваіх руках. Асабліва цяжка было ірляндцам у часы рэлігійных змаганьняў, бо ангельцы, якія належалі да протэстанскай англіканскай царквы, прыцiскалі каталікоў-ірляндцаў. Замацаваўшыся на паўночным усходзе Ірляндыі, ангельцы адтуль кіравалі ўсім востравам, падтрымоўваючы лёрдаў і караючы сялян-арэндараў. Спачатку ў Ірляндыі быў асобны хоць і няпоўнапраўны сойм, але з 1800 году Ірляндыя злучылася з Вялікабрытаніяй у адно Злучанае каралеўства і засталася без свайго парлямэнту, апошняй рэшткі мінулай самастойнасьці. У XIX веку становішча ірляндцаў зрабілася нявымоўна цяжкім. Лічачы, што морскі клімат Ірляндыі найболей спрыяе пашырэньню ў ёй гадоўлі жывёлы, ангельскія лёрды пачалі проста выганяць арэндараў з сваіх ірляндзкіх маёнткаў, а на месцы іх пачалі завадзіць малочныя фэрмы і скотныя двары. Выгнаныя з сваіх хат арэндары прабавалі займацца фабрычнай прамыславасьцю, але ня вытрымалі конкурэнцыі ангельскіх фабрык і тысячамі пачалі ўцякаць у Амэрыку. Адначасна пачаліся неўраджайныя на бульбу гады, і краіна пачала вылюдняцца. Яшчэ ў першай палове XIX в. ў ёй было болей за 8 мільёнаў насельнікаў, а цяпер засталося толькі 4500000 чалавек. Аднак рэштки ірляндзкага народу і далей змагаліся за самастойнасьць.



Аб'яднаўшыся з лібэральнымі партыямі ў ангельскім парлямэнце, ірляндцы ўсімі дазволенымі спосабамі дамагаліся прынамсі самаўраду і асобнага ірляндзкага парлямэнту. Найболей крайнія з ірляндзкіх незалежнікаў часамі заклікалі сялянства брацца за зброю, але толькі пасьля сусьветнай вайны ангельскі ўрад згадзіўся на стварэньне незалежнай Ірляндзкай дзяржавы з асобным урадам і парлямэнтам, але злучанай з Брытанскай дзяржавай саюзным дагаворам.



Мал. 48.– Ірляндзкі фэрмэр.

Ужо многа гадоў назад большасьць насельнікаў Ірляндыі запазычыла ангельскую мову, так што старая ірляндзкая кельцкая мова захавалася толькі на крайнім захадзе. Аднак, запазычыўшы ангельскую мову, ірляндцы засталіся асобнай нацыяй і ўпарта змагаюцца за незалежнасьць сваёй бацькаўшчыны*).

Векавечнае змаганьне з пераможцамі цяжка адбілася на Ірляндыі. Заняпала культура, зьнікла даўнейшае багацьце. Большасьць ірляндцаў жыве вельмі бедна, значная частка іх не атрымоўвае аніякай асьветы, многія з іх выяжджаюць на заработкі ў іншыя краіны Брытанскай дзяржавы, дзе выконваюць, як беларусы ў даўнейшай Расіі, самую цяжкую працу**).

Як у тыповай сельска-гаспадарчай староны, у Ірляндыі мала вялікіх гарадоў. Сталіца яе *Дублін* (400000 насельнікаў) ляжыць на ўсходнім беразе і бойка гандлюе з Ангельшчынай. Гэта асяродак ірляндзкай асьветы, слынны сваім унівэрсытэтам. Другі буйны горад *Бэльфаст* (393000 насельн.) ляжыць на паўночным усходзе краіны ў асяродку прамысловай акругі. Тут апрацоўваецца баваўна, ільняніна, вырабляецца паўпарцалян, шкло, цукер.

*) Праца народнай інтэлігэнцыі над разьвіцьцём сваёй уласнай мовы стварыла ўжо багатую літаратуру, якая ўжо цяперака зьяўляецца гонарам кожнага нацыянальна-сьвядомага ірляндца.

**) Толькі дзякуючы шырокаму разьвіцьцю сельска-гаспадарчай коопэрацыі дабрабыт працоўнага сялянства ў Ірляндыі значна паляпшаецца, і можна спадзявацца, што далейшыя посьпехі коопэрацыі дазволяць ірляндцам экономічна ўзмацавацца.

# Французская старана.

(Азнач географічнае палажэньне. Назаві моры, якія атачаюць Французскую старану. Якія староны мяжуюцца з Французскай на поўдні і на паўднёвым усходзе?)

Ад усіх краёў Паўночна-Заходняй Эўропы рэзка адразьняецца Французская старонка, у якой бязмаль-што зусім няма сьлядоў ледавіковага часу, клімат якой адзначаецца мяккасьцю і цяплынёй, а люднасьць складаецца з раманскіх народаў.

Як і паўсюды ў Заходняй Эўропе, паверхня старонкі складаецца з горставых гор і нізін, якія стварыліся на месцы даўных горных зморшчаў, зьнішчаных выпятрэньнем у працягу многіх мільёнаў гадоў. Сучасныя горсты—гэта нібы адноўленыя рэшткі тых зморшчаў. Павярхоўныя пласты сучасных горставых гор і нізін ляжаць паземна, і толькі на вялікай глыбіні пад зямлёй захаваліся пагнутыя, зморшчаныя пласты земных парод—запраўдныя рэшткі даўнейшых зморшчавых гор. (Пераглядзі па карце назовы сучасных узвышшаў і нізін Французскае стараны). Адны з горстаў Францыі маюць выгляд значных плоскаўзвышшаў, другія выглядаюць нізкімі ўзгор'ямі, трэція—ланцугамі паасобных гор, але звычайна маюць адхонныя схілы і плоскія або акругленыя вярхі.

Клімат Французскай стараны, як мы ўжо казалі, значна цяплейшы і мякчэйшы, чымся ў іншых краёх на контынэнце ў Паўночна-Заходняй Эўропе. Сярэдняя гадавая тэмпэратура тут заўсёды вышэй за $+10^{\circ}$, таго часу як у Нямеччыне, Чэхіі, Польшчы яна звычайна ніжэй за гэтую лічбу. Паводле сваёй цёплай безмарознай зімы Францыя нагадвае Ангельшчыну. Сярэдняя тэмпэратура студзеня тут за звычай вышэй за $+2^{0}$, а ў Нямеччыне і Галяндыі ніжэй. Улетку розьніца між Францыяй і Нямеччынай меншая, але цёплая пара году (з сярэдняй тэмпэратурай початку бо лей за $+10^{0}$) ува Франціі трывае больш за паўгода, у той час як у Нямеччыне, Галяндыі, Ангельшчыне яна цягнецца меней. Часта ўва Францыі бываюць дні з сярэдняй тэмпэратурай вышэй за $+20^{0}$, між тым як у іншых старонках Паўночна-Заходняй Эўропы такія гарачыя дні здараюцца рэдка.

Рэкі Французскай стараны (пераглядзі іх назовы па карце) ніколі не замярзаюць, заўсёды выгодны для руху параходаў і граюць значную ролю ў жыцьці краю, бо пачынаюцца блізка адна ад аднэй у асяродку Францыі, злучаны паміж сабой суднаходнымі каналамі і злучаюць розныя часткі краю ў адно.

Расьліннасьць Французскай стараны багацей, як у іншых старонах Паўночна-Заходняй Эўропы. Тут добра ўзрастае ядобны каштан, які ня можа расьці ў Ангельшчыне і Нямеччыне; на захадзе й на поўдні трапляюцца нават вечназялёныя дубы, ляўры, мірты і іншыя падзваротнікавыя



расьліны. Лясоў ува Францыі крыху болей, як у Ангельшчыне (каля 16%), але й тут большую частку іх павысякалі, расьцерабілі і перавярнулі на нівы і сенажаці.

Насельнікі старонкі паводле свайго аблічча нагадваюць паўднёвых эўропэйцаў. Яны ніжэйшага за гэрманцаў росту, чарнявыя, смуглыя. Большая частка іх гаворыць на раманскіх мовах: валёнскай на паўночным усходзе, французскай—на поўначы, провансальскай—на поўдні. Мовы гэтыя маюць шмат супольнага паміж сабой і дзеля таго звычайна разглядаюцца, як асобныя падмовы аднэй французскай мовы. Апроч таго на крайняй поўначы побач з валёнцамі жывуць флямандцы, якія ўжываюць адну з гэрманскіх моў, а на паўночным захадзе на паўвостраве Брэтані захавалася мова, блізкая да кельцкіх моў, якія захаваліся на Брытанскіх астравах. Амаль усе насельнікі краю лічацца каталікамі, і паўсюды болей або меней пашырана французская пісьменная мова.

Даўнымі насельнікамі Французскай стараны былі розныя кельцкія пляменьні, перамешаныя, як і на Брытанскіх астравах, з ібэрыйцамі. У часы панаваньня Вялікай Рымскай дзяржавы гэтую старану, або Галію, як яе тады называлі, захапілі латыньцы. Значная колькасьць латыньцаў перасялілася сюды з Італіі і занесла сюды сваю мову, звычаі, культуру. З часам сюды наваліліся з усходу розныя гэрманскія пляменьні: франкі, якія далі сучасны назоў старонцы, бургунды і іншыя. Гэтыя пляменьні залажылі тутака свае дзяржавы, але хутка пераняялі мову й звычаі тубыльцаў—раманізаваных кельтаў, расплыліся ў іх масе, і толькі на поўначы ўнесьлі ў люднасьць значны процант гэрманскай крыві. На поўдні, дзе ўплыў латыньцаў быў мацнейшым, засталося болей чыстае раманскае насяленьне. На гэтым грунтуецца розьніца між паўночнымі французамі і провансальцамі. Спачатку кожны з гэтых народаў жыў сваім асобным жыцьцём. Аднак адсутнасьць прыродных перашкод паміж паўночнай і паўднёвай Францыяй, лёгкасьць зносін паміж імі дапамаглі злучэньню абодвух народаў у межах аднэй вялікай Французскай дзяржавы.

Большая частка Французскай стараны належыць да Французскай дзяржавы (552900 кв. клм., 40 міл. насельн.); толькі на паўночным усходзе флямандцы і валёнцы стварылі асобную Бэльгійскую дзяржаву, ды Нормандзкія астравы, што ляжаць у Ляманшы, належаць да Ангельшчыны. Па сваім дзяржаўным ладзе Францыя—гэтак званая дэмократычная рэспубліка, на чале якой стаіць парлямэнт, законадаўчая ўстанова, складзеная з сэнату і палаты народных прадстаўнікоў, і прэзыдэнт, начальнік дзяржавы, абіраны парлямэнтам на кожныя 7 гадоў. Бэльгія—конституцыйнае каралеўства, у якім улада караля, як і ў Ангельшчыне, абмяжована парлямэнтам.

Географічнае палажэньне Французскай дзяржавы вельмі выгоднае: на поўдні да яе належыць бераг спрадвеку гандлёвага Міжземнага мора, на захадзе яна ўладае берагамі сучаснай галоўнай гандлёвай дарогі сьвету—Атлянтычнага акіяну. Лежачы паміж Італіяй і Ангельшчынай,

Гішпаніяй і Нямеччынай, Францыя была пасярэдніцай паміж імі. Запазычыўшы культуру ад італійцаў, Францыя распаўсюджвала гэтую культуру у іншых краёх Заходняй Эўропы. Француская мова зрабілася мовай зносін, мовай міжнароднай; францускія погляды, звычаі, парадкі запанавалі ўва ўсіх эўропэйскіх дзяржавах. У XVII, XVIII і ў пачатку XIX стогодзьдзя Францыя была найдужэйшай і найбагацейшай дзяржавай сьвету. Яна адначасна кіравала гандлем і на Міжземным моры і на Атлянтыцы; яе ўрад загадваў сваю волю ўсім эўропэйскім дзяржавам. Францыя першая дасягнула найвышэйшага становішча сваёй прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Аднак узрастаньне сучаснай прамысловасьці, якая патрабуе вельмі многа каменнага вугалю, адсунула Францыю на другараднае месца, бо ў яе межах адчуваецца недахват у пакладах гэтага апалу. Сусьветная вага Францускай рэспублікі пачала зьмяншацца.

Спынілася ўзрастаньне францускага гандлю і прамысловасьці, спыніўся і прырост насяленьня Францускай рэспублікі. У 1800 г. Француская дзяржава налічвала 27 мільёнаў насельнікаў, Нямеччына—21 м., Брытанская дзяржава—16 м. Праз сто гадоў з гэтых трох дзяржаў на першым месцы стаяла ўжо Нямеччына, якая мела 56 мільёнаў нас., Брытанская дзяржава мела 41,5, Францыя—толькі 39 м.

Перад сусьветнай вайной Францыя была значна бяднейшай за Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі, за Вялікабрытанію і за Нямеччыну. Каб утрымаць войска больш-менш роўнае нямецкаму, Францыя мусіла 29% сваіх дзяржаўных выдаткаў траціць на ўзбраеньне. Дзяржаўны доўг Францыі быў найвялікшым у сьвеце. 33% выдаткаў ішло на квоту па гэтых даўгох. І ўсё-ж такі Нямеччына мела мацнейшае войска, лепшы флёт, лепшую зброю, бо падземныя багацьці Нямеччыны былі большымі, даходы былі вялікшымі, прамысловасьць стаяла вышэй.

Пасьля вайны 1914-1918 г., адціснуўшы свайго галоўнага супарніка на эўропэйскім контынэнце, Нямеччыну, Францыя зноў набыла вельмі вялікую вагу, і цяпер паводле сваёй магутнасьці яна зьяўляецца другой пасьля Ангельшчыны дзяржавай Заходняй Эўропы. За межамі Францускае стараны ў Эўропе Францыя ўладае паўночнымі схіламі Пірэнэяў, заходнімі схіламі Альп і Юры і востравам Корсікай. У заэўропэйскіх краёх да Францыі належаць вялізныя колёніі ўва ўсіх частках сьвету. Паводле колькасьці і значэньня сваіх заэўропэйскіх уладаньняў Францыя стаіць на першым месцы пасьля Вялікабрытаніі.

У Афрыцы да Францыі належаць староны Атлясу, Сахара, Судан, Экватарыяльная Афрыка, Мадагаскар і г. д.; у Азіі—багаты Ўсходні Інда-Кітай; у Амэрыцы—частка Гваяны і Вэст-Індыі; у Вялікім акіяне—астравы Новая Каледонія, Таіты і шмат дробных. Разам 11416000 кв. клм. з 61148000 насельнікаў.

Французы лічацца вясёлым, жвавым, жыцьцярадасным, прыветлівым, здольным і дасьціпным народам. На полі народнай асьветы Францыю апярэдзілі толькі Нямеччына, Голяндыя і Норвэгія. Францускія навуковыя ўстановы зьяўляюцца ўзорам для ўсяго сьвету. Ува ўсіх галінах навукі, пісьменства і мастацтва французы маюць сваіх гэніяльных прадстаўнікоў, поплеч з ангельцамі і немцамі французы стаяць на чале сучаснай культуры.



Усе галіны гаспадаркі стаяць у Францускай старане вельмі высока. У Францускай дзяржаве болей за палову ўсёй зямлі займаюць нівы, вінаградні, сады, гароды. Паводле вырабу пшаніцы толькі Злучаныя Штаты і СССР перавышаюць Францыю. У Бэльгіі збожжа зьбіраюць мала, але затое ральніцтва стаіць там вельмі высока. Нідзе ня бывае такіх вялікіх ураджаяў, якія зьбірае Бэльгія. Вельмі высока стаіць выраб бурачнага цукру як у Бэльгіі, гэтак і ў Францыі; па вырабе віна Францыя займае 1-ае месца ў сьвеце. Ня глядзячы на высокае становішча сельскай гаспадаркі, свайго збожжа ў краі не хапае, і спажыўныя продукты падвозяцца з-за межаў. Каб мець магчымасьць купляць тавары за межамі, Францыя мусіць усімі спосабамі пашыраць у сябе фабрычную прамысловасьць, продукты якой можна было-б вывозіць у замену. Але для разьвіцьця фабрычнай прамысловасьці патрэбны запасы апалу, галоўным чынам каменнага вугалю.

На поўначы Францускае стараны ёсьць значныя паклады каменнага вугалю, прыблізна палова якіх належыць да Бэльгіі, так што Бэльгія мае вугалю ў дастатку. Наадварот, для вялікай Францыі свайго вугалю не хапае. Нямеччына, Вялікабрытанія, а тым барджэй Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі маюць у многа разоў большыя запасы падземнага апалу. Каб граць галоўную ролю на контынэнце Эўропы, Францыя перш за ўсё мусіць забясьпечыць сябе вугалем. З гэтай прычыны пасьля сусьветнай вайны Францыя захапіла так званую Саарскую каменна-вугальную акругу, якая належыла да Нямеччыны і ляжала на самай мяжы Францускае і Гэрманскае старон. Аднак і пасьля гэтага Нямеччына здабывала вугалю многа болей, як Францыя. Нават окупацыя ўсёй часткі Нямеччыны, якая ляжыць на захад ад Рэну, не дала Францыі пераватгі над Нямеччынай. З гэтай прычыны Францыя імкнецца заўладаць багатай на вугаль Рурскай акругай, якая ляжыць ужо на ўсход ад Рэну.

Жалеза ўва Францыі заўсёды здабывалася болей, чымся патрэбна для мясцовага ўжытку. Пасьля вайны да Францыі адышла ад Нямеччыны яшчэ вельмі багатая на жалеза Альзас-Лётарынгія. Такім чынам па здабываньню жалезнай руды Францыя ня мае супарнікаў у Эўропе. Ёсьць жалеза і ў Бэльгіі.

Фабрычная прамысловасьць Францыі вырабляе пераважна каштоўныя рэчы: акрасы, каштоўную вопратку, модныя прадметы і г. д. Продукты францускай і бэльгійскай прамысловасьці зьяўляюцца галоўнымі продуктамі вывазу з Францускае стараны. Значную ролю ў замежным гандлі Францыі грае вываз віна.

Унутраному гандлю Францускай стараны дапамагае густая сецьць найлепшых дарог. Чыгунак тутака крышку меней, чымся ў Нямеччыне, але

па колькасьці вадзяных і шосавых дарог Француская старана займае першае месца на зямлі. Суднаходныя рэкі злучаюцца за дапамогай каналаў у адну сецьЬ вадзяных шляхоў.

Па прыродзе і паводле асаблівасьцяй у занятках людносьці Францускую старану можна падзяліць на 7 краін: 1) Брэтанскі масыў, 2) Паўночна-Францускую нізіну, 3) Біскайскую нізіну, 4) Міжземнаморскую Францыю, 5) Сярэдня-Француская ўзвышша, 6) Усходнюю Францыю і 7) Бэльгійскую прамысловую краіну.

**Брэтанскі масыў** можа разглядацца, як працяг узгор'яў Паўднёва-Заходняй Ірляндыі і Корнуэльсу. Калісь гэтая краіна была горнай, але горы яе існавалі многа мільёнаў гадоў, выпятрэліся, размыліся вадой, і ўся краіна зрабілася нізкім узгор'ем, якое ледзь уздымаецца над суседнімі нізінамі. Цьвёрдыя граніты спарахнелі меней, як мяккія пласты. З гэтай прычыны яны складаюць галоўныя ўзгоркі краіны і месцам, асабліва каля берагоў мора, выглядаюць значнымі скалаватымі гарамі.

У склад Брэтанскага масыву ўваходзяць паўвостравы Брэтань і Котантэн, паўзьбярэжныя астраўкі і землі, што ляжаць абапал вусьцяў Люары. Мора глыбока ўразаецца ў паўвостраў Брэтань многалічнымі затокамі, падобнымі да заток Ірляндыі.

Прыплывы моцна адчуваюцца ў гэтых затоках; морскія хвалі бязупынна навальваюцца на скалаватыя берагі, з грукатам разьбіваюцца на тысячы пырскаў і няпрыметна руйнуюць гранітныя скалы.

Клімат краіны такі самы, як у Паўднёва-Заходняй Ірляндыі або на Корнуэльсе. Заходнія вятры прыносяць сюды з акіяну хмары, непагоду, дажджы. Узімку тут цёпла, як на ўзьбярэжжах Міжземнага мора (сярэдняя тэмпэратура студзеня ў Брэсьце $+6,3^0$), улётку мала сонца і мала цяплыні (сяр. тэмп. ліпеня ў Брэсьце $+17,9^0$). Адсутнасьць маразоў дазваляе тут узрастаць вечназялёным ляўрам, міртам, камэліям і фігам, але вінаграднік, пэрсікавыя ды абрыкосавыя дрэвы, якія добра растуць у суседніх нізінах, тутака гінуць ад недахвату цяплыні і сьвятла. Ігрушы і асабліва яблыні даюць тутака добрыя ўраджаі, з пладоў іх гатуюць яблычнае віно—сыдр, цукеркі; плады сушаць і вывозяць за межы краіны. Лепей, як у суседніх краінах, расьце тутака і гародніна: тут яна раней пасьпявае і дзеля таго вывозіцца ў Паўночна-Францускую нізіну, асабліва ў той час, калі там яшчэ няма ўласнай сьвежай гародніны. Найлепшыя, гусьцей за ўсё залюдненыя куточкі краіны ляжаць каля мора. Вялізныя прасторы тамака знаходзяцца пад сочнай заўсёды зялёнай пашай, па якой пасьвіцца добрае малочнае быдла і найлепшыя заводзкія коні. У моры ловяць селядцы, макрэлі, сардынкі і іншую рыбу. Насельнікі ўзьбярэжжаў выяжджаюць на рыбу далёка ад бацькаўшчыны пад Ісьляндыю і на падморскія мяліны каля амэрыканскага вострава Нью-Фаўндленду.



У сярэдзіне краіны, за выняткам маленькіх ураджайных куточкаў, краявід аднатонны і нудны. Сенажаці там горшыя, і насельнікі займаюцца пераважна гадоўляй авечак ды сеюць авёс, грэчку і бульбу. Вёсак там мала, пераважваюць хутары, а палі розных уласьнікаў аддзяляюцца адно ад другога жывымі платамі з дрэў і хмызьнякоў. Хмурая, бедная прырода і ўскрайнае палажэньне краіны адбіліся і на яе насельніках. Брэтанцы заўсёды мелі большую сувязь з морам, чымся з рэштай Францускай старонкі, жылі сваім асобным жыцьцём, засталіся ззаду ад іншых французаў у адносінах да асьветы, але ў большай чыстаце захавалі даўныя звычаі і мову. На захадзе Брэтанскага паўвострава да гэтага часу яшчэ гавораць на старасьвецкай кельцкай мове—мове даўных тубыльцаў Галіі.

У той час, калі Ангельшчыну заваёўвалі англы і саксы, частка яе даўных насельнікаў пераехала на Брэтань і зьлілася з тамтэйшымі кельтамі. Гэтым тлумачыцца і назоў паўвострава, які даўней зваўся ў адзнаку ад Вялікабрытаніі Малой Брытаніяй або Малой Брэтаняй.

За выключэньнем Заходняй Брэтані рэшта краіны залюднена паўночнымі французамі, якія пераважваюць і на Нормандзкіх астравох, што ляжаць у Ляманшы. Нормандзкія астравы належаць не да Францыі, як рэшта краіны, а да Брытанскай дзяржавы. Яны адзначаюцца ўраджайнай глебай, добрым становішчам садоўніцтва і гародніцтва. У час зьбіраньня пладоў сюды наяжджае шмат людзей з контынэнту на заработкі. Гандлёвыя зносіны злучаюць гэтыя астравы з *Брэстам* (74 тыс. нас.), найлепшай морскай крэпасьцю краіны, якая ляжыць на заходнім канцы паўвострава Брэтань.

Яшчэ большую, як Брэст, гандлёвую вагу мае *Нант* (184000 нас. у 1921 г.), што ляжыць на лейкавым вусьці Люары каля невялікай каменна-вугальнай акругі. Гэта асяродак гандлю сардынкамі і важны прамысловы горад з цукраварнямі, гарбарнямі і фабрыкамі мэталёвых вырабаў. Даўней у час прыплываў да Нанту даплывалі морскія караблі. У апошнія часы вусьце Люары памялела, а акіянскія караблі сучаснага тыпу, што сядзяць у вадзе глыбей, як даўнейшыя, ня могуць даплываць да самага гораду. З гэтай прычыны каля мора блізка вусьцяў Люары пабудавалася новая прыстань *Сэн-Назэр* (38000 нас.), праз які тавары, што прывозяцца з Францыі па Люары, выпраўляюцца ў Сярэднюю Амэрыку.

На поўдзень ад вусьцяў Люары ляжыць акруга Вандэя, вядомая сялянскімі паўстаньнямі ў час Францускай Рэволюцыі.

**Паўночна-Француская нізіна,** што ляжыць на ўсход ад Брэтанскага масыву, зьяўляецца калыскай і асяродкам Францускае дзяржавы. Гэта—вялікая раўніна, месцам гладкая, як стол, месцам крыху ўзгаркаватая або хвалістая. Паўднёвая палова краіны пахіляецца на захад у бок Атлянтычнага акіяну і абваднявецца ракой Люарай. Паўночная палова мае

выгляд катліны, у якой ускрайкі пакрысе падымаюцца і раптам абрываюцца знадворку. Ад краёў да асяродку гэтай катліны сьцякаюць рэкі, якія зьліваюцца ў поўнаводную павольную Сэну. Дзякуючы прамяністаму кірунку сваіх прытокаў, злучаных каналамі з усімі іншымі суднаходнымі рэкамі Французскай старонкі, Сэна зрабілася галоўнай гандлёвай дарогай Францыі, а яе вадазбор з гляістымі ўраджайнымі грунтамі заўсёды быў і застаўся ядром і сэрцам Французскай дзяржавы. У адзнаку ад Сэны, Люара, што цячэ з Сярэдня-Французскага ўзвышша, часамі мялее, так што яе мяліны перашкаджаюць руху параходаў; часамі-ж, наадварот, шырока разьліваецца і сваімі разводзьдзямі робіць многа шкоды насельнікам берагоў, затапляючы іх сады, нівы і будынкі. Грунты ў Люарскім вадазборы горшыя, як у Сэнскім. Значныя прасторы тут займаюць няўродныя пяскі і балоты. Аднак чалавек пастараўся і тут скарыстаць кожны кавалак зямлі. Пяскі тут засаджваюцца лесам; балоты, якіх нельга было асушыць,ператвараюцца ў саджалкі, па якіх гадуюць розную рыбу.



Мал. 49.—Крэйдавы бераг Нармандыі.

Клімат Паўночна-Французскай нізіны мяккі, але ўжо не такі хмарны, як у Брэтані. Цяплыні і сьвятла тутака хапае для вінаградніку і іншых далікатных расьлін. Сухменяў тут ніколі ня бывае, але няма і тэй



залішняй вільгатнасьці, якая перашкаджае ўзрастаньню збожжа ў Брэтані або ў Ірляндыі. Толькі ўзьбярэжжа Ляманшу, так званая Нармандыя, адзначаецца частымі навальніцамі і хмарнасьцю.

У асяродку краіны ў Парыжы сярэдняя тэмпэратура году $+11^0$ Ц, студзеня $+2{,}2^0$ ліпеня $+18{,}1^0$; ападкаў там каля 600 мілім.

Калі Брэтань нагадвае Ірляндыю або Заходнюю Ангельшчыну, дык Паўночна-Французская нізіна падобна да Ўсходня-Ангельскай раўніны, але перавышае яе выгодамі для сельскай гаспадаркі. Клімат тут цяплейшы, болей сонечны, грунты яшчэ болей ураджайныя, рэкі маюць вельмі выгодную будову. Усе куточкі краіны добра, старэнна апрацованы, уся зямля ўгнойваецца. З гэтай прычыны збожжа тут родзіць нават лепей, як на чорназеме Украіны і Паволжа. Больш за ўсё тут засяваюць пшаніцы, а хлеб пякуць выключна з пшанічнае мукі. Апрача таго сеюць авёс, а на хмарным узьбярэжжы Ляманшу авёс і ячмень нават болей пашыраны, чымся пшаніца. Паўсюды сеюць цукровыя буракі, так што тутэйшым цукрам задавальняецца ўся Французская старана, а частка цукру вывозіцца і за межы яе ў іншыя староны. Як і заўсёды пры палепшаных способах сельскай гаспадаркі, значныя прасторы засяваюцца кармавымі буракамі і кармавымі травамі, так што насельнікі краіны маюць магчымасьць гадаваць добрую жывёлу, асабліва коняй і малочных кароў. На Нармандзкім узьбярэжжы поплавы пераважваюць над ральлёй. Там, як у Брэтані, скаціну можна ганяць на пашу скрозь цэлы год. Сыр і масла вывозяцца адтуль ува ўсе куты Францыі і за межы. У далінах рэк, галоўным чынам у вадазборы Люары і на ўсходзе ў так званай Шампані, добра ўзрастае вінаграднік. Праўда, кусточкі вінаградніку тутака дробныя, нізенькія, але з пладоў іх вырабляюцца найлепшыя гатункі віна, напрыклад, слынныя шампанскія віны, якія вывозяцца адгэтуль ува ўсе краі сьвету. На паўночным захадзе краіны вінаград ужо не дасьпявае, але там добра расьце садовіна: яблыні, ігрушы, вішні і сьлівы. З яблыкаў, як і ў Брэтані, вырабляецца сыдр, які замянае тамака віно. Апроч таго, Нармандыя слыне сваімі гародамі.

Наагул усе галіны сельскай гаспадаркі маюць вельмі добрае становішча ў Паўночна-Французскай нізіне і даюць галоўны даход большасьці насельнікаў. Нетракапальная прамысловасьць тутака ня мае значэньня, але выгоднае палажэньне краіны дазваляе лёгка прывозіць сюды вугаль з Ангельшчыны цераз Ляманш і з Бэльгійскай краіны па штучных вадзяных дарогах і чыгунках. На гэтым прывезеным вугалі грунтуецца align рознастайная буйная фабрычная прамысловасьць, асабліва пашыраная ў асяродку Сэнскага вадазбору ў Парыжы і яго ваколіцах. У Шампані, на вадападзелах якой пасьвяць шмат авечак, пашыраны выраб воўны, па паўночных прытоках Люары апрацоўваюць ільняніну, у Нармандыі вырабляюцца карункі, апрацоўваецца бавоўна і г. д.

Добрае становішча сельскай гаспадаркі, фабрычнай прамысловасьці і гандлю зрабіла Паўночна-Францускую нізіну найбагацейшай краінай Францыі. Тут, асабліва ў вадазборы Сэны, жыве вельмі густое насяленьне (каля 226 ч. на 1 кв. клм.). Як на Брытанскіх астравох толькі на Ўсходня-Ангельскай нізіне магла стварыцца магутная дзяржава, гэтак і ўва Францускай старонцы калыскай Францускай дзяржавы была Сэнская катліна і наагул Паўночна-Француская нізіна. Насельнікі гэтай краіны зьяўляюцца найболей тыповымі французамі; ад провансальцаў яны адрозьніваюцца вышэйшым ростам, сьвятлейшым колерам скуры. Сярод іх часьцей можна спаткаць бялявых і шэравокіх. Наагул тут адчуваецца значная падмешка гэрманскай крыві ў раманізаванай кельцкай люднасьці. Тутэйшыя французы адзначаюцца спакайнейшым норавам, большай роўнаважнасьцю, чымсь іншыя раманцы. Але параўнаўча з ангельцамі і іншымі гэрманскімі народамі яны болей жвавыя, рухавыя, прыветлівыя, дасьціпныя, жыцьцярадасныя. Раманская бязрупатнасьць злучаецца ў французе з ашчэднасьцю і ўменьнем зьбіраць грошы.

Разам з агульным узбагачэньнем Францыі ў працягу XVII і XVIII в. гэта спрыяла разьвіцьцю капіталізму ў Францускай дзяржаве.

Тут раней, як у іншых дзяржавах Эўропэйскага кантынэнту, зьнік фэодальны лад, раней панаваньне шляхты замянілася панаваньнем буржуазіі. Затое тут раней абвастрылася змаганьне капіталу з працай. Ужо каля ста гадоў назад работнікі Францыі пачалі гуртавацца ў Саюзы Ўзаемнай Дапамогі. У 1871 г., пасьля няўдалай вайны з Нямеччынай, работнікі сталіцы нават скінулі ўладу буржуазіі, хаця і не маглі затрымаць надоўга ўладу ў сваіх руках. Аднак пасьля рэволюцыі 1871 г. францускія работнікі зразумелі патрэбнасьць адзінства, згуртованасьці, злучнасьці ў час змаганьня з капіталам. У 1872 г. профэсыянальныя саюзы францускіх работнікаў аб'ядналіся ў так званае Профэсыянальнае Работніцкае Аб'яднаньне. У 1895 г. большасьць профсаюзаў Францыі ўвайшла ў склад Гэнэральнай Конфэдэрацыі Працы. Гэтая Конфэдэрацыя трымалася незалежна ад палітычных партый, але члены яе выразна падзяліліся на 2 групы, так што ў 1920 г. і самая Конфэдэрацыя распалася згодна з гэтым на 2 арганізацыі: Агульны Работніцкі Хаўрус і Ўнітарную Гэнэральную Конфэдэрацыю Працы. Першым кіруюць так званыя рэформістыя, на чале другой стаяць рэволюцыйныя сындыкалістыя. Рэформістыя імкнуцца да супрацоўніцтва з буржуазіяй, баяцца грамадзянскай вайны, але ў час сусьветнай вайны заклікалі работнікаў да зброі супроць немцаў. Да СССР і Чырвонага Профінтэрну яны трымаюцца воража. Разам з падобнымі групамі другіх краёў яны згуртаваліся ў так званы Амстэрдамскі Інтэрнацыянал. Рэволюцыйныя сындыкалістыя, наадварот, заклікаюць работнікаў да адкрытай барацьбы з капіталістымі і лічаць неабходна патрэбнай агульную забастоўку. У 1914-18 г. яны выступалі супроць вайны і супроць захватніцкіх замераў Францускае дзяржавы. Анархісцкая большасьць іх не прызнае ані буржуазнай, ані савецкай дзяржавы, ня ба-



чыць патрэбы ані у дыктатуры пролетарыяту, ані ў чырвонай арміі. Сярод іх ёсьць і комуністыя, але дабіцца далучэньня Унітарнай Гэнэральнай Конфэдэрацыі да Маскоўскага Чырвонага Профінтэрну яны не пасьпелі.

Палітычныя арганізацыі францускіх работнікаў таксама, як і профэсыянальныя, часткай падтрымліваюць буржуазны ўрад Францыі, часткай упарта змагаюцца з ім. У час вайны большасьць францускіх палітычных партый заклікала народ да абароны бацькаўшчыны, і толькі маленькі гурток трымаўся воража да вайны, маючы на ўвазе адзінства інтарэсаў працоўнага люду ўсяга сьвету. У 1920 г. да гэтых ворагаў мілітарызму далучылася большасьць галоўнай з соцыялістычных партый Францыі, якая вырашыла далучыцца да Комуністычнага Інтэрнацыяналу і прыняць імя комуністычнай партыі. Цяпер компартыя Францыі налічвае 130000 членаў і вядзе ўпартую барацьбу за паляпшэньне дабрабыту работнікаў.

Галоўны горад Паўночна-Францускае нізіны—*Парыж*—зрабіўся сталіцай Францускай дзяржавы і грашовым і гандлёва-прамысловым асяродкам усёй Францускай старaны. Каля Парыжу сходзяцца галоўныя прыткі Сэны (якія?), на якой ляжыць гэты вялічэзны горад. Па рэках сюды з усіх бакоў прывозяцца важкія тавары. Як сьпіцы ў коле, у Парыжы сходзяцца і ўсе галоўныя чыгункі Францыі. Парыж—асяродак унутранага гандлю Францыі. З усіх яе куткоў, з усіх яе коленій дый з усіх краін зямлі сюды прывозіцца ўсё, што толькі вырабляецца на сьвеце.

Зразумела, што Парыж лічыцца горадам, у якім можна весела пажыць і, як кажуць, прыямней страціць грошы. Багатыры ўсяго сьвету часта наяжджаюць у Парыж, шукаючы там адпачынку, забаў і ўцех.

Для Францыі Парыж мае такую вагу, якой ня мае ніводная сталіца для сваёй дзяржавы. Перш за ўсё гэта разумовы асяродак Францускай дзяржавы. Тут знаходзяцца лепшыя вышэйшыя школы сьвету, найбагацейшыя бібліотэкі, музэі, тэатры. Моладзь з усіх кутоў Эўропы, з Амэрыкі, з Афрыкі, нават з Азіі і Аўстраліі ў вялікім ліку зьяжджаецца вучыцца ў Парыж. З гэтай прычыны і да сяго ящчэ часу Парыж мае права звацца сусьветнай сталіцай, хаця па колькасьці насельнікаў ён застаўся далёка пазаду Лёндону і Нью-Ёрку. Усе выдатныя пісьменьнікі і мастакі Францыі, вучоныя, наагул усе талентныя, выдатныя людзі імкнуцца ў Парыж, каб тамака знайсьці поле для сваёй працы. Гэта нават шкодзіць Францускай дзяржаве, бо такім способам Парыж выкачвае ўсе жывыя сілы яе, адцягвае іх ад зямлі і ад другарадных гарадоў. Парыж увасабляе ўсю Францыю. Настрой Парыжу—гэта настрой усёй Францыі, погляды Парыжу—погляды Францыі.

Як прамысловы горад, Парыж мае шмат рознастайных фабрык. Тут вырабляюцца шоўкавыя, баваўняныя і ваўняныя тавары, асабліва модная гатовая вопратка. Мэбля, абуцьцё, хімічныя продукты, гадзіньнікі, мыла,

парфума, фізычныя і оптычныя прылады, машыны і іншыя парыскія вырабы слынуць на ўвесь сьвет. На сусьветны рынак Парыж пастаўляе перш за ўсё дарагія тавары, рэчы раскошы і моды.

Перад вайной Парыж быў 3-ім горадам сьвету па ліку насельнікаў, але спрачаўся за гэтае месца з сталіцай Нямеччыны Бэрлінам, бо меў, як і той, каля 3000000 насельнікаў. З пачатку вайны ў час наступу немцаў на Марну горад часова апусьцеў, потым ізноў засяліўся, і цяпер налічвае 2906000 насельнікаў, а разам з прадмесьцямі 4411000.



Мал. 50.—Эйфэлева вежа ў Парыжы.

Парыж—адзін з найпрыгажэйшых гарадоў зямлі. Багатыя прыгожыя сучасныя будынкі, званіцы і вежы сабораў, харошыя бульвары й сады, гаі-паркі, шырокія пляцы, пекныя помнікі робяць надта прыемнае ўражаньне.

Пасярэдзіне гораду на востраве паміж дзьвюма адтокамі Сэны ляжыць „Сітэ“, найдаўнейшая частка Парыжу з услаўленым саборам парыскай божай маткі. Яшчэ ў VI в. да пачатку хрысьц. эры тут пабудаваўся горад Лютэцыя, які з цягам часу пашырыўся, перакінуўся цераз абедзьве адтокі Сэны і зрабіўся Парыжам. На правым паўночным беразе Сэны знаходзіцца сучасны асяродак сталіцы з найлепшымі крамамі, кавярнямі, тэатрамі і г. д. Трамваі, самаходы, фурманкі дзень і ноч мітусяцца па вуліцах і завулках. Сотні тысяч людзей ходзяць, бегаюць, турбуюцца ў гэтай частцы Парыжу. Нават пад зямлёй



гудуць і грукаюць вагоны мэтраполітэну. На левым беразе Сэны ляжаць культурна-асьветныя ўстановы, вышэйшыя школы, скучаныя ў так званым латыньскім квартале, дзе жывуць студэнты, уцекачы з чужаземных дзяржаў, што знаходзяць прытулак у гасьціннай французскай сталіцы, вучоныя, мастакі і г. д. Тут знаходзіцца і вялізнае Марсава поле з слыннай Эйфэлевай вежай, якая лічыцца адным з найвышэйшых будынкаў зямлі (Гл. мал. 50).



Мал. 51.—Парыж. Сабор парыскай божай маткі.

У ваколіцах Парыжу знаходзіцца шмат прадмесьцяў сталіцы, дачных мест, фабрычных пасёлкаў і г. д. Сюды належаць *Булёнь-на-Сэне* (68000 н.), аддзеленая ад сталіцы прыгожым Булёньскім лесам, месцам шпацыру парыжцаў; *Сэн-Дэні* (76000 н.); *Вэрсаль* (65000 н.), даўная бліскучая гаспода французскіх каралёў з чароўнымі садамі і палацамі; *Сэўр* з вялікай парцалянавай фабрыкай і іншыя. Буйное разьвіцьцё Парыжу пераршкаджае ўзрастаньню іншых гарадоў Паўночна-Французскай нізіны. Большасьць сярэдніх і малых гарадоў краіны зьяўляюцца ціхамірнымі старасьвецкімі местамі.

Такі характар маюць і галоўныя пункты Люарскага вадазбору: *Орлеан* (69000 н.) з ваўнянымі і баваўнянымі фабрыкамі, *Тур* (75000 н.), выробляючы шоўк і скуру, *Ле-Ман* (72000 н.), слынны апрацоўкай ільняніны і г. д.

Параўнаўча багатым горадам зьяўляецца *Руан* (у 1921 г. 124000 нас.) з буйной баваўнянай і мэталёвай прамысловасьцю, які ляжыць на Сэне ў тым яе месцы, да якога ў час прыплыву даплываюць морскія караблі.

Сучасныя акіянскія караблі, што ходзяць з Эўропы ў Амэрыку, не даходзяць да Руану. З гэтай прычыны галоўнай францускай прыстаньню на Ляманшы зрабіўся *Гаўр* (163000 нас.), які ляжыць каля адкрытага мора блізка вусьцяў Сэны. Сюды прывозяць для Парыжу баваўну і калёніяльныя тавары, а адгэтуль вывозяцца модныя і каштоўныя фабрычныя вырабы сталіцы. (Вартасьць прывезеных і вывезеных праз Гаўр тавараў дасягала да вайны 1032 мільён. рублёў золатам).

На ўсходзе краіны ў Шампані самым вялікім і важным горадам зьяўляецца *Рэймс* (77000 нас.) з вядомым прыгожым саборам, сапсутым нямецкімі снарадамі ў час вайны 1914-18 г. Тут апрацоўваецца шампанская воўна і вырабляюцца слынныя шампанскія віны.



Мал. 52.—Парыж. Надземная электрычная чыгунка.

**Біскайская нізіна** абымае паўднёва-заходнюю частку Францыі і зьяўляецца крайнім паўднёва-заходнім кутком тэй вялікай нізіны, якая цягнецца блізка-што праз усю Эўропу ад Пірэнэяў аж да Ледаватага і Белага мораў. Лежачы ля берагоў Біскайскае заток і, краіна выглядае сухаземным працягам яе дна, і запраўды была калісь часткай Біскайскай затокі. Нават і цяпер бераг краіны паступова, хоць і павольна, нарастае,



і ўсё новыя часткі мора што-год ператвараюцца каля берагоў у сухазем'е. Паўзьбярэжныя морскія хвалі бязупынна накідваюць на бераг шмат пяску, з якога на ўсім узьбярэжжы стварыліся выдмы ў 45 і болей сажняў увышкі. За йстужкай выдмаў распасьціраецца палоска лагчын, пакрытых балотамі і вазёрамі. Гэта так званыя лянды, няўродная пескавая або балотная мясцовасьць, па якой даўней бадзяліся толькі статкі авечак ды тупалі, як буслы па балоце, пастухі на хадулях. Цяпер чалавек засадзіў па выдмах хваёвыя бары, пабудаваў сярод іх смалярні і дзягцярні, а балоты асушыў і таксама перавярнуў іх на лясы.

За выняткам паўзьбярэжных ляндаў большая частка Біскайскай нізіны можа лічыцца багатым і ўраджайным краем. Палі кіяхоў і пшаніцы чаргуюцца тутака з садамі пэрсікаў, абрыкосаў і йгруш, вінаграднямі і гародамі. Асабліва добра ўзрастаюць усялякія карысныя расьліны ў далінах рэк (Гароны, Адуру, Шаранты). Найвялікшая з гэтых рэк Гарона, злучыўшыся з Дордоньню, уліваецца ў Біскайскую затоку шырокім лейкавідным вусьцем (якое мае назоў Жыронды). Гарона пачынаецца ў Пірэнэях, жывіцца іх сьнягамі і заўсёды мае шмат вады. Часамі пасьля ўлеваў або пасьля залішне шпаркага раставаньня горных сьнягоў Гарона моцна разьліваецца, затапляе сады, фэрмы, вёскі і гарады, што ляжаць у яе даліне. Вышнявіну Гароны злучылі штучным суднаходным каналам з Міжземным морам і такім чынам пралажылі простую вадзяную дарогу ад паўднёвых да заходніх берагоў Францускае дзяржавы.

Клімат Біскайскай нізіны цёплы і мяккі. Суседзтва мора зьмяншае летнюю сьпякоту, а ўзімку тут таксама цёпла, як у Брэтані. Ападкі тутака выпадаюць ува ўсе поры году; летніх сухменяў, падобных да сухменяў Гішпаніі ці Італіі, ня бывае.

Больш за ўсё ападкаў выпадае на ўзьбярэжжы (каля 1000 мілім). Сярэдняя тэмп. году тутака віхаецца між $+12^0$ і $+14^0$, самы холодны месяц мае сяр. тэмп. ў сярэдзіне краіны, у Бордо $+5{,}6^0$, самы цёплы $+20{,}6^0$.

Тут ужо могуць расьці шмат якія вечназялёныя дрэвы: каменны дуб, міжземнаморская хвоя, ляўр, на поўдні трапляецца нават корачны дуб. Аднак алейнае дрэва, галоўная расьліна Паўднёвай Эўропы, тутака ня можа расьці; летняй цяплыні, сонца і сьвятла ёй тут не хватае. Наадварот, дрэвы з ападаючым лісьцем і між імі ядобны каштан пераважваюць над дрэвамі вечназялёнымі.

Люднасьць краіны складаецца з провансальцаў, у вадазборы Гароны, і паўночных французаў, на поўнач ад Жыронды.

Апрача таго ў паўднёвай частцы можна прымеціць уплывы, пакінутыя тубыльцамі-баскамі, якія ў межах краіны ўжо афранцузіліся.

Галоўным заняткам люднасьці зьяўляецца ральніцтва, вінаградніцтва, садоўніцтва. Кіяхамі, якія тутака пераважваюць сярод гатункаў збожжа,

кормяць сьвіней; паўсюды трымаюць многа хатніх птушак, а ў ляндах пасьвяць авечак. Па берагох Біскайскай затокі ловяць рыбу-сардынак і ядобных сьлімакоў - вустрыц. З вінаграду вырабляюць слынныя бордоскія віны.

Палажэньне краіны між Атлянтыкай і Міжзем'ем на мяжы Францыі і Гішпаніі спрыяе гандлёваму значэньню краіны, але нявыгодная будова берагоў, пескаватых, плыткіх, недаступных для сучасных акіянскіх караблёў і аддзеленых ад сярэдзіны краю бязьлюднымі выдмамі і балотнымі ляндамі, перашкаджае морскаму гандлю. Толькі на Жырондзе морскія караблі знаходзяць месца прыстою каля гораду *Бордо* (у 1921 г. 267000 нас.), прыстань якога даступна для іх у час прыплыву. З Бордо вывозяцца найлепшыя гатункі бордоскіх він. Праз Бордо праходзіць важная чыгунка, якая пераразае Пірэнэі і злучае Парыж з Мадрыдам.



Мал. 53.—Лоў вустрыц каля берагоў Паўд.-Зах. Францыі.

На вышнявіне Гароны, у тым жа месцы, дзе ад гэтай ракі адходзіць канал у Ліонскую затоку Міжземнага мора, ляжыць *Тулюза* (175000 нас.) з унівэрсытэтам і многалічнымі фабрыкамі, якія апрацоўваюць сельскагаспадарчыя продукты (асабліва там многа паравых млыноў).

**Міжземнаморская Францыя** абымае ўзьбярэжжа Ліонскай затокі Міжземнага мора і даліну ракі Роны ад яе суткі з Саонай да вусьця. Большая частка гэтай краіны зьяўляецца нізінай, але й тут можна пра-



сачыць ня вельмі выразныя адгор'і Пірэнэйскага ўкладу горных зморшчаў, якія дасягаюць значнай вышыні на ўсходзе ўжо ў беспасрэднай блізкасьці да Альп, дзе яны маюць назоў Провансальскіх гор. Паўднёва-ўсходні куток краіны, што ўразаецца ў Міжземнае мора між Ліонскай і Гэнуйскай затокамі (а таксама адломаныя там ад сухазем'я Гіэрскія астравы), мае выгляд горсту і нагадвае горсты Тырэнскіх астравоў (Корсікі і Сардыніі).

Палажэньне Міжземнаморскай Францыі вельмі выгоднае. Лагчына, па якой цякуць Рона і яе прытока Саона, зьяўляецца адзінай дарогай ад берагоў Міжзем'я ў Сярэднюю і Паўночную Эўропу, дарогай на якой няма значных перашкод у стане папярочных горных ланцугоў. З гэтай прычыны Саонска-Ронская лагчына заўсёды была шляхам, па якім ішлі гандлёвыя і культурныя зносіны між Італіяй і іншымі міжземнымі старонамі з аднаго боку і Францыяй ды Нямеччынай—з другога. Па гэтай дарозе пасоўвалася рымская культура, пашыраючыся ў нашай частцы сьвету; па гэтай дарозе латыньская мова ўлілася ў Францускую старану.

Рона, галоўная рака Міжземнаморскай Францыі, пачынаецца ў Альпах, заўсёды мае многа вады, бо жывіцца альпійскімі ледавікамі і зьяўляецца суднаходнай на ўсім сваім працягу ад суткі з Саонай да дэльты. Самая дэльта аднак заносіцца пяском, так што параходы ледзь могуць праціснуцца з ракі ў мора.

Дэльта гэтая адзначаецца вялікай колькасьцю балот і зьяўляецца добрым прытулкам для качак і іншых вадзяных птушак, што хаваюцца тутака паміж чаротаў і асакі. Даўней у гэтай дэльце пасьвіліся напалову дзікія коні, каровы і бавалы; цяпер і сюды заглянула культура, але нездаровае надбалотнае паветра і распаўсюджаныя тут трасцы й да гэтага часу робяць гэтую акругу нявыгоднай для жыцьця чалавека. Затое навокала суседнія мясцовасьці, дзякуючы цёпламу сонечнаму клімату, могуць лічыцца аднымі з найлепшых куточкаў Францыі.

Адгароджаная з усходу Альпамі, а з паўночнага захаду зрывістым краем Сярэдня-Францускага ўзвышша—Сэвэнамі, Міжземнаморская Францыя знаходзіцца пад беспасрэдным уплывам Міжземнага мора і карыстаецца тыповым падзваротнікавым кліматам, такім самым, як і паўднёвыя паўвостравы Эўропы. Лета тут сухое і гарачае, зіма і восень вільгатныя, цёплыя. (У Марсэлі сярэдняя тэмпэратура студзеня $+6,4^{0}$).

Асаблівасьцю мясцовага клімату зьяўляецца халодны і сухі паўночны вецер—містраль, які часамі што-дзень дзьме гэтак моцна, ажна зьбівае з ног людзей, коняй і перакульвае цягнікі. Пад уціскам гэтага ветру ўсе дрэвы Ронскай даліны пахіліліся сваімі верхавінамі на поўдзень.

Падзваротнікавы клімат Міжземнаморскай Францыі спрыяе разьвіцьцю там багатай расьліннасьці. Паўсюды там вельмі добра ўзрастаюць морва, і вечназялёныя хмызнякі ляўраў і міртаў, вечназялёныя дубы, міжземнаморская хвоя і купрэсы.

(Купрэсамі тутака абсаджваюць сады, каб засланіць іх ад містралю).

Ува ўсёй Францускай старонцы толькі тут можа расьці галоўная міжземнаморская расьліна—алейнае дрэва, з пладоў якога выціскаюць найлепшы прованскі алей. Плянтацыі алейных дрэў, морвы, прыгожых кветак, якія адгэтуль вывозяцца ўва ўсе мясцовасьці Паўночнай і Сярэдняй Эўропы, вінаградні, сады паўднёвых пладовых дрэў складаюць галоўнае багацьце краіны. Выцісканьне прованскага алею, гадоўля шаўкоўных вусеняў, выраб віна зьяўляюцца галоўнымі заняткамі насельнікаў. На ўзьбярэжжах, апроч таго, займаюцца рыбацтвам—ловяць рыбу-тунцоў, а на захад ад дэльты Роны ў маленькіх, аддзеленых ад мора затоках-лягунах, здабываюць соль.

Фабрычная прамысловасьць грунтуецца на апрацоўцы шоўку і асабліва пашырылася ў даліне Роны пасуседзтву з каменна-вугальнымі пакладамі Сярэдня-Францускага ўзвышша. Там перарабляецца ня толькі мясцовы, але галоўным чынам прывезены з Італіі і іншых старонак шоўк-сырэц.

Як і ў Паўднёвай Эўропе, раскошная расьліннасьць садоў і плянтацый трапляецца ў Міжземнаморскай Францыі толькі ў штучна абваднёных мясцовасьцях пераважна каля рэк. Там, дзе штучнае абвадненьне не магчыма, па сухіх пылаватых прасторах сустракаецца толькі ўбогая стэпавая трава.

Лежачы каля самай Італіі, Паўднёва-Усходняя Францыя, раней за ўсе іншыя часткі Францускае стараны, падпала пад уплывы латыньцаў і зрабілася провінцыяй даўна-Рымскай дзяржавы. З гэтай прычыны і да сяго часу люднасьць гэтай краіны адзначаецца найбольшай падобнасьцю да італійцаў. Мова тутэйшых насельнікаў завецца провансальскай (па імю Provance=латыньская Provincia, як звалася паўднёва-ўсходняя частка краіны) і мае шмат супольнага з каталёнскай мовай, што пануе ўва Усходняй Гішпаніі. На провансальскай мове ў сярэднія вякі складаліся творы даўных трубадураў, якія пяялі свае вершы па палацах розных каралёў, гэрцогаў і графаў. З часам провансальская поэзія занялала. Большасьць сучасных насельнікаў краіны навучаецца ў паўночна-францускай пісьменнай мове і працуе на карысьць паўночна-францускай культуры, усё роўна як беларусы некалькі вякоў працавалі на карысьць расійскай або польскай культуры.

У апошнія часы провансальская мова зноў пачала разьвівацца; цяпер яна мае ўжо сваю досыць багатую літаратуру*).

Дзякуючы свайму выгоднаму палажэньню, Міжземнаморская Францыя мае важнае гандлёвае значэньне. Сюды прывозіцца збожжа з Украіны, лес з Беларусі, шоўк-сырэц з Італіі, Японіі, Кітаю і г. д. З Францыі

*) Провансальская мова завецца яшчэ інакай langue d'oc у адзнаку ад паўночна-францускай, якую завуць langue d'oui, бо провансальцы гавораць замест нашага „але"—„ос", (ок), а паўночныя французы „oui" (вуй).



праз тутэйшыя прыстані вывозяць віно, прованскі алей, апрацованы шоўк, мыла і г. д. Большая частка гэтых тавараў ідзе праз горад *Марсэль* (685000 нас. у 1921 г.), які з даўных часоў лічыцца брамай з Міжзем'я ў сярэднюю паласу Эўропы. Гэта самая важная прыстань на Міжземным моры (гандлёвы абарот 1318 міл. рубл. золатам да вайны) пабудована на ўсход ад вусьцяў Роны, бо самая дэльта Роны недаступна для морскіх параходаў, дый на захад ад яе паўзьбярэжнае цячэньне прыбівае да берагоў шмат пяску і робіць гэтыя берагі нявыгоднымі для прыстою караблёў. На ўсход ад Марсэля ляжыць вайсковая прыстань *Тулён* (106000 н.) з майстэрнямі караблёў, а яшчэ далей ужо блізка ад Ніцы ў прыгожай мясцовасьці знаходзіцца курорт *Каны* (30 т. н.), слынны карысным кліматам і плянтацыямі кветак. Прамысловыя гарады краіны ляжаць далей ад мора бліжэй да Сярэдня-Францускіх узвышшаў. Галоўным з іх ёсьць *Ліон* (562000 н.), што ляжыць пры сутоцы Роны і Саоны. Гэта першы горад Эўропы па апрацоўцы шоўку і па вырабе аксаміту. (Апроч таго тут пашыраны выраб машын, жалезных тавараў і хімічных продуктаў).

Значныя шоўкавыя фабрыкі ёсьць яшчэ ў гарадох: *Німе* (83000н.), *Монпэлье* (82000 н., унівэрсытэт) і *Авіньоне* (49000 н.), даўнейшай гасподзе рымскіх папаў у часы заняпаду Рыму.

**Сярэдня-Францускае ўзвышша** ляжыць на паўночны захад ад Міжземнаморскай Францыі і на паўночны ўсход ад Біскайскай нізіны. На захад гэтае ўзвышша спадае паволі і пакрысе пераходзіць у нізіну, на паўднёвы ўсход строма раптам абрываецца. Калі з Ронскай нізіны глядзець на паўднёва-ўсходні край Сярэдня-Францускага ўзвышша, дык гэты край здаецца значным горным ланцугом, які атрымаў назоў Сэвэнаў. Але ўзьлезшы на Сэвэны ўбачым, што на захадзе гэты горст ня мае выразнага схілу і пераходзіць у пустынную і камяністую роўнядзь, ледзь прыкрытую ўбогай траўкай. Сярод нудных голых плоскаўзвышшаў толькі дзе-ні-дзе вызначаюцца рэчныя даліны, па якіх у зелені каштанаў, садовых дрэў і вінаградняў хаваюцца вёскі, здароўніцы і гарады. Для рэк Францыі Сярэдня-Францускае ўзвышша зьяўляецца галоўным вадападзелам, галоўным рэчным вузлом. Паводле свайго пахаджэньня Сярэдня-Француская краіна зьяўляецца горставым краем. Калісь, яшчэ ў першыя часы жыцьця на зямлі, тут існавалі зморшчавыя горы, якія з цягам часу былі зьнішчаны выпятрэньнем і размываньнем. Потым, ужо параўнаўча нядаўна, земная кара тут патрэскалася, раскалолася на кавалкі, з якіх адны, сучасныя горсты, павыпіраліся ўгару, другія зрабіліся грабэнамі, перавярнуліся ў лагчыны, па якіх цяпер бягуць рэкі, напрыклад, вышнявіна Люары і яе прытока Алье. З шчылін, якія засталіся паміж суседнімі кавалкамі земнай кары, павылівалася шмат цякучай лявы, якая заліла вялікія прасторы ў краіне. У мясцовасьцях, пакрытых гэтай астыглай, але яшчэ не спарахнелай лявай, і цяпер яшчэ ўздымаецца шмат згаслых вульканаў (найвышэйшы з іх Мон-д'Ор—1886 м. н. р. м.), якімі асабліва

багата мясцовасьць Овэрнь у сярэдзіне краіны. Магчыма, што лява там пасьпела астыгнуць толькі на самай паверхні. Многалічныя мінэральныя крыніцы з цёплай або і з гарачай вадой выходзяць там на паверхню, а гэта сьведчыць, што ня вельмі глыбока пад зямлёй яшчэ захаваліся гарачыя пласты. Месцам вульканічныя скалы, што стварыліся з астыглай лявы, яшчэ не пасьпелі пакрыцца глебай, і мала якая трава можа расьці на іх.

Ня лепшая расьліннасьць трапляецца па вапнякох, з якіх месцам складаюцца Сэвэны (напрыклад, мясцовасьць Кос у вышнявіне ракі Тарн, прыток! Гароны). Як у Дынарскіх горах, рэкі тамака прамылі глыбокія цясьніны—каньёны, або пячоры, па якіх бягуць пад зямлёй; скалы там часта маюць нязвычайныя, дзіўныя формы; па пустынных прасторах могуць расьці самыя нягрэблівыя травы. (Як завуцца і чым тлумачацца такія зьявы?).

Лежачы на дарозе заходніх вятроў, Сярэдня-Французскае ўзвышша мае хмарны, вільгатны клімат, а з прычыны сваёй досыць значнай вышыні адзначаецца ад суседніх краін меншай цяплынёй, болей трывалым сьнегавым насьцілам і досыць моцнымі маразамі ўзімку. Толькі ў далінах клімат крыху сушэйшы, а непагода бывае радзей. Даўней па схілах гор зарасьлі ігластыя лясы, цяпер іх павысякалі, і на іх месцы зьявіліся зарасьнікі верасу або скудныя лугі. Аднак і верасы добра растуць толькі па лепшых кутках, дзе падгруньце складаецца з гранітаў ці крышталічных лупнякоў (а ня з лявы і вапнякоў).

У далінах Алье і Люары растуць гаі грэцкіх арэшнікаў і ядобных каштанаў, плады якіх граюць значную ролю ў пражыўленьні мясцовай люднасьці. Плады каштанаў, яблынь і груш зьяўляюцца тут важным дадаткам да хлеба. Па далінах сеюць кіяхі, а ў лепшых месцах вадападзелаў—жыта, грэчку, бульбу.

Наагул ральніцтва стаіць кепска. Большую вагу мае гадоўля жывёлы: коз у Сэвэнах, авечак у Овэрні, быдла па лепшых, болей сочных лугох на захадзе краіны.

Падземныя багацьці сустракаюцца толькі дзе-ні-дзе ў маленькіх, раскіданых пераважна на ўсходзе акругах. Там здабываюць каменны вугаль, жалеза і цыну, там пашырылася і фабрычная прамысловасьць, там і людносьць жыве досыць густа. Наадварот, па голых скалах Овэрні і па вапнякох гушчыня залюдненьня малая (25-45 ч. на кв. клм.).

Найгусьцей залюднёная акруга знаходзіцца на ўсходзе ў ваколіцах гораду *Сант-Эт'ен* (168000 нас. у 1921 г.—гушчыня залюдненьня дасягае да 300 ч. на кв. клм.). Вугалем суседніх капальняў карыстаюцца фабрыкі зброі, машын і іншых жалезных вырабаў, якія адгэтуль вывозяцца праз Ліон.

Другі прамысловы, багаты вугалем куток ляжыць на паўночным усходзе, дзе праходзіць важны суднаходны канал, што злучае Саону з Люарай. Там знаходзіцца места *Крэзо* (35 тыс. нас.), якое супарнічала з



Эсэнскімі фабрыкамі Крупа ў Нямеччыне па вырабе гармат і машын. У Овэрні каля гары Мон-д'Ор ляжыць культурна-асьветны асяродак краіны *Клермон-Фэран* (83000 н.) з унівэрсытэтам. Апроч таго, у розных мясцовасьцях краіны, дзякуючы вялікай колькасьці мінэральных крыніц, пабудована невялікія, але важныя месты—здароўніцы або курорты, да якіх штогод прыяжджаюць тысячы хворых з усёй Францыі лячыцца вадою крыніц. (Найболей вядомы курорт *Вішы* (17000 н.) на рацэ Алье). Насельнікі Сярэдня-Французскага ўзвышша—працавіты, ашчэдны і ўпарты народ. Паводле сваёй мовы яны блізка стаяць да паўднёвых французаў—правансальцаў.

**Усходняя Францыя** мае вельмі featureразнастайную паверхню. У склад яе ўваходзіць: грабэн, па якім цячэ прытока Роны Саона, грабэн Вышняга Рэну, які аддзяляе Французскую старану ад Нямеччыны, Вогезы, правільны горст (1426 м. увышкі), складзены з крышталічных скал і засланяючы Вышня-Рэнскую нізіну з захаду, Лётарынгскае плоскаўзвышша, нарэшце ўсходнія ўскрайкі Паўночна-Французкай нізіны, якія строма абрываюцца на ўсход і паволі зьніжаюцца ў бок вадазбору Сэны.

Да гэтых паднятых ускрайкаў Сэнскай нізіны належаць Кот-д'Ор, што засланяе з захаду Саонскую нізіну, і плоскаўзвышша Лянгр, паміж якімі праходзіць так званы Бургонскі канал, што злучае вадазборы Саоны і Сэны. Ад плоскаўзвышша Лянгр да Вогез цягнуцца серпавідныя горы (Мон-Фосіль), у якіх пачынаецца з аднаго боку Саона, з другога Маас, што цячэ ў глыбокай даліне між Лётарынгскім плоскаўзвышшам і Аргонскім Лесам, як там завуць усходнія паднятыя ўскрайкі Сэнскай катліны.

Лётарынгскае плоскаўзвышша абвадняецца прытокай Рэну Мозэлем і зьяўляецца пераходным краем паміж Французскай стараной і Нямеччынай. Выразнай прыроднай мяжы між гэтымі дзьвюма старонамі тут няма. Лётарынгія слыне вельмі вялікімі пакладамі жалезнай руды.

Лётарынгія заўсёды была спрэчным кавалкам, з-за якога французы біліся з немцамі. Апошні раз немцы захапілі Усходнюю Лётарынгію ў вайну 1870—71 г. і з таго часу пасьпелі значна анямечыць яе насельнікаў, але ў сусьветную вайну 1914-18 г. Француская рэспубліка адваявала яе і нават часова захапіла гэтак званую Саарскую каменна-вугальную акругу, што ляжыць на паўночны ўсход ад Лётарынгіі і залюднена выключна немцамі. Лёс Усходняй Лётарынгіі разьдзяляў Альзас, што ляжыць між Вогезамі і Рэнам у Вышня-Рэнскім грабэне. Людносьць яго гаворыць на аднэй з нямецкіх гаворак, але ня лічыць сябе немцамі і зьяўляецца асобным народам, пераходным паміж французамі і немцамі. Запраўдныя немцы пасяліліся ў Альзасе і на паўночным усходзе Лётарынгіі, галоўным чынам у час нямецкага забору з 1871 1918 г. Рэшта краіны залюднена паўночнымі французамі.

Грунты Ўсходняй Францыі лепшыя, а клімат сушэйшы, як у Сярэдня-Францускім узвышшы. Неба тутака болей яснае, розьніца між зімой і летам большая, чымся ў іншых краінах Францускай старонкі. Па схілах гор захавалася яшчэ многа букавых і каштанавых лясоў, па якіх яшчэ й цяпер жыве многа ваўкоў, якія ўжо зьвяліся ў рэшце Францыі.

Як амаль і паўсюды ўва Францыі, большая частка зямлі знаходзіцца тут пад нівамі і вінаграднямі. Альзас у даліне Вышняга Рэну і даліна Саоны адзначаюцца вялікай ураджайнасьцю і слынуць найлепшымі гатункамі він (асабліва вядомы бургонскія віны, якія выраблююцца ў Саонскай нізіне). Там добра сьпеюць пшаніца, кіяхі, хмель. Па вадападзелах пашырана гадоўля жывёлы. Дзякуючы багацейшым пакладам жалезнай руды, у Лётарынгіі добра стаіць нетракапальная прамысловасьць. Мясцовая руда



Мал. 54.—Сабор у Страсбурзе.

адгэтуль вывозіцца ў іншыя краіны Францыі і нават за межы Францускай дзяржавы. Наадварот, мясцовага каменнага вугалю не хапае, і яго сюды прывозяць з поўначы і з ўсходу (з Саарскай акругі і іншых куткоў Нямеччыны). Фабрычная прамысловасьць складаецца з апрацоўкі жалезнай руды і воўны; апроч таго, у Альзасе мае вагу бавоўняная, а ў Лётарынгіі шкляная прамысловасьць (у Бакара).



Галоўным горадам у Саонскай нізіне зьяўляецца *Дыжон* (79000 нас.), склад бургонскіх він і культурны цэнтр (унівэрсытэт). У Лётарынгіі галоўны горад *Нансі* (113000 нас. у 1921 г.) з унівэрсытэтам і шматлічнымі фабрыкамі жалезных і вауняных вырабаў.

На Маасе ляжыць *Вэрдэн* (21 т. нас.), француская крэпасьць, вядомая адбіцьцем упартых атак нямецкага войска ў час сусьветнай вайны. На Мозэлі у тэй частцы Лётарынгіі, якая была пад нямецкім заборам, ляжыць даўней нямецкая, цяпер француская крэпасьць *Мэц* (62 тыс. нас.).

У Альзасе на скрыжаваньні дарог, што злучаюць Нямеччыну з Швайцарыяй і Рэн з Марнай (канал), ляжыць *Страсбург* (167000 нас. у 1921 г.) гандлёвы асяродак Альзасу з слынным харошым саборам і ўнівэрсытэтам.

Прамысловым асяродкам Альзасу трэба лічыць *Мюльгуз* (99000 н.), які стаіць на канале з Рэну ў Саону, з буйнымі фабрыкамі баваўнянкі.

Паўднёвы куток Альзасу, які заставаўся францускім праз увесь час забору рэшты гэтай акругі, мае свой асяродак—*Бэльфор* (40000 нас.), крэпасьць, якая пануе над так званай Бургонскай Брамай. Гэтая Брама між Юрой і Вогезамі злучае нізіну вышняга Рэну з вадазборам Саоны. Праз яе праходзіць Рэнска-Саонскі канал і важныя чыгункі.

**Бэльгійская краіна** займае самую паўночную частку Францускай стараны. Галоўныя адзнакі гэтай краіны—вялікае багацьце карыснымі мінэраламі, асабліва-ж вугалем, багацьце, якое адбіваецца на ўсім жыцьці краіны і дадае асаблівае адценьне яе краявіду. Другая асаблівасьць Бэльгійскай краіны—магутнае разьвіцьцё гандлю ў зьвязку з палажэньнем сярод трох найвялікшых дзяржаў Эўропы: Францыі, Ангельшчыны і Нямеччыны, для якіх краіна зьяўляецца гандлёвай пасярэдніцай.

Паводле сваёй прыроды Бэльгійская краіна можа быць падзелена на 3 часткі: паўднёвую, сярэднюю і паўночна-заходнюю.

Паўднёвая частка мае выгляд узвышша, строма паднятага над Лётарынгіяй. Гэта так званы масыў Ардэны, складзены з цьвёрдых лупнякоў. На ўсходзе ён пераходзіць ў Рэнскія Лупняковыя горы Нямеччыны, ад якіх адразьняецца адсутнасьцю вульканічных скал. Ардэны—неўраджайнае ўбогае ўзвышша з параўнаўча сьцюдзёным кліматам і значнай колькасьцю ападкаў, якія ўзімку выпадаюць у стане сьнегу. Вярхі Ардэнаў пакрыты толькі ўбогімі лугамі, гожымі хіба што на пашу авечкам; па схілах захавалася яшчэ досыць многа лясоў. Гарадоў тутака мала, люднасьць даволі рэдкая (на 1 кв. клм. прыпадае каля 40 ч.), галоўным заняткам яе зьяўляецца гадоўля жывёлы, пераважна авечак.

На поўнач ад Ардэнаў цягнецца глыбокая даліна, па якой цячэ рака Самбра і сярэдні Маас, у які Самбра ўліваецца. Даліна гэта мае вялікае гандлёвае значэньне, бо па ёй праходзіць найлепшая дарога з Парыжу ў Кэльн і Паўночную Нямеччыну. Аднак яшчэ важней тое, што па даліне

Самбры—Маасу цягнецца паласа багатых пакладаў каменнага вугалю. Тут раней, як ува ўсіх іншых месцах контынэнту Эўропы, пачалося здабываньне каменнага вугалю. З таго часу распрацавалі ўжо цалком вышэйшыя пласты яго пакладаў, але здабываньне вугалю не зьмяншаецца; толькі шахты ўразаюцца глыбей пад зямлю. Апрача вугалю тутака здабываецца многа жалезнай руды, знаходзяць цынк, волава і медзь. Паласа каменна-вугальных пакладаў ад вышняй Самбры цягнецца на захад у ваколіцы францускіх гарадоў Ліля, Рубэ і інш. Паўсюды ў паласе каменна-вугальных пакладаў мясцовыя насельнікі займаюцца нетракапальнай і фабрычнай прамысловасьцю. Буйныя прамысловыя гарады, дробныя фабрычныя пасёлкі, капальні, рудні і гуты чаргуюцца тут, як у Паўночна-Заходняй Ангельшчыне. Гушчыня залюдненьня тут надзвычайна вялікая (месцам дасягае да 1350 ч. на 1 кв. клм.).



Мал. 55.—Краявід у Бэльгіі.

Сярэдняя частка Бэльгійскай краіны ляжыць на поўнач ад паласы каменна-вугальных пакладаў між рэкамі Маасам і Шэльдай. Гэта ўзгаркаватая раўніна пакрыта вельмі ўраджайнымі гліністымі і суглінкавымі грунтамі. Клімат гэтага краю мякчэйшы, як у Ардэнах, дзякуючы большай блізкасьці да мора, але ападкаў тутака меней. (Чаму ў горах выпадае болей ападкаў, чымся на раўнінах?).

Горад Брусэль мае сярэдн. тэмп. году $+9{,}9^0$, студзеня $+2{,}0^0$, ліпеня $+18{,}0^0$, ападкаў у год 750 мілім.

Ядобны каштан тут сустракаецца ўжо рэдка, але ўсялякае збожжа, садовіна і гароднiна сьпеюць вельмі добра. Кожны кавалак зямлі старэнна вырабляецца, угнойваецца і дае вялікі зыск. Сельская гаспадарка стаіць тутака лепей, як у іншых мясцовасьцях Бэльгійскай краіны, але з прычыны блізкасьці багатых каменна-вугальных пакладаў і тут фабрычная прамысловасьць мае большую вагу. З расьлін, якія тутака засяваюцца, на першым месцы стаяць так званыя тэхнічныя расьліны, што даюць матар'ял, які апрацоўваецца на мясцовых фабрыках. Сюды належаць цукровыя буракі, лён, каноплі, цыкорыя, хмель, табака. Збожжа тутака, зразумела, не хапае, але бульбай, гароднінай і садовінай узгор'і Сярэдняй Бэльгіі сябе забясьпечваюць. Дзякуючы шчырай працы чалавека над паляпшэньнем грунтоў, нават бясплодныя калісь пескавыя куточкі (напрыклад, Кэмпэнская акруга на мяжы з Галяндыяй) перавярнуліся ў харошыя сады. Каля буйных гарадоў, напрыклад, каля Брусэлю, значныя прасторы знаходзяцца пад цяплiцамі пад шклом. Там выхоўваюць далікатныя паўднёвыя расьліны: ананасы, вінаграднік, розныя кветкі і г. д. Люднасьць Сярэдняй Бэльгіі жыве бязмальтаксама густа, як у паласе каменна-вугальных пакладаў. (Гушчыня залюдненьня дасягае 400 ч. на 1 кв. клм.). Па адхонных схілах тутэйшых узгоркаў, сярод ніў, адзеленых адна ад аднэй радочкамі жывых платоў, раскінуліся вялікія вёскі, харошыя дачныя месты, людныя фабрычныя гарады з старасьвецкімі будынкамі ратуш і сабораў.



Рака Шэльда аддзяляе ўзгор'і Сярэдняй Бэльгіі ад паўночна-заходняй часткі краіны, так званай Фляндрскай нізіны. Гэтая нізіна злучае Паўночна-Францускую нізіну з Паўночна-Гэрманскай і цягнецца ад пратокі Па-дэ-Кале ўдоўж берагоў Нямецкага мора да вусьцяў Шэльды. Фляндрыя ледзь уздымаецца над роўнем морскіх прыплываў, а месцам ляжыць нават ніжэй гэтага роўню. Мора каля берагоў Фляндрыі бурнае, хаця і плыткае; сваімі хвалямі яно заўсёды накідвае на бераг шмат пяску. Патроху з гэтага пяску павырасталі цэлыя паўзьбярэжныя груды—выдмы, якія перашкаджаюць, праўда, зносінам ураджайных мясцовасьцяй краіны з морам, але затое засланяюць Фляндрыю ад націску гэтага мора і затапленьня самых нізкіх яе куточкаў. Каб выдмы яшчэ лепей выконвалі гэтую работу, людзі ўмацавалі іх каменнымі брукамі і грэблямі, а каб вецер не выдмухаў з іх пясок і не засыпаў-бы гэтым пяском Фляндрскую нізіну, яны засаджваюцца хвоямі, травой—дзікім аўсом і іншымі расьлінамі. Клімат Фляндрыі яшчэ мякчэйшы, а грунты яшчэ лепшыя, як у Сярэдняй Бэльгіі. Раскошныя сады, засевы кветак і лёну, гароды і поплавы пакрываюць роўную Фляндрскую нізіну. Па поплавах, якія ніколі не пакрываюцца сьнегам, пасьвяць лепшую малочную жывёлу, каля мора займаюцца рыбацтвам.

Фабрычная прамысловасьць Фляндрыі грунтуецца на апрацоўцы мясцовай ільняніны і прывезенай з-за меж баваўны. Сучасны замежны гандаль карыстаецца прыстанямі, якія ляжаць каля глыбокіх лейкавідных вусьцяў рэк, бо адкрытае мора ня мае добрых буктаў. У апошнія часы ўвесь гандаль згуртаваўся каля вусьцяў Шэльды ў Антвэрпэне.

У сярэднія вякі мора ўразалася ў берагі Фляндрыі некалькімі затокамі, каля якіх існавалі багатыя гандлёвыя морскія прыстані. З цягам часу гэныя затокі засыпаліся адкладамі рэк,

мялелі і нарэшце перавярнуліся ў балотныя нізіны, якія цяпер ужо асушаны і зроблены сочнымі лугамі. Гарады каля дауных заток заняпалі.

Насяленьне Бэльгійскай краіны складаецца з двох народаў: флямандцаў, гэрманскага пахаджэньня, на поўначы, асабліва ўва Фляндрыі, і валёнцаў, кроўных француэам, на поўдні, пераважна ў Ардэнах. Ня гледзячы на пляменьневыя асаблівасьці, абодва гэтыя народы жывуць супольным жыцьцём ужо здаўна.

Варункі жыцьця прыблізна аднальковыя па ўсёй краіне. Вялізныя запасы вугалю і руды дазваляюць паўсюды пашыраць фабрычную прамысловасьць, паўсюды даюць магчымасьць жыць густому насяленьню. (Сярэдняя гушчыня залюдненьня ў краіне 270 ч. на 1 кв. клм., у нас у Менскай акрузе 58, а ў Мазыршчыне толькі 15). Паўсюды сельская гаспадарка мае меншую вагу, як фабрычная прамысловасьць; паўсюды большасьць насельнікаў жыве па гарадох, якія шпарка растуць, дзякуючы паступоваму пашырэньню іх гандлёва-прамысловай вагі. Фабрыкі і капальні вымагаюць многа працоўных рук і даюць добрыя заработкі.

З гэтай прычыны колькасьць люднасьці ў краіне хутка ўзрастае, а ўсяленьне чужаземцаў (іміграцыя) перавышае высяленьне мясцовых насельнікаў за межы краіны (эміграцыю). Густая сетка чыгунак і каналаў пакрывае Бэльгійскую краіну. З гэтага боку, паводле гушчыні і сеці штучных дарог, краіна займае першае месца на сьвеце. З гэтай прычыны, а таксама дзеля выгоднага географічнага палажэньня між Ангельшчынай, Францыяй і Нямеччынай, тут вельмі пашыраны як унутраны, гэтак і замежны гандаль. Вывозяць адгэтуль вырабы фабрычнай і нетракапальнай прамысловасьці, сюды прывозяць сырыну, збожжа, лес, колёніяльныя тавары.

Дзякуючы буйному разьвіцьцю прамысловасьці і гандлю, Бэльгійская краіна зрабілася аднэй з багацейшых капіталістычных краін. Аднак, як і ў Ангельшчыне, капіталы згуртаваліся пераважна ў руках нямногіх мільёнэраў, да якіх належаць фабрыкі і капальні і якія, апроч таго, зьмяшчаюць частку сваіх капіталаў за межамі ў прадпрыемствах Расіі, Украіны, Гішпаніі і іншых бедных капіталамі краёх. Побач з гэтым фабрычныя работнікі і вуглякопы жывуць у беднасьці і працуюць за маленькую плату.

Ужо многа дзесяцёхгодзьдзяў у краіне адбываецца ўпартае змаганьне паміж капіталістымі і работнікамі. Першым сваім заданьнем работнікі паставілі агульнае права выбараў у парлямэнт. Аднак забастоўкі бэльгійскіх работнікаў канчаліся перамогай капіталу. Прадстаўнікі Бэльгійскай Работніцкай Партыі ўвайшлі ў парлямэнт; змаганьне перайшло і туды, але да апошняга часу краінай кіравалі буржуазныя партыі. Праўда, цяпер у Бэльгіі ўжо ўведзена агульнае права выбараў, але становішча работнікаў мала палепшылася. У час вайны напад немцаў і іх уціск адцягнулі працоўны люд ад змаганьня з капіталізмам. Бэльгійскія соцыялістыя злучыліся з буржуазіяй для барацьбы з немцамі.



Расійская рэволюцыя і выхад Расіі з складу Антанты выклікалі абурэньне сярод бэльгійскіх соцыялістых. Усе яны зьяўляюцца ворагамі савецкага дзяржаўнага ладу. Аднак у 1920 г. і ў Бэльгіі ўтварылася компартыя, якая ўваходзіць у склад Комінтэрну і мае на мэце рашучую барацьбу з капіталам.

Ніжэйшая асьвета ў Бэльгіі стаіць ня вельмі высока. Няпісьменных яшчэ вельмі многа сярод працоўнай беднаты. Затое вышэйшая, асабліва-ж тэхнічная адукацыя мае вельмі добрае становішча. У бэльгійскіх унівэрсытэтах вучыцца шмат чужаземцаў. Бэльгійцы многа зрабілі ўва ўсіх галінах навукі і мастацтва. Бэльгійскія пісьменьнікі пракладаюць новыя шляхі ў поэзіі і могуць стаяць поплеч з найлепшымі пісьменьнікамі Ангельшчыны, Францыі і Нямеччыны.

Большая частка краіны (30440 кв. клм. з 7700 тыс. нас.) належыць да Бэльгійскай дзяржавы, у якой прыблізна пароўну флямандцаў і валёнцаў.

Гэтая дзяржава стварылася пасьля паўстаньня тубыльцаў у 1830 г. За межамі Эўропы да Бэльгіі належыць вялікая колёнія Конго (2414200 кв. клм. 15380000 нас.) у Афрыцы. Адтуль у Бэльгію прывозяць сланёвую косьць, каўчук і пальмавы алей.

Паўднёва-заходнія ўскрайкі краіны, у вадазборы вышняй Шэльды і вышняй Самбры, уваходзяць у склад Француэкай рэспублікі; паўднёва-усходні куток складае маленькае самастойнае гэрцогства Люксэмбург (2586 кв. клм. 270 тыс. н.), і паўночна-ўсходні куточак (Лімбург) належыць да Голяндыі.

Гарады Бэльгійскай краіны згуртаваліся ў асабліва вялікай колькасьці ў паласе каменна-вугальных пакладаў.

Там, у даліне Маасу у багатай на вугаль, жалеза і цынк акрузе ляжыць багаты бэльгійскі горад *Льеж* (165 тыс. нас.) з фабрыкамі машын, зброі і іншых мэталёвых вырабаў.

У адным з прадмесьцяў (Гэршталі) знаходзяцца ўнівэрсытэт і вышэйшая тэхнічная школа, дзякуючы якім Льеж лічыцца адным з галоўных культурных асяродкаў краіны.

Заходняя частка паласы каменна-вугальных пакладаў належыць да Францыі. Там знаходзіцца і галоўная прамысловая акруга Француэкай дзяржавы, слынная апрацоўкай ільняніны, мэталаў, скуры, вырабам хімічных продуктаў і г. д. Унівэрсытэцкі горад *Ліль* (201000 нас. у 1921 г.), багатае прамысловае места *Рубэ* (113000 н.), *Туркуэн* (79000 н.) і шэраг іншых драбнейшых местаў бязмаль-што зусім зьліліся тут у адзін бяскрайна вялікі горад, у бясконцае згуртаваньне фабрык, рудняў і капальняў.

У сярэдняй узгаркаватай Бэльгіі на скрыжаваньні галоўных чыгуначных і штучных вадзяных дарог краіны ляжыць сталіца Бэльгійскага каралеўства *Брусэль* (685 тыс. насельнікаў).

Гэта галоўны асяродак унутранога гандлю краіны, важны прамысловы і культурны горад. Мясцовыя фабрыкі вырабляюць анталяжы, дываны, спрат і калёсы. Тут аж 2 унівэрсытэты, багата музэяў, навуковых і мастацкіх устаноў. Горад ляжыць на мяжы прастораў, залюдненых флямандцамі і валёнцамі. Самы горад складаецца з дзьвёх частак: на ўзгорку жывуць валёнцы, на раўніне пад узгоркам—флямандцы. Прыгожыя сучасныя і старасьвецкія будынкі, шырокія шыкоўныя вуліцы, харошыя схілы ўзгорку, багатыя экіпажы і самаходы на вуліцах дадаюць гораду зграбнасьць і хараство.

На ўсход ад сталіцы ляжыць ціхамірны гарадок *Лювэн* (39000 н.) з багатым унівэрсытэтам, слынная бібліотэка якога была зьнішчана ў час вайны 1914-18 г.

Ля вусьцяў Шэльды, ужо ў нізіннай частцы Бэльгіі, ляжыць *Антвэрпэн* (або Анвэр, 334 тыс. нас.), праз які вывозяць блізка што ўсе тавары Бэльгіі і значную частку лётарынгскага жалеза. Хаця гэты горад ляжыць досыць далёка ад мора, але ў час морскіх прыплываў сюды па Шэльдзе могуць прыплываць самыя вялікія морскія караблі. Маючы за сабой адну з багацейшых краін Эўропы, Антвэрпэн зьяўляецца аднэй з першых прыстаняй Эўропэйскага контынэнту. Толькі Гамбург (ня лічачы ангельскіх прыстаняй), галоўная прыстань Нямеччыны, перавышае яго па сваіх гандлёвых абаротах. (Гандлёвы абарот Антвэрпэну перад вайной дасягаў 2180 міл. р. золатам).

Вышэй на Шэльцзе ляжыць *Гэнт* (166 тыс. нас.), культурны (унівэрсытэт) і прамысловы асяродок Фляндрскай нізіны.

Тут апрацоўваюць бавоўну, што прывозіцца праз Антвэрпэн, і лён, галоўную культурную расьліну Фляндрыі.

На захад ад Гэнту знаходзіцца *Бруге* (54000 н.), які быў асяродкам сусьветнага гандлю ў сярэднія вякі, калі да яго даходзілі морскія затокі. Цяпер гэта невялікі горад з вырабам анталяжаў і ільняніны.

Па-за выдмамі каля самага Нямецкага мора ляжыць *Остэндэ* (48000 н.), купальнае места і месца пераправы пасажыраў з Бэльгіі ў Ангельшчыну.

Такое-ж значэньне маюць францускія гарады: *Дюнкэрс* або Дюнкірхэн (55000 н.) з флямандзкай люднасьцю, *Кале* (73000 н.) і *Булёнь-сюр-Мэр* (55000 н.). Кале вядзе асабліва бойкія зносіны з ангельскім горадам Дуўрам праз пратоку Па-дэ-Кале.

Як Кале, гэтак і Булёнь добра ўмацованы і мелі вялікую вагу ў час сусьветнай вайны 1914-18 г., як месцы высадкі ангельскіх войск на контынэнт Эўропы.



# Гэрманія*).

(Азнач географічнае палажэньне. Назаві, якія моры і пратокі абцякаюць Гэрманію з поўначы. Якія астравы ляжаць каля яе берагоў? Якія староны мяжуюцца з Гэрманіяй на захадзе і на поўдні?).

Францускя старана на ўсходзе пакрысе, няпрыметна, пераходзіць у гэрманскую старану.

Паводле будовы сваёй паверхні, гэтая апошняя складаецца з дзьвёх частак. На поўначы яе з захаду на ўсход удоўж берагоў Нямецкага і Балтыцкага мораў цягнецца Паўночна-Гэрманская нізіна, якая зьяўляецца працягам нізін Паўночнай Францыі і Фляндрыі. Споднія пласты земных парод гэтай нізіны зморшчаныя, як у зморшчавых горах, а павярхоўныя ляжаць паземна. Гэта тлумачыцца тым, што калісь Паўночна-Гэрманская нізіна была горным краем, але горы яе ўжо даўно былі зьнішчаны шматвяковым выпятрэньнем і некалькі разоў заліваліся морам, адклады якога зраўнялі няроўнасьці краю. Сучасны свой выгляд Паўночна-Гэрманская нізіна атрымала ў ледавіковы пэрыод, калі яе заваліў морэнамі даўна-эўропэйскі ледавік. Цяпер гэта ўзгаркаватая або хвалістая раўніна, падобная да Паўночнай Беларусі.

Паўднёвая Гэрманія зьяўляецца і цяпер горным краем і можа лічыцца працягам Усходняй Францыі. Як і там, горставыя горы тут чаргуюцца з катлінамі, плоскаўзвышшамі і прыгожымі глыбокімі далінамі рэк. Ледавіковыя адклады сустракаюцца і ў Паўднёвай Гэрманіі, але там яны не пакрываюць скрозь усёй прасторы, як на поўначы, а трапляюцца толькі асобнымі астравочкамі па найболей значных горах.

Ня гледзячы на вялікую розьніцу між Паўночнай і Паўднёвай Гэрманіяй, яны разам могуць лічыцца за адну географічную старану. Гэрманскія горы маюць адхонныя схілы і не перашкаджаюць зносінам паміж асобнымі часткамі гэтай стараны, а вялікія поўнаводныя рэкі, што пачынаюцца ў паўднёва-гэрманскіх горах і цякуць адтуль на поўнач, зьяўляюцца найлепшымі дарогамі, якія злучаюць усю старану ў адну неразрыўную географічную адзінку. Усе значныя рэкі Гэрманіі злучаны паміж сабой каналамі, так што ствараюць адну цэлую сецьвадзяных дарог. (Перагледзі па карце назовы рэк Гэрманіі).

Рэкі Гэрманіі, як відаць, утварыліся раней, чым паверхня атрымала свой сучасны выгляд. У глыбокіх і вузкіх далінах гэтыя рэкі пераразаюць магутныя горставыя горы, і хаця Сярэдняя Гэрманія, агулом кажучы, вышэй за самую паўднёвую, але рэкі цякуць з апошняй у першую. Мусіць быць, спачатку найвышэйшыя горы існавалі на крайнім поўдні, і рэкі сьцякалі з гэтых гор на поўнач. Калі пачалі ўтварацца горы Сярэдняй Гэрманіі, рэкі пакрысе ўразаліся ў іх і прабілі праз іх глыбокія даліны.

*) Пад словам „Гэрманія“ мы будзем тутака разумець географічную старану, а пад словам „Нямеччына“ будзем разумець дзяржаву. Большая частка Нямеччыны ўваходзіць у склад Гэрманіі, але апрача таго ў Гэрманіі ляжыць Голяндыя і Данія. З другога боку ў склад Нямецкай дзяржавы, апрача некаторых краін Гэрманіі, уваходзіць Усходняя Прусія, што ляжыць у Прыбалтыцкім краі.

Клімат Гэрманіі болей аднастайны, чымся клімат Францыі.

Гэта між іншым тлумачыцца тым, што Паўднёвая Гэрманія вышэй за Пауночную. Лежачы вышэй, яна мусіць мець ніжэйшую тэмпэратуру, чым можна было-б чакаць паводле географічнай шырыні.

Параўнаўча з кліматам Францыі клімат Гэрманіі значна халаднейшы.

Сярэдняя гадавая тэмпэратура тут віхаецца між $+7^{0}$ і $+10^{0}$, сярэдняя тэмпэратура студзеня—паміж $+2^{0}$ на захадзе і—$2^{0}$ на ўсходзе.

Маразы здараюцца ў Гэрманіі паўсюды, хаця нідзе ня бываюць трывалымі. Улетку тут ніколі ня бывае залішне гарачых дзён з сярэдняй тэмпэратурай начадзеньня вышэй за $+20^{0}$. Хіба толькі ў грабэнах на крайнім поўдні часамі здараецца такая сьпякота. Паводле колькасьці ападкаў Гэрманія мала розьніцца ад Францыі. (Тутака на раўнінах выпадае каля 500—800 мілім. дажджу і сьнегу). Толькі ў горах ападкаў занадта многа (да 1700 м.). Ясныя дні тут бываюць радзей, як у Францыі, але наагул клімат здаровы і карысны; тут ня бывае такіх рэзкіх зьмен сьпякоты і сьцюжы, як на ўсходзе Эўропы, але й няма тэй церазьмернай вільгатнасьці, якая пануе на ўзьбярэжжах Атлянтыкі.


Мал. 56.—Дубовы лес у Гэрманіі.

Гэрманія належыць да пасу мяшаных лясоў. Калісь тут пераважвалі ліставыя дрэвы: бук, дуб і іншыя, побач з якімі трапляліся елкі, хвоі, ельніцы, мадрыны. У апошнія часы ў залежнасьці ад штучнай гадоўлі лясоў склад іх зьмяніўся. Іглястыя дрэвы пачынаюць пераважваць над ліставымі. Параўнаўча з Францыяй, а тым болей з Ангельшчынай, тут захавалася яшчэ шмат лясоў (каля 26% усёй плошчы), і яны граюць значную ролю ў гаспадарцы. Далікатныя расьліны Францыі, напрыклад, ядобны каштан, у Гэрманскай стронцы ўжо не растуць. (Ядобны каштан сустракаецца хіба-што на крайнім паўднёвым захадзе ды й то толькі асобнымі дрэвамі). Дзякуючы мернаму клімату і роўнаму разьмеркаваньню ападкаў па порах году, расьліннасьць ад раньняй вясны да позьняй восені сьвежая, зялёная, вясёлая, прыемная для вока.



З культурных расьлін на першы плян выходзяць жыта, авёс, бульба, якія даюць тутака добрыя ўраджаі нават на кепскіх грунтох, бо гэрманцы ўмеюць добра гнаіць зямлю, карыстаючыся як штучнымі, гэтак і прыроднымі гнаямі. Пшаніца, кіяхі і вінаграднік, якія зьяўляюцца галоўнымі расьлінамі Францыі, тут растуць горай і сеюцца пераважна на поўдні. Затое цукровых буракоў тут сеюць яшчэ болей, як у Францыі; тут раней як-дзе навучыліся здабываць з іх цукер, і па вырабе цукру Гэрманія займае першае месца ў сьвеце. Вялікія прасторы засяваюцца лёнам, каноплямі, табакай, хмелем і г. д. і, як заўсёды пры палепшаных спосабах гаспадаркі, значны процант ральлі займаюць засевы кармавых расьлін: канюшыны, вікі, кармавых буракоў і г. д. З гэтай прычыны добрае становішча мае і гадоўля жывёлы самых лепшых гатункаў.

Кароў трымаюць месцам ня толькі дзеля гною і малака, але і запрагаюць у плуг, у калёсы, у барану, як коней або валоў.

Па колькасьці сьвіней Гэрманія займае першае месца ў Эўропе, бо і бульбы, якой іх жывяць, тут зьбіраюць болей, як ува ўсіх іншых старонах зямлі.

Наагул усе галіны сельскай гаспадаркі маюць добрае становішча, але на спажыву вельмі густога насяленьня краю мясцовых спажыўных продуктаў не хапае. Збожжа купляецца за межамі, а большасьць мясцовых насельнікаў здабывае сродкі да жыцьця ад нетракапальнай і фабрычнай прамысловасьці. У адзнаку ад суседніх старон, Францыі і Польшчы, Гэрманія—старонка пераважна прамысловая, а ня сельска-гаспадарчая. Сярэдня-Гэрманскія горы адзначаюцца найбагацейшымі пакладамі карысных мінэралаў. Па колькасьці здабыванага каменнага вугалю Гэрманская старонка займае першае месца на Эўропэйскім контынэнце і на ўсім сьвеце, адстае толькі ад Злучаных Штатаў і Брытанскіх астравоў. Па здабываньні жалезнай руды Гэрманская старана таксама адна з найбагацейшых, а па колькасьці цынку займае першае месца ў Эўропе. Апрача таго, тутака здабываюць шмат медзі, волава, солі, знаходзяць нават серабра болей, як дзе ў Эўропе. На вялізным багацьці вугалю й жалеза грунтуецца буйная фабрычная прамысловасьць краю. Болей за ўсё тут вырабляецца жалезных і хімічных тавараў, дужа добра стаяць баваўняная і ваўняная прамысловасьць, выраб вопраткі, скуры, паперы, цукру і г. д. Дзякуючы сваёй таннасьці і спрытнасьці гэрманскіх гандляроў, тутэйшыя вырабы пакрысе пачалі выціскаць нават Ангельшчыну з сусьветнага рынку.

Гэрманскія гандляры аб'яжджалі амаль-што ўсе краіны зямлі, даведваліся аб патрэбах насельнікаў тых краін і потым на сваёй бацькаўшчыне выраблялі тое, чаго шукалі чужаземныя пакупцы. Такім спосабам пашыраўся і гандаль старонкі, які тут цесна зьвязаны з фабрычнай прамысловасьцю. Галоўныя гандлёвыя гэрманскія фірмы маюць свае фабрыкі і, наадварот, буйныя фабрыканты маюць сваіх гандлёвых агэнтаў за межамі бязмаль па ўсіх старонках сьвету.

Перад сусьветнай вайной 1914 г. толькі Вялікабрытанія перавышала Гэрманію паводле свайго гандлю. Толькі пасьля вайны перамога Ангельшчыны і яе саюзьнікаў над Нямеччынай затрымала разьвіцьцё гэрманскага гандлю.

Лежачы ў асяродку Заходняй Эўропы, Гэрманская старана здаўна зрабілася багатым гандлёвым краем. Росквіт гэрманскага гандлю прыпадае на тыя часы, калі да агульна-эўропэйскай культуры далучыліся ўсходня-эўропэйскія народы. Гэрманія зрабілася тады пасярэдніцай у гандлёвых зносінах высока-культурных Італіі і Францыі з параўнаўча мала культурнымі Польшчай, Полаччынай (Беларусьсю), Кіеўшчынай (Украінай) і Ноўгарадам. Гэрманскія гандлёвыя гарады злучыліся тады ў так званы Ганзэйскі хаўрус, які трымаў у сваіх руках увесь гандаль на Балтыцкім моры і ўва ўсёй Сярэдняй Эўропе. Ад часу вынаходкі Амэрыкі ўвагу эўропэйцаў перацягнуў да сябе Новы Сьвет; на чале эўропэйскіх дзяржаў апынуліся тыя, што ляжалі бліжэй да Атлянтыкі, а Гэрманская старана заняпала. Толькі ў XIX веку пачаўся новы пэрыод красаваньня гэрманскага гандлю. Гандлёвую вагу набылі тыя краі, у якіх знайшлося шмат пакладаў вугалю і жалеза, у якіх магла стварыцца буйная фабрычная прамысловасьць. Гэрманская старана была такім прамысловым краем і захапіла ў свае рукі між‘эўропэйскі гандаль.

Разьвіцьцё гандлю і прамысловасьці ў Гэрманіі вымагалі многа працоўных рук. З гэтай прычыны ў XX веку значна зьменшылася высяленьне гэрманцаў за межы роднага краю. Даўней з Гэрманіі што-год выяжджала ў Амэрыку па некалькі сот тысяч чалавек, якія не маглі знайсьці на бацькаўшчыне працы і заработкаў. У апошнія гады выяжджае ў Амэрыку толькі па некалькі дзесяткаў тысяч людзей у год.

Насельнікі Гэрманіі пераважна бялявыя, высокія, сьветласкурыя і сьветлавокія, належаць да гэрманскіх народаў. На поўначы, на паўвостраве Ютляндыя і суседніх астравох, жывуць даньцы, якіх далучаюць да скандынаўскай галіны гэрманскага племя; у рэшце старонкі жывуць немцы, сярод якіх адразьняюць: 1) паўднёвых або вышніх немцаў, родзічаў швайцарскіх і аўстрыйскіх; 2) сярэдніх немцаў, мова якіх зрабілася агульна-нямецкай пісьменнай мовай і 3) паўночных, або ніжніх немцаў, якія жывуць на Паўночна-Гэрманскай нізіне за выключэньнем Ютляндыі.

Да паўночных немцаў належаць між іншым і голяндцы, насельнікі дэльты Рэну, якія на сваёй гаворцы стварылі асобную багатую літаратуру і дзеля таго лічацца асобным народам.

Апроч таго, у Сярэдняй Нямеччыне ў ваколіцах места Бауцэн (Будзішын) жыве асобны славянскі народ—сэрбы-лужычане, або вэнды, на мове якіх гаворыць каля 100000 чалавек.

Быў час, калі славянскія пляменьні (палабскія славяне, што жылі каля р. Лабы або Эльбы, паморы, што залюднялі паўднёвае ўзьбярэжжа Балтыцкага мора і іншыя) жылі па ўсёй Усходняй Гэрманіі. З часам немцы заўладалі іх зямлёй і анямечылі іх, але й да сяго часу самі ўсходнія немцы маюць шмат супольнага з славянамі і ў абліччы і ў звычаях. Наадварот, паўднёва-заходнія немцы маюць многа кельцкай крыві, бо на паўднёвым-захадзе Гэрманіі даўней жылі кельцкія пляменьні.



Немцы вельмі здатныя і працаздольныя людзі. Упартасьць у працы, ахайнасьць, акуратнасьць, уменьне разьмеркаваць свой час, вытрыманасьць—вось галоўныя ўласьцівасьці нямецкага народу. Хаўрусы, таварыствы, гурткі шырока распаўсюджыліся і граюць вялікую ролю ў Нямеччыне. У гэтых таварыствах выяўляецца вялікая прыхільнасьць нямецкага народу да грамадзянскай працы. Сталасьць і працавітасьць немцаў выяўляецца і ў навуцы, дзе немцы далі асабліва многа сваіх прадстаўнікоў ува ўсіх галінах веды.

Асьвета сярод немцаў стаіць надзвычайна высока. Няпісьменных тут няма, пачатковае навучаньне абавязковае і агульнае. Па ліку унівэрсытэтаў Гэрманія займае першае месца ў Эўропе. Сусьветнай славай карыстаюцца нямецкія вышэйшыя тэхнічныя школы. Вельмі высока стаіць там і друк, і па колькасьці друкаваных выданьняў з гэрманскай стараной ня можа спрачацца ніводная старонка Эўропы.

За выключэньнем Ютляндыі, якая разам з суседнімі астравамі складае Даньскае каралеўства, і вусьцяў Рэну, у якіх утварылася Голяндзкая дзяржава, рэшта Гэрманскай стараны належыць да Нямецкае рэспублікі (469.000 кв. клм., 59.700.000 насельн.). Нямецкая рэспубліка лічыцца фэдэрацыйнай або саюзнай і складаецца з 18 асобных дзяржаў, з якіх кожная мае свой ўрад і свае мясцовыя законы. Аднак мясцовыя законы ня могуць ісьці супроць агульна-дзяржаўных, і саюзны ўрад мае права мяшацца ўва ўнутраныя справы кожнай малой дзяржавы. Паміж саюзнымі дзяржавамі няма поўнай роўнасьці. Фактычна ў Нямеччыне пануе адна з саюзных дзяржаў—Прусія, да якой належыць большая частка Нямецкае рэспублікі. Усе іншыя дзяржавы ў большай ці меншай меры залежаць ад Прусіі. Саюзны ўрад разьвязвае галоўныя пытаньні замежнай і ўнутраной палітыкі, юстыцыі, фабрычнага права і г. д. На чале Нямеччыны стаяць рэйхстаг або парлямэнт, абіраны ўсім насельніцтвам, і дзяржаўная рада, складзеная з прадстаўнікоў асобных дзяржаў.

Да вайны Нямеччына была саюзнай монархіяй, у склад якой уваходзіла 26 саюзных дзяржаў, кожная з якіх мела на чале свайго караля або гэрцога. Аднак кароль Прусіі быў адначасна імпэратарам усёй Нямеччыны. Нямеччына перад вайной была аднэй з наймагутнейшых дзяржаў сьвету. Да яе належалі вялізныя колёніі ў Афрыцы і Акіяніі; шмат якія заэўропэйскія дзяржавы знаходзіліся пад нямецкім уплывам. У самай Эўропе ўладаньні Нямеччыны былі значна большымі, чымся цяпер: да ея належалі Альзас і Ўсходняя Лётарынгія, якія цяпер адышлі да Францыі, і вялікая частка сучаснай Польшчы (Познань, Заходняя Прусія, частка Горнага Шлёнзку). Магутнае разьвіцьцё нямецкай прамысловасьці дазволіла гэтай дзяржаве ўзбраяцца лепш за Францыю або Расію.

Узрастаньне нямецкай магутнасьці непакоіла ўсіх яе суседзяў, якія з свайго боку ўзбраяліся бясконца. У 1914 г. выбухнула вайна, у час якой Нямеччына адначасна змагалася з Расіяй, Францыяй, Ангельшчынай, Італіяй і нават мела часовую перамогу над імі. Толькі тады, як да ворагаў Нямеччыны далучылася самая багатая прамысловая дзяржава сьвету Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі, Нямеччына паддалася і згадзілася на мір, на падставе якога саюзьнікі адабралі ад Нямеччыны ўсю зброю, большую частку яе флёту, шмат цягнікоў і вагонаў. Нямеччыну пазбавілі ўсіх заморскіх колёній, ад Нямеччыны забралі багатую вугалем Саарскую акругу, а апрача таго на шматгадовы тэрмін окупавалі ўсю Зарэнскую яе частку, слынную буйной фабрычнай прамысловасьцю. Цяжар так званых рэпарацый, або контрыбуцый, якія мусіць заплаціць пераможцам Нямеччына, лёг галоўным чынам на працоўны люд дзяржавы. Капіталістыя зьменшылі ў некалькі разоў заработную плату работнікам, так што тыя цяпер ня могуць зарабіць нават на патрэбную для жыцьця колькасьць хлеба. Праўда, пасьля вайны стары нямецкі ўрад быў скінуты, але на яго месцы апынуўся ўрад, які не адмяніў прыватнай уласнасьці. Як і даўней, фабрыкі належаць да капіталістых. Капіталістыя нават яшчэ ўзмацніліся пасьля вайны і згуртаваліся ў шэраг новых аб'яднаньняў—трэстаў, каб лягчэй змагацца з работніцкім рухам. З свайго боку работнікі шчыльней злучаюцца пад сьцягам профэсыянальных саюзаў. З 1913 да 1921 г. лік работнікаў, згуртованых у профсаюзах Нямеччыны, павялічыўся з 4513 тыс. да 12798 тыс. Нямецкія профсаюзы пачалі ўтварацца з 1848 г., але ўжо з самага пачатку ў іх аказаліся 3 кірункі: чыста марксыцкі, згодніцкі і буржуазны Некаторыя профсаюзы сумысьня ўтвараліся буржуазіяй, каб затрымаць чыста клясавы работніцкі рух. Так, царква ўзялася за організацыю веруючых работнікаў у асобныя хрысьцянскія профсаюзы. Большасьць работнікаў Нямеччыны імкнулася аднак да так званых незалежных профсаюзаў, хаця і там правадыры былі вельмі асьцярожнымі ў барацьбе з капіталам. У працягу апошніх гадоў некалькі разоў правадыры профсаюзаў дапамаглі ўраду спыніць забастоўкі, накірованыя супроць дарагоўлі. А тымчасам дарагоўля расьце, і заработная плата ў параўнаньні з каштоўнасьцю продуктаў хутка зьмяншаецца, так што цяпер нямецкі работнік за адну і тую самую працу зарабляе ў 10 разоў меней за амэрыканскага. Нястойкасьць правадыроў выклікала вострае змаганьне паміж работніцкімі партыямі ў самых профсаюзах. Правадыры належаць пераважна да так званай соцыял-дэмократычный партыі Нямеччыны. Партыя гэтая пакуль-што самая моцная ў Нямеччыне і ў 1921 г. мела 1221000 членаў. Пад яе ўплывам знаходзіцца нямецкі ўрад, і яна імкнецца запэўніць работнікаў у тым, што дэмократычная рэспубліка без грамадзянскай вайны давядзе Нямеччыну да соцыялізму. Партыя ўваходзіць у склад II Інтэрнацыяналу і ўпарта змагаецца з комунізмам. Процівагай ёй зьяўляецца комуністычная партыя Нямеччыны, якая ўваходзіць у склад III Інтэрнацыяналу і даводзіць патрэбнасьць утварэньня ў Нямеччыне работніцка-сялянскага ўраду. Ком. Партыя Нямеччыны налічвала ў 1921 г. 360000 членаў, але ўплыў яе сярод работнікаў бязупынна ўзрастае. Ёсьць у Нямеччыне яшчэ адна работніцкая партыя—„Комуністычная Працоўная“, якая лічыць патрэбным выйсьці зусім з профсаюзаў і адмовіцца ад удзелу ў парлямэнцкіх выбарах, на што не згаджаецца Ком. Партыя Нямеччыны. Барацьба соцыял-дэмакратаў і комуністых у Нямеччыне набыла вельмі востры характар. Капіталістычныя дзяржавы Антанты падтрымліваюць соц.-дэм., баючыся, каб Нямеччына не зрабілася Савецкай, не адмовілася ад уплаты рэпарацыяў і не працягнула рукі СССР.



Да Нямецкай дзяржавы апроч большай часткі Гэрманскай стараны належыць яшчэ Ўсходняя Прусія, якая ляжыць у Прыбалтыцкім краі ў вадазборы р. Прэгеля.

З самай Гэрманіяй мы пазнаёмімся падрабязьней, падзяліўшы яе на 6 краін: 1) Данію, 2) Голяндыю, 3) Паўночна-Заходнюю Нямеччыну, 4) Паўночна-Ўсходнюю, 5) Сярэднюю і 6) Паўднёвую.

**Данія,** самая паўночная з краін Гэрманскай стараны, абымае паўвостраў Ютляндыю на поўнач ад Фленсбургскай затокі і згуртаваньне астравоў, што ляжыць між Ютляндыяй і Скандынавіяй на дарозе з Нямецкага мора ў Балтыцкае. (Пераглядзі па карце назовы галоўных астравоў Даньскай краіны, назаві пратокі, якія аддзяляюць гэтыя астравы адзін ад аднаго і ад контынэнту).

Як частка Паўночна-Гэрманскай нізіны, Данія адзначаецца роўнай паверхняй, пакрытай грубым пластом ледавіковага навалу. Месцам (напрыклад, ува ўсходняй часткі вострава Зэлянд) з-пад ледавіковых глін, пяскоў і каменьня высоўваюцца на паверхню пласты чыстай белай крэйды, якая зьяўляецца галоўным падземным багацьцем краіны, бо жалеза і вугалю тут няма.

Грунты ўсходняй паловы Ютляндыі і Даньскага згуртаваньня астравоў складаюцца з ураджайных ледавіковых глін, на якіх багатыя нівы й сенажаці чаргуюцца з прыгожымі цёмнымі букавымі лясамі. Ледавіковы навал адклаўся тутака ў стане прыгожых узгоркаў і грудоў, сярод якіх утварыліся рознастайныя ледавіковыя вазёры. З усходу ў Ютляндыю ўразаюцца глыбокія вузкія затокі—так званыя фёрды (напр., Фленсбургскі), выгодныя для прыстою караблёў. Найвялікшы з гэтых фёрдаў—Лімфёрд—наскрозь пераразае паўвостраў і даходзіць да Нямецкага мора. Аднак заходняе выйсьце Лімфёрду часта завальваецца пяском, дзеля чаго ён і завецца фёрдам, затокай, а не пратокай.

Заходняя палова Ютляндыі адзначаецца нудным аднатонным краявідам, надзвычайнай роўнасьцю, пескавымі, неўраджайнымі грунтамі, панаваньнем імшараў і ўбогай расьліннасьцю. Нямецкае мора і Скагерак каля берагоў заходняй Ютляндыі няглыбокія, пескаватыя і бурныя. Паўзьбярэжныя хвалі накідваюць тут на бераг шмат пескавых выдмаў, якія цягнуцца вузкай істужкай удоўж усяго берагу. Нізіннае сухазем'е па-за выдмамі паволі, няпрыметна апускаецца і месцам зрабілася ніжэй роўня

мора, так што мора, часамі прабіваючыся праз выдмы, залівае значныя сухаземныя прасторы. Так утварыліся плыткія і шырокія затокі—так званыя гафы, аддзеленыя ад адкрытага мора валам выдмаў. На поўдні выдмы зусім адарваліся ад сухазем'я і перавярнуліся ў шэраг астраўкоў (Паўночна-Фрызляндзкіх).

Лежачы значна далей на поўнач, як усе іншыя краіны Гэрманскай стараны, Данія мае і халаднейшы клімат. Праўда, блізкасьць мора зьмяншае зімовую сьцюжу, і значных маразоў тут ня бывае, але ўлетку тут замала сьвятла і цяплыні, так што звычайнае дрэва нашай бацькаўшчыны елка, якая добра расьце паўсюды ў Нямеччыне, тутака расьці ня можа.

У горадзе Копэнгагене, на востраве Зэлянд, сярэдн. тэмп. году+7,5, сяр. тэмп. самага халоднага месяца лютага—0,1°, самага цёплага ліпеня+16,4°. Ападкаў тамака выпадае штогод 560 мілім.

Люднасьць краіны складаецца пераважна з даньцаў. Гэта здольны, працавіты і культурны народ. Няпісьменных сярод іх вельмі мала; па скančэньні пачатковай школы большасьць мае магчымасьць папоўніць сваю асьвету ў так званых вышэйшых народных школах. Сялянства тут жыве замажней, як ува Францыі або ў суседняй Нямеччыне, лепей за нашую дробную шляхту. Наагул народнае багацьце разьмяркована роўна паміж насельнікамі. Асновай народнага дабрабыту зьяўляецца гадоўля жывёлы. Асабліва дбаюць даньцы аб разьвіцьці малачарства. (Значную ролю ў разьвіцьці малачарства граюць у Даніі малочныя коопэратывы). На кожны квадратны кілёмэтр прыпадае тутака 46 штук малочнага быдла (у нас на Беларусі толькі 11). Па колькасьці сьвіней, параўнаўча з прасторай, Данія займае першае месца на сьвеце. Зразумела, што найлепшыя ўмовы для свайго разьвіцьця знаходзіць гадоўля жывёлы на болей ураджайным усходзе. На захадзе па скудных пескаватых лугох трымаюць галоўным чынам дробную жывёлу—авечак і коз. Продукты гадоўлі жывёлы: мяса, масла, яечкі хатніх птушак складаюць галоўны тавар, якім гандлюе краіна. Ральніцтва грае другарадную ролю. Лугі займаюць бязмаль столькі прасторы, як і нівы, дый на полі сеюць больш такія расьліны, якія ідуць на страву жывёле: авёс, ячмень, кармавыя травы, бульбу. Пшаніцы і жыта сеюць мала, і збожжа купляюць за межамі. Сеюць цукровыя буракі і вырабляюць многа цукру. На ўзьбярэжжах даньцы займаюцца апрача таго рыбацтвам. З прычыны адсутнасьці вугалю і жалеза фабрычная прамысловасьць стаіць нявысока. Апрацоўваюцца галоўным чынам продукты гадоўлі жывёлы і наагул сельскай гаспадаркі: вырабляюць пальчаткі, піва, гарэлку, цукер і г. д. Фабрыкі карыстаюцца прывезеным з-за межаў апалам.

Палажэньне краіны на сухаземнай дарозе з Нямеччыны ў Скандынавію і на морскім шляху з Балтыцкага мора ў акіян з даўных часоў дапамагала разьвіцьцю даньскага гандлю і ўзрастаньню магутнасьці ўтворанай тут Даньскай дзяржавы. У канцы сярэдніх вякоў Даньская дзяржава ўладала ўсім Скандынаўскім паўвостравам і была галоўнай дзяржавай Паўночнай Эўропы. У 1658 г. ад яе адарваліся апошнія часткі Швэдзіі, у 1814—Норвэгія, насельнікі якой і цяпер гавораць на аднэй мове з даньцамі. Аканчальна страціла сваю вагу Даньская дзяржава ў 1864 г., калі немцы адваявалі ад яе паўднёвую частку Ютляндыі, так званы Шлезвіг-Гольштэйн. Пасьля сусьветнай вайны 1914—18 г. частка Шлезвігу зноў злучылася з Даніяй.



Сучасная Даньская дзяржава зьяўляецца констытуцыйным каралеўствам і ўладае апрача Даньскай краіны вострава Борнгольмам, які ляжыць далей на ўсход у Балтыцкім моры каля берагоў Швэдзіі, і Фарэрскімі астравамі. (Эўропэйскія ўладаньні Даньскага каралеўства абымаюць 44400 кв. клм. і налічваюць 3290000 насельнікаў). Апрача таго, даньскага караля прызнае Ісьляндыя. У Амэрыцы да Даніі належыць востраў Грэнляндыя (вольныя ад вечнага лёду прасторы Грэнляндыі абымаюць 89500 кв. клм. і маюць 33100 сталых насельнікаў).



Мал. 57.—Копэнгаген.

Улада даньскага караля абмяжована парлямэнтам, у якім пануе партыя сялян—сераднякоў. Работніцкай партыяй зьяўляецца соцыял-дэмократычная, якая кіруе профэсыянальным рухам. Даньскія профсаюзы ў час вайны былі ворагамі мілітарызму, а пасьля вайны выявілі імкненьне да аднаўленьня зносін з СССР.

У час забастовак 1921 г., накірованых супроць паніжэньня заработнай платы, профсаюзы былі аднак інэртнымі. З гэтай прычыны ў апошнія часы пачала ўзмацняцца болей энэргічная работніцкая партыя—комуністычная.

Сталіца Даньскага каралеўства *Копэнгаген* (з прадм. 666 тыс. нас.) ляжыць на востр. Зэлянд каля Зунду, самай важнай з пратокаў між Балтыцкім морам і Катэгатам. Тут згуртаваліся галоўныя культурныя ўстановы (унівэрсытэт, музэі, бібліотэкі) і фабрыкі краіны (цукраварні, фабрыкі жалезных прылад, парцаляну, мастацкіх вырабаў і г. д.). У сваіх руках Копэнгаген трымае большую частку замежнага гандлю Даніі.

**Голяндыя** займае самую заходнюю частку Паўночна-Гэрманскай нізіны і зьяўляецца беспасрэдным працягам Фляндрыі. У склад Голяндыі ўваходзяць вусьці Рэну і Маасу, а таксама Фрызляндыя, што цягнецца па ўзьбярэжжы Нямецкага мора ад затокі Зюдэрзэ да вусьця ракі Вэзэр.

Па берагох гэтай краіны морскія хвалі панакідалі такія самыя пескавыя груды выдмаў, як ува Фляндрыі або ў Заходняй Ютляндыі. Месцам гэтыя выдмы тут дасягаюць 60 мэтраў увышкі і каля 5 кілёмэтраў ушыркі. Сухазем'е па-за выдмамі складаецца з так званых маршаў, балотных нізін, якія ляжаць ніжэй роўня морскіх прыплываў. Каб ня шчыльны выдмавы плот, мора мусіла-б затапіць гэтыя нізіны. Сухазем'е тут паволі, няпрыметна, але бязупынна апускаецца, і мора наступае на яго. Часамі яно прарывае ланцуг выдмаў і залівае значныя прасторы нізінных маршаў.

Апошні раз такое здарэньне было ў XIII і XIV в. Мора прарвалося на маршы, затапіла там нівы і вёскі, загубіла тысячы людзей і жывёл. Ад прарваных выдмаў да гэтага часу застаўся ланцуг Фрызляндзкіх астравоў, які паказвае, дзе канчалася мора і пачыналася сухазем'е да здарэньняў XIII і XIV стаг. Між Фрызляндзкімі астравамі і контынэнтам знаходзяцца так званыя ватэны, якія ў час адплываў робяцца сухазем'ем, а ў час прыплываў—морам. Гэта даўнейшыя, залітыя морам маршы. Таксама даўнейшымі маршамі зьяўляюцца затокі Зюдэрзэ, Долярт, Ядэ.

Каб спыніць шкодную чыннасьць мора, насельнікі краіны пачалі ўмацоўваць выдмы так, каб ужо ніякая навальніца не магла іх разбурыць. Каб вецер ня выдмухваў з выдмаў пяскоў, іх засаджваюць расьлінамі, а каб мора іх не размывала, іх умацоўваюць каменнымі надбярэжжамі і брукамі. У тых месцах, дзе выдмы перарываюцца, людзі пабудавалі грэблі з пяску і каменьня. Такім-ж грэблямі абгарадзілі берагі рэк, так што рэкі цякуць у штучных рэчышчах вышэй ніў і лугоў. Абараніўшы такім спосабам свае маршы ад вады мора і рэк, людзі мусілі асушыць гэтыя грузкія балотныя прасторы. З гэтай мэтай яны паўсюды пракапалі канавы, у якія сьцякае грунтавая і дажджавая вада маршаў. Апрача таго, яны пралажылі каналы, абгароджаныя грэблямі, вышэй паверхні маршаў і нават вышэй роўня морскіх прыплываў. З дапамогай



ветракоў, паравых машын і помпаў ваду з канаў пераганяюць у гэтыя каналы, а адтуль яна сама сьцякае ў мора або ў рэкі. Гэткім чынам асушылі ня толькі балоты, але нават і вазёры, якіх было шмат раскідана па маршах.

У апошнія гады патроху пачалі асушаць нават кавалкі мора і зьбіраюцца зрабіць сухазем'ем усё тое, што было заліта морам у сярэднія вякі. У 1918 г. гэтую працу ўжо распачалі.

Асушаныя маршы маюць назоў польдэраў і адзначаюцца вельмі ўраджайнымі грунтамі, па якіх добра растуць травы і розныя культурныя расьліны.

Аднак ня ўся Голяндыя пакрыта маршамі. На ўсходзе і на поўдні яе вялікія кавалкі зямлі ляжаць значна вышэй над роўнем мора. Гэта так званыя гесты, пакрытыя ледавіковымі адкладамі пескавыя пусткі і тарфавішчы.

Голяндыю можна зваць краінай вусьцяў Рэну. Уступаючы ў межы краіны, гэтая найвялікшая рака Заходняй Эўропы распадаецца на адтокі, якія сплятаюцца паміж сабой і паасобку ўліваюцца або ў адкрытае мора або ў затоку Зюдэрзэ. (Па карце прасачы кірункі адток дэльты Рэну). З дэльтай Рэну злучаецца дэльта Маасу, а на паўднёвы захад ад іх супольнага вусьця ў мора ўліваецца Шэльда. (Якія астравы ляжаць у вусьцях Шэльды? Якая рака ўпадае ў затоку Долярт? Якая ў Ядэ?). Абгароджаныя выдмамі ўзьбярэжжы Голяндыі маюць мала буктаў, гожых для прыстою караблёў, але тым большую вагу маюць вусьці рэк, даступныя для самых вялікіх морскіх параходаў. (Якая прыстань ляжыць на Шэльдзе вышэй яе вусьця ў Бэльгійскай краіне?). Дзякуючы блізкасьці мора, клімат Голяндыі вільгатны і досыць цёплы. (Сярэдняя тэмпэратура году ў горадзе Утрэхце +9,9°). Зіма мяккая, з частымі адлігамі (сяр. тэмп. студзеня ў Утрэхце +1,5°), але часамі вада ў канавах і каналах замярзае. Сьнег ляжыць на маршах хіба-што па некалькі дзён у год, так што жывёлу там можна пасьвіць амаль-што ўвесь год без перарыву. Ліпень ня вельмі гарачы (у Утрэхце +18,4°), але ясныя дні выпадаюць улетку часьцей, як у суседніх акругах Бэльгіі або Нямеччыны.



Голяндыя ў I стагодзьдзі хрысьціянскай эры.

Рыс. 58.—(Параўнай з рыс. 59).

Насельнікі краіны—голяндцы – па сваім абліччы тыповыя паўночна-заходнія эўропэйцы: высокага росту, доўгатварыя з сьветлым колерам скуры вачэй і валасоў. Голяндзкая мова разглядаецца, як адна з ніжня-нямецкіх гаворак, але ўжо з даўных часоў на гэтай гаворцы склалася асобнае багатае пісьменства, і дзеля таго яна лічыцца за асобную мову. На поўначы краіны на ўзьбярэжжы ад Зюдэрзэ да Ядэ ўсё гэтак званай Фрызляндыі, а таксама на Фрызляндзкіх астравох у чыстаце захавалася ніжня-нямецкае племя фрызаў з старасьвецкімі звычаямі і старажытнай мовай, блізкай да мовы голяндцаў.




Рыс. 59.—Карта сучаснай Голяндыі.

Шматвяковая барацьба з наступам мора і з магутнымі суседзямі зрабіла голяндцаў цьвёрдымі, упартымі і працаздольнымі людзьмі, навучыла іх разумець карысьць супольнай працы, без якой немагчыма было-б збудаваць вялізныя грэблі і засланіць краіну ад патопу. Супольная праца злучыла насельнікаў краіны ў адзіны народ і адасобіла ад суседзяў. Прыродныя варункі спрыялі ўтварэньню ў краіне асобнай незалежнай дзяржавы—Голяндыі, якая ўпарта баранілася ад магутных ворагаў. У час войнаў голяндцы некалькі разоў праганялі ворагаў тым, што адчынялі застаўкі ў грэблях і такім спосабам залівалі свае польдэры.

У Голяндыі высока стаіць асьвета. Навука і мастацтва тут разьвіліся раней, як у суседніх краінах.

Дзякуючы свайму палажэньню ў асяродку Заходняй Эўропы між Ангельшчынай, Нямеччынай і Француcкай стараной, уладаючы вусьцямі Рэну, галоўнай ракі Нямеччыны, Голяндыя з даўных пор зьяўляецца багатай гандлёвай краінай.

У XVI і XVII ст. Голяндыя ня мела супарнікаў у мораходзтве і морскім гандлі. Да яе належалі вялізныя колёніі ўва ўсіх частках сьвету, і толькі ўзрастаньне Ангельшчыны, якая з выгодамі палажэньня злучыла багацьце рудой і апалам, адсунула Голяндыю на другараднае месца. Шмат якія голяндзкія колёніі перайшлі ў рукі Ангельшчыны.

Яшчэ й цяпер да Голяндзкай дзяржавы належаць вялізныя колёніі. (У Азіі—Малайскае згуртаваньне астравоў, у Аўстраліі—палова вострава Новая Гвінэя, у Амэрыцы—частка Гваяны (Гвіяны) і некалькі дробных



астраўкоў у Вэст-Індыі. Усяго голяндзкія колёніі налічваюць 2046 тыс. кв. клм. з 47609 тыс. насельнікаў).

Колёніі даюць Голяндыі цукер, каву, табаку, какао, усялякія прысмакі і хіну, якія адгэтуль вывозяцца ў Нямеччыну, Польшчу, Літву, Беларусь і Расію.

Па сваіх гандлёвых абаротах Голяндыя, ня гледзячы на сваю малую велічыню, займае адно з першых месц на сьвеце. (Перавышаюць яе на гэтым полі Ангельшчына, Злучаныя Штаты, Нямеччына і Францыя).

Гандаль (асабліва транзітны)—грунт, на якім стварылася багацьце Голяндыі.



Мал. 60.—Краявід у Голяндыі.

Мора дае яшчэ і іншыя заработкі насельнікам Голяндыі. Голяндцы і фрызы—добрыя рыбакі. Каля берагоў сваёй бацькаўшчыны яны ловяць вустрыц і рыбу (селядцы і траску). На сваіх маленькіх рыбацкіх караблёх яны выяжджаюць на рыбу і далей у Нямецкае мора і нават у Атлянтыку аж на морскія мяліны, што ляжаць каля вострава Нью-Фаўндлэнд блізка Паўночнай Амэрыкі.

Калісь у Голяндыі параўнаўча высока стаяла і прамысловасьць, але сучасная буйная фабрычная прамысловасьць патрабуе шмат апалу, якога ў Голяндыі няма. З гэтай прычыны цяпер фабрык тутака мала. Толькі ў прыморскіх гарадох мае вагу будаваньне караблёў ды апрацоўка некаторых продуктаў, што прывозяцца з колёній.

Зямлі, гожай на ральлю, у Голяндыі мала. Збожжа сеюць дзе-ні-дзе толькі ў гестах, дый там, каб яно магло расьці, трэба спачатку асушыць імшары і зрэзаць павярхоўны пласт торфу. Свайго збожжа не хапае і яго трэба прывозіць з коленій (рыс), з Амэрыкі (пшаніца), даўней прывозілі з Расіі. Ураджайныя нівы польдэраў засяваюцца пераважна каштоўнымі тэхнічнымі расьлінамі: табакай, цыкорыяй, лёнам, цукровымі буракамі. Цукру Голяндыя вырабляе шмат і вывозіць яго за межы. Апрача таго, ў польдэрах саджаюць пладовыя дрэвы, гародніну і садовыя кветкі (гіацынты, туліпаны, нарцысы, лялеі і г. д.), якія вывозяцца адгэтуль ва ўсе куткі Эўропы.

Аднак усе галіны земляробства маюць другараднае значэньне. Значна большую вагу мае гадоўля жывёлы. Пад поплавам і пашай тут знаходзіцца болей зямлі, чым пад нівамі, садамі і гародамі. У польдэрах трымаюць найлепшае малочнае быдла, вядомае на ўвесь сьвет сваімі якасьцямі. Услаўлены голяндзкі сыр, масла і згушчанае малако вывозяцца з Голяндыі ў вялікай колькасьці.

Роўныя польдэры, пакрытыя лугамі, кнігаўкі, што лётаюць і цівікаюць над імі, хутары, раскіданыя каля высокіх грэбляў і каналаў, ветракі, што бязупынна перакачваюць ваду з канаў у каналы, сытая жывёла, што пасьвіцца па лугох, здаровыя, высокія, вытрыманыя людзі з піпкамі ў зубах,—вось звычайны краявід Голяндыі. Гандаль і мораплаўства, малако і цукер, асьвета і супольная праца,—вось на чым грунтуецца багацьце гэтай краіны.

Голяндзкая дзяржава, да якой належыць большая частка краіны, зьяўляецца констытуцыйным каралеўствам і абымае 34200 кв. клм. з 6850 тыс. нас.

> Большасьць дэпутатаў голяндзкага парлямэнту належыць да розных антысоцыялістычных партый. Соцыял-дэмократы маюць у парлямэнце 22 месцы ў ніжняй палаце. Партыя гэтая блізка да аднаназоўнай нямецкай партыі, і ў час вайны спачувала нямецкім імпэрыялістым. Уплыў яе на работнікаў зьмяншаецца. Затое ўзмацняецца маладая Комуністычная Партыя Голяндыі, якая ўжо пасьпела правесьці сваіх прадстаўнікоў у парлямэнт. Профэсыянальныя організацыі голяндзкіх работнікаў ня маюць адзінства. Цэнтральны Профсаюз знаходзіцца пад уплывам Соц.-Дэм. Раб. Партыі. Комуністыя маюць уплыў на так званы Саюз Сындыкалістых, які падтрымоўвае сувязь з Маскоўскім Профінтэрнам.

Маленькі куток Голяндзкай краіны, які ляжыць між затокамі Долярт і Ядэ, належыць да Нямецкай рэспублікі.

Гарады краіны зьяўляюцца пераважна гандлёвымі, а не прамысловымі асяродкамі. Самы вялікі з іх *Амстэрдам* (642000 нас. у 1920 г.) ляжыць на беразе Зюдэрзэ, на пярэсмыку, што злучае з контынэнтам Голяндзкі паўвостраў, акругу багатых польдэраў, у якой голяндцы хаваліся ў час барацьбы за незалежнасьць.



> Асушанае цяпер Гарлемскае возера бязмаль-што зусім аддзяляла гэты паўвостраў ад контынэнту. Разбурыўшы некаторыя грэблі і затапіўшы такім чынам часткі маршаў, голяндцы часова ператваралі свой паўвостраў у востраў, каб на яго не маглі прайсьці ворагі.

Многалічныя каналы перасякаюць Амстэрдам у розных кірунках і дадаюць яму падобнасьць да Вэнэцыі.

> На грузкіх грунтох гораду можна ставіць будынкі толькі на даўгіх палях, убітых у зямлю аж да цьвёрдых пластоў, якія ляжаць пад глебай. Так будуюць хаты шмат у якіх гарадох Голяндыі.

У тыя часы, як Зюдэрзэ было даступна для морскіх караблёў, Амстэрдам быў адным з галоўных асяродкаў сусьветнага гандлю. Пазьней морскія караблі пачалі будавацца такімі вялікімі, што ўжо не маглі ўваходзіць у Зюдэрзэ. Амстэрдам часова страціў сваю вагу. Цяпер сюды пракапалі з захаду канал, даступны для буйных караблёў, і горад ізноў пачынае разьвівацца. Прамысловасьць гораду ня вельмі вялікая; высока стаіць толькі будаваньне караблёў. Перш за ўсё Амстэрдам—асяродак унутранога гандлю Голяндыі і асяродак культурны; тут шмат музэяў, некалькі вышэйшых школ і іншых навуковых і культурна-асьветных устаноў.

На паўднёвы захад адгэтуль ляжыць *Гага* (353000 нас.), сталіца Голяндзкай дзяржавы з палацамі каралевы і гэнэральных штатаў (сойму). Гэта ціхамірны, прыгожы горад урадовых устаноў.

Наадварот, *Ротэрдам* (511000 нас.), што ляжыць на поўдзень ад Гагі на адным з галоўных вусьцяў Рэну, зьяўляецца бойкім горадам замежнага гандлю. Сюды даходзяць найвялікшыя морскія караблі, на якіх прывозіцца збожжа, гарбата і кава. Усё гэта тутака перагружаецца на рэнскія рэчныя параходы і на чугункі і накіроўваецца на ўсход у Нямеччыну.

На паўднёвы ўсход ад Амстэрдаму на скрыжаваньні суднаходных рэк і каналаў з галоўнымі чыгункамі краіны ляжыць *Утрэхт* (140000 нас.), багаты унівэрсытэцкі горад, адзін з нямногіх прамысловых куткоў Голяндыі.

Асяродкам Фрызляндыі можна лічыць *Гронінген* або Дрэнтэ (90000 нас.), унівэрсытэцкі і гандлёвы асяродак фрызляндзкіх маршаў, на якіх красуе гадоўля малочнай жывёлы.

**Паўночна-Заходняя Нямеччына** абымае частку Паўночна-Гэрманскай нізіны на ўсход ад Голяндыі ў вадазборы сярэдняга Эмсу, ніжняга Вэзэру і ніжняй Лабы (Эльбы). Краіна гэтая мае выйсьце да паўднёва-ўсходняга кутка Нямецкага мора, берагі якога і тут, як у Голяндыі або Заходняй Ютляндыі, адзначаюцца адсутнасьцю выгодных буктаў і небясьпечнымі для караблёў мялінамі. Толькі шырокія вусьці рэк Вэзэру і Лабы, даступныя для самых буйных морскіх караблёў, зьяўляюцца нібы брамамі

краіны, праз якія ідуць галоўныя дарогі з Нямеччыны да мора. У гэтых вусьцях пабудаваліся багатыя гандлёвыя гарады з важнымі морскімі прыстанямі, таго часу як рэшта ўзьбярэжжа пустынна й бязлюдна.

Ланцуг выдмавых Фрызляндзкіх астравоў перарываецца на ўсход ад затокі Ядэ, але затое тут захаваўся скалаваты востраў Гельголянд, таксама адломак сухазем'я. У час сусьветнай вайны гэты востраў быў галоўным умацаваньнем Нямеччыны на моры. Маршы, падобныя да голяндзкіх, займаюць у Паўночна-Ўсходняй Нямеччыне толькі вузкую паласку ўзьбярэжжа і на захад ад Ядэ ўсюды ляжаць вышэй роўня мора. Затое гесты, такія самыя, як ува Ўсходняй Голяндыі, пакрываюць большую частку краіны. Гэта роўныя прасторы, пакрытыя ледавіковымі адкладамі, неўраджайныя, пескаватыя. Калісь тут было многа лясоў, але іх даўно ўжо павысякалі, і цяпер на іх месцы засталіся толькі тарфавішчы ды пусткі, парослыя скуднай траўкай або хмызьнячком верасу. Такой пусткай зьяўляецца, напрыклад, Люнэбургская між нізавінамі Вэзэру і Лабы, гожая, ды й то ня ўсюды, на пашу авечкам і козам.

Клімат краіны вільгатны, морскі, з мяккай зімой і халаднаватым хмарным летам.

Сярэдняя тэмпэратура году ў Гамбурзе, у вусьцях Лабы, $+8{,}3^{0}$, сярэдняя студзеня $+0{,}3^{0}$, ліпеня $+17{,}2^{0}$.

Зразумела, што благія грунты і няпрыемны клімат ня прынаджваюць сюды людзей. Гушчыня залюдненьня значная толькі каля вусьцяў рэк. Насельнікі краіны — адно з ніжня-нямецкіх пляменьняў (ніжня-саксы)— жывуць у даўгіх аднапаверхавых хатах з крутой саламянай страхой. Звычайна ў аднэй хаце зьмяшчаюцца і пакоі для людзей, і хлеў для жывёлы, і памяшканьне для сельска-гаспадарчых прыладаў. Зямля належыць пераважна да дробных землеўласьнікаў—сялян, а рыльніцтва зьяўляецца адным з галоўных заняткаў насельнікаў. Значную частку імшараў асушылі, з тарфавішчаў зразаюць пласт торфу, у пустках выпальваюць верас, зямлю добра гнояць і старэнна вырабляюць. Аднак грунты застаюцца благімі і даюць ня вельмі вялікія ўраджаі. Сеюць пераважна жыта, авёс, бульбу і лён, каля рэк саджаюць садовіну. Яшчэ большую ўвагу, як на ральлю, звачваюць на лугі і пашу, бо, дзякуючы вільгатнаму клімату, трава расьце нават і на кепскіх грунтох. Коней, быдла і авечак ганяюць на пашу бязмаль цэлы год. У моры ловяць рыбу, у Люнэбургскай пустцы здабываюць нафту. Аднак галоўны даход краіне дае гандаль. Лежачы каля вусьцяў Лабы і Вэзэру, краіна зьяўляецца пасярэдніцай у гандлі Сярэдняй Нямеччыны з іншымі краямі, таксама як для Заходняй Нямеччыны такім гандлёвым пасярдэнікам зьяўляецца Голяндыя.

У вусьцях Лабы пабудаваўся самы важны гандлёвы горад Эўропэйскага контынэнту і трэці па сваіх гандлёвых абаротах горад сьвету—*Гамбург* (968 тыс. насельнікаў). Перад вайной толькі Нью-Ёрк і Лёндон перавышалі яго па сваіх гандлёвых абаротах (3254 мільёны рублёў золатам).



Лежачы ў тым месцы Лабы, да якога даплываюць найвялікшыя морскія караблі, Гамбург ёсьць найбліжэйшай да асяродку Заходняй Эўропы морскай прыстаньню. Перасяленцы ў Амэрыку з Нямеччыны, Польшчы і Беларусі ў Гамбурзе садзяцца на караблі, якія адгэтуль ідуць цераз акіян. Толькі ў час замярзаньня Лабы, што здараецца ня кожны год, акіянскія караблі прыстаюць ня ў самым Гамбурзе, а ў Куксгафэне бліжэй да адкрытага мора, дзе выгружаюцца прынамсі пасажыры, пошта і г. д. З Нямеччыны праз Гамбург вывозяць фабрычныя вырабы, крамніну, жалеза, хімічныя тавары. Сюды з Амэрыкі і іншых заэўропэйскіх краёў вязуць каву, збожжа, воўну, баваўну. У Гамбурзе будуюць морскія караблі, апрацоўваюць каву, какао, каўчук, вырабляюць боты і г. д. Але фабрычная прамысловасьць болей пашырана ў яго прадмесьцях: Альтоне, Гарбурзе, Вандсбэку і іншых, разам з якімі Гамбург налічвае болей за 1200 тыс. нас. Уваходзячы ў склад Нямецкай фэдэрацыі, Гамбург зьяўляецца вольным горадам, маленькай самаўраднай рэспублікай. Гэта адзін з тых вольных гарадоў, якія ў сярэднія вякі былі злучаны ў Ганзэйскі хаўрус і кіравалі гандлем у Балтыцкім моры.

Такім-жа вольным местам ёсьць і *Брэмэн* (258000 нас.), які займае такое-ж палажэньне на Вэзэры, як Гамбург на Лабе. Гэта таксама важная прыстань (гандлёвы абарот 974 міл. рубл. золатам да вайны), якая бойка гандлюе з Злучанымі Штатамі Паўночнай Амэрыкі і Індыяй. Сюды прывозяць і тут апрацоўваюць баваўну, табаку, рыс. Як для Гамбургу пярэдняй прыстаньню зьяўляецца Куксгафэн, гэтак Брэмэн мае сваю пярэднюю гавань на адкрытым моры—Брэмэргафэн.

Апрача Брэмэну і Гамбургу большая частка Паўночна-Заходняй Нямеччыны ўваходзіць у склад провінцыі Гановэр, якая зьяўляецца часткай Прусіі, найвялікшай з самаўрадных рэспублік Нямеччыны. На захад ад вусьцяў Вэзэру тут знаходзіцца яшчэ самаўрадная рэспубліка Ольдэнбург.

**Паўночна-Ўсходняя Нямеччына** ляжыць на ўсход ад Лабы да вышнявіны Одэру і заходніх берагоў Гданьскай затокі Балтыцкага мора. Да яе належыць частка Ютляндыі, што ляжыць на поўдзень ад Фленсбургскага фёрду. Паводле сваёй прыроды гэтая краіна нагадвае Ўсходнюю Данію. Ледавік тут трымаўся даўжэй, як у Паўночна-Заходняй Нямеччыне і пакінуў грубейшы пласт морэн. З ледавіковага навалу тут утварылася шмат грудоў і пагоркаў, так што краявід краіны мае падобнасьць да краявіду паўночна-беларускіх узгор'яў.

Узьбярэжжа Балтыцкага мора, пераважна роўнае і нізіннае, толькі на захадзе мае ў дастатку выгодных букт-фёрдаў. Далей на ўсход прыстані сустракаюцца толькі ў вусьцях значных рэк. У сухазем'е, праўда, уразаецца шмат заток, але гэтыя затокі, так званыя гафы, аддзелены ад адкрытага мора грудамі выдмаў, з якіх складаюцца вузкія і даўгія паўвостравы—гакі.

На поўначы краіны цягнецца паласа тыповых морэнавых узгор'яў, багатых вазёрамі ледавіковага пахаджэньня. (Гэтыя ўзгор'і адпавядаюць канцовым морэнам, нанесеным у час апошняга зьледзяненьня). На захадзе паласа ўзгор'яў падыходзіць да самага Балтыцкага мора, на ўсходзе між узгор'ямі і морам распасьціраецца паўзьбярэжная нізінная палоска. На поўдзень ад паласы ўзгор'яў ізноў цягнецца паласа нізін, па якіх і рэкі цякуць у шырынёвым кірунку, пакуль не прарвуцца праз морэнавыя ўзгоркі ў бок Балтыцкага мора. Гэтыя нізіны адзначаюцца роўнай паверхняй і нагадваюць нашую Палескую нізіну. Паласа нізін мае вялікую гандлёвую вагу, бо па ёй праходзяць галоўныя сухаземныя дарогі з Заходняй Эўропы ў Польшчу, Беларусь і Маскоўшчыну. Рэкі Лаба з Гавэлем, які мае прытоку Шпрэ, Одэр з Вартай і іншыя, што бягуць па паласе нізін, злучаны паміж сабой сеткай штучных вадзяных дарог—каналаў. Такім чынам паласа нізін мае найлепшыя ўмовы для разьвіцьця ўнутранога гандлю.

Грунты ў Паўночна-Ўсходняй Нямеччыне лепшыя, як у Паўночна-Заходняй.

Ураджайная гліністая глеба займае тут болей прасторы, а пяскі і балоты трапляюцца радзей. Клімат тут сушэйшы, неба часьцей бывае ясным, сонечным.

Сярэд. тэмп. году ў Бэрліне $+8{,}6^0$, значыць бязмаль такая самая, як у Гамбурзе, але ўзімку тут халадней (сярэдняя тэмпэратура студзеня $-0{,}2^0$,), а ўлетку цяплей (сярэд. тэмп. ліпеня $+18{,}4^0$). Ападкаў 500—600 мілім.

Лясоў тут захавалася досыць многа. Па пескавых выдмавых узьбярэжжах пераважваюць хваёвыя бары, у іншых месцах часьцей трапляюцца яловыя, букавыя і дубовыя лясы.

Насельнікі краіны—тыя самыя ніжня-немцы, што і ў Паўночна-Заходняй Нямеччыне (ніжня-саксы), але даўней тут жылі славянскія пляменьні, і хаця яны даўно анямечыліся, але ўплывы падмешкі іхняй крыві адбіваюцца і на сучаснай нямецкай людпасьці. Тутэйшыя немцы маюць шмат славянскіх рысак у абліччы. Сярод іх часта спатыкаюцца круглагаловыя і шырокатварыя, як славяне, асобы. У змаганьні з суседзямі і з даволі жорсткай прыродай склаўся характар мясцовых немцаў. Гэта ўпарты, хмуры і жорсткі народ, згуртаваны ў моцную грамадзянскую адзінку, шануючы дысцыпліну, паслухмянства і парадак.

Няма нічога дзіўнага, што тут на ўскрайку Гэрманіі стварылася наймацнейшая з нямецкіх дзяржаў—жалезная магутная Прусія, пад уладай якой хутка апынулася ўся Паўночна-Ўсходняя Нямеччына, а потым яшчэ вялікія часткі іншых краін Гэрманіі. З Прусіяй мусілі злучыцца ў адну фэдэрацыю і тыя нямецкія дзяржавы, якія яшчэ засталіся самастойнымі (за выключэньнем Аўстрыі). Фактычна Прусія неабмяжована пануе ў Нямецкай фэдэрацыі, а да рэволюцыі, як мы ўжо ведаем, прускія каралі зьяўляліся адначасна нямецкімі імпэратарамі.



Сельская гаспадарка ў Паўночна-Ўсходняй Нямеччыне, як і ў Паўночна-Заходняй, мае вялікае значэньне. Земляўласнасьць тут пераважвала буйная. Сялян-земляўласьнікаў тут меней. Гадоўля жывёлы, агулам кажучы, мае меншую вагу, але і тут авечак, коняй і быдла трымаюць значна болей, як у нас. Гэтаму дапамагаюць і палепшаныя спасабы ральніцтва, пры якіх значная колькасьць зямлі знаходзіцца пад засевамі кармавых траў. Пад папарам застаецца толькі 5⁰/₀ усёй ральлі (у нас на Беларусі болей за 30⁰/₀). З збожжа болей за ўсё сеюць жыта і аўса. прычым з кожнай дзесяціны зьбіраюць у сярэднім разы 4 болей, як у нас. Бульбы сеюць болей, як дзе, яе хапае і на страву людзям і на корм жывёле, яна йдзе на бравары і на крухмальні. Гарэлкі з бульбы тут вырабляецца вельмі многа, так што хіба толькі Беларусь да вайны магла на гэтым полі спрачацца з Паўночна-Ўсходняй Нямеччынай. Вялікую вагу маюць засевы цукровых буракоў і выраб цукру. Апроч таго, сеюць шмат гароху, табакі, гародні-



Мал. 61.—Бэрлін. Будынак рэйхстагу (саюзнага парлямэнту).

ны, лёну. Падземнага багацьця тут ня лішне многа, хаця месцам (ува Ўсходнім Брандэнбурзе і Ніжнім Шлёнску) трапляецца каменны і буры вугаль. Карыстаючыся мясцовым і прывезеным з паўдня вугалем, хутка пашыраецца фабрычная прамысловасьць, асабліва апрацоўка сельска-гаспадарчых продуктаў. Каля мора будуюць караблі, а ў сярэдзіне краіны каля сталіцы пашырыўся выраб вопраткі, машын і мастацкіх тавараў.

З іншых заняткаў можна адзначыць лясны промысел і рыбацтва ў Балтыцкім моры, але як дрэва, гэтак і рыбы здабываецца замала ў параўнаньні з вымаганьнямі мясцовай люднасьці, і гэтыя тавары трэба прывозіць з-за межаў. Вялікую вагу мае гандаль, хаця для замежнага гандлю прыстані Балтыцкага мора меней выгодныя, чым Гамбург або Брэмэн, бо звычайна ў студзені замярзаюць і ляжаць занадта далёка ад галоўных міжнародных гандлёвых дарог. Толькі ў апошнія часы, як пракапалі Кільскі канал праз Паўднёвую Ютляндыю, гандлёвае значэньне Балтыцкіх прыстаняй павялічылася. Унутраному гандлю дапамагае будова паверхні, дзякуючы якой пракладаньне дарог не выклікае вялікіх страт. Чыгункавая сетка краіны такая густая, як у Ангельшчыне.

Асяродкам унутранога гандлю краіны зьяўляецца *Бэрлін*—сталіца Нямецкай дзяржавы і вузел галоўных сухаземных дарог Эўропы. У Бэрліне сходзяцца важныя чыгункі, якія маюць агульна-эўропэйскае значэньне. Праз Бэрлін ідзе найкарацейшая дарога з Ленінграду—Вільні—на Парыж, з Масквы—Менску—Варшавы ў Ангельшчыну і Францыю, з Царграду ў Гамбург і Скандынавію і г. д. Горад ляжыць на рацэ Шпрэ (прытока Гавэлю, які ўліваецца ў Лабу). Тут сходзяцца галоўныя рэчныя шляхі Нямеччыны і, ня гледзячы на малую велічыню Шпрэ, Бэрлін—галоўная рэчная прыстань Гэрманскай стараны. Як прамысловы асяродак Паўночна-Усходняй Нямеччыны, горад вырабляе вагоны, паравозы, вопратку, машыны і г. д. Як у сталіцы Нямецкай рэспублікі, тут згуртаваліся галоўныя дзяржаўныя ўстановы, для якіх пабудаваны харошыя палацы.

Усялякія помнікі, вялізныя масты, звычайна 5-цёх паверхавыя камяніцы, чыстыя, абсаджаныя дрэвамі вуліцы (Unter den Linden), прыгожыя сады і бульвары (слынны Tiergarten у сярэдзіне гораду) дадаюць надзвычайнае хараство нямецкай сталіцы. Брукаваныя асфальтам вуліцы тут мыюцца швабрамі, і нагул за чыстатой сочаць пільна. З гэтай прычыны й паветра тут чысьцейшае, як у іншых вялікіх гарадох, пылу значна меней. Рух калёсаў і самаходаў тут меншы, як у Парыжы, але затое ўва ўсіх кірунках па горадзе праходзяць поўныя народу вагоны надземных і падземных чыгунак і трамваяў.

Як культурны асяродак Нямеччыны, Бэрлін слыне выдатнымі вышэйшымі школамі, у якіх вучыцца шмат чужаземцаў, многалічнымі багатымі бібліотэкамі, чытальнямі, кнігарнямі, помнікамі мастацтва ў музэях, багатымі навуковымі колекцыямі і г. д. Аднак для Нямеччыны Бэрлін далёка ня тое, што Парыж для Францыі. Іншыя гарады Гэрманскай стараны, асабліва ў Паўднёвай Нямеччыне, жывуць сваім асобным, незалежным ад Бэрліну жыцьцём, не аддаюць яму ўсіх сваіх жывых сіл. Ня гледзячы на гэта, Бэрлін хутка расьце, а ў апошнія перад вайной дзесяцёхгодзьдзі зраўняўся з Парыжам па колькасьці насельнікаў (У 1910 годзе ў Бэрліне было 2071000 насельнікаў, а разам з прадмесьцямі 3703000. У час сусьветнай вайны лік насельнікаў трохі зьменшыўся. У 1919 г. іх тут было 1903000, але разам з прадмесьцямі яшчэ болей, як да вайны—3730000).



Асабліва шпарка разрастаюцца прадмесьці, з якіх некаторыя ўжо зьліліся з сталіцай у адну бясконцую грамаду будынкаў. Некаторыя з гэтых прадмесьцяў, даўней маленькія падбэрлінскія мястэчкі і вёскі, налічваюць цяпер болей, як па 200000 насельнікаў кожны (Шарлётэнбург, Нэйкэльн, Шэнэбэрг).

Крыху далей ад сталіцы ля суткі Шпрэ і Гавэлю стаіць *Шпандаў* (85000 нас.) з вялікімі фабрыкамі зброі і пораху, а яшчэ далей, ніжэй на Гавэлі—*Потсдам* (58000 нас.), прыгожы горад, былая гаспода прускіх каралёў. Ваколіцы Бэрліну зьяўляюцца галоўнай прамысловай акругай Паўночна-Усходняй Нямеччыны. Другая такая акруга ляжыць на Одэры ў так званым Ніжнім Шлёнску, дзе здабываюць каменны вугаль. Аднак там апрача фабрычнай прамысловасьці пашырана і ральніцтва, між іншым засевы



Мал. 62.—Прыстань у Штэтыне.

цукровых буракоў. У сярэдзіне гэтай акругі на Одэры ляжыць *Брэслаў* (папольску Вроцлав, 528000 н.), у якім сходзяцца важныя дарогі з Польшчы ў Чэхію, з Бэрліну ў Украіну. Тут існуе шмат цукраварняў, хімічных, машынных і іншых фабрык.

На поўначы краіны на вусьцях Одэру ляжыць важная прыстань—*Штэтын* (233000 нас.), асяродак сельска-гаспадарчай акругі (Помэраніі) з буйнымі майстэрнямі караблёў і апрацоўкай сельска-гаспадарчых продуктаў.

Пярэдняй прыстаньню Штэтыну зьяўляецца Свінэмюндэ, мястэчка на беразе адкрытага Балтыцкага мора.

Другая важная прыстань Балтыцкага мора *Любэк* (113000 нас.) ляжыць у паўднёва-заходнім кутку Балтыцкага ўзьбярэжжа. Як Гамбург і Брэмэн, Любэк быў у сярэднія вякі адным з гарадоў Ганзэйскага хаўрусу і да гэтага часу таксама застаўся вольным местам, якое ўваходзіць у склад Нямецкай фэдэрацыі. Бойкі гандаль гэтага гораду з Літвой, Латвіяй і Расіяй зьменшыўся ў апошнія часы, пасьля таго, як пракапалі Кільскі канал з Балтыцкага мора ў Нямецкае праз шыю паўвострава Ютлянды.

Затое борзда пачаў пашырацца гандаль прыстані *Кіль* (205000 н.), якая ляжыць ля выйсьця гэтага каналу ў Балтыцкае мора. Гэта асяродак гандлю з Даніяй і Скандынавіяй, вядомы з даўных часоў, як рыбацкая прыстань, каля якой ловяць селядцы і шпроты. Аднак галоўнае значэньне Кілю грунтуецца на палажэньні каля Кільскага каналу, па якім немцы могуць лёгка перакідваць свае караблі з Нямецкага мора ў Балтыцкае. Гэта галоўная вайсковая прыстань Нямеччыны, якая адыграла важную ролю ў час сусьветнай вайны. Будаваньне караблёў тут мае яшчэ большую вагу, як у Штэтыне.

**Сярэдняя Нямеччына** складаецца з магутных горставых гор, якія аддзяляюць Паўночна-Гэрманскую нізіну ад гор і катлін Паўднёвай Нямеччыны. Сярэдня-Нямецкія горы звычайна маюць адхонныя схілы і плоскія або акругленыя вярхі, але ў далінах рэк, якія прабіваюцца праз Сярэдня-Нямецкі горны парог, сьценкі гэтых далін часамі бываюць зрывістымі, як, напрыклад, у даліне Лабы, у так званай Саксонскай Швайцарыі. На зрывістых сьценах такіх далін агаляюцца featnakalёрныя пласты земных парод; з схілаў суседніх гор, голых або пакрытых лесам, спадаюць прыгожыя струмені, уліваючы сваю ваду ў павольную галоўную раку, што бяжыць па даліне. У іншых месцах, асабліва па вадападзелах, краявід адзначаецца аднатоннасьцю (напрыклад, плоскаўзвышша Зауэрлянд у паўночна-ўсходняй частцы Рэнскіх Лупняковых гор).

Наагул краявід краіны, як і паверхня, досыць рознастайны, горы чаргуюцца з плоскаўзвышшамі і катлінамі, грунты месцам урадлівыя, лёэсавыя, на значных узвышшах ледавіковыя, месцам камяністыя. На захадзе горы Сярэдняй Нямеччыны займаюць шырокую прастору ў 2—3⁰ шырыні, на ўсход звужваюцца, уразаючыся між Паўднёва-Ўсходняй Нямеччынай і Чэскім спрадвечным масывам. На захадзе горы складаюцца з пластовых земных парод—лупнякоў і пескавікоў (Рэнскія Лупняковыя горы), вапнякоў, маргляў і гэтак далей. Часамі сярод лупнякоў і пескавікоў там сустракаюцца значныя прасторы, складзеныя з астыглай лявы, багатыя згаслымі, але яшчэ правільнымі стожкавымі вульканамі. У жэралах гэтых вульканаў, напрыклад, у Рэнскіх Лупняковых горах, захаваліся цікавыя вульканічныя вазёры (маары).

(Паводле карты вывучы назовы галоўных гор Сярэдняй Нямеччыны. Якія рэкі там працякаюць? Адкуль і куды бягуць гэтыя рэкі?).



Галоўнай асаблівасьцю ўсёй Сярэдняй Нямеччыны зьяўляецца багацьце яе на розныя карысныя мінэралы. З даўных часоў тут здабывалася шмат серабра, волава, цыны, а ў апошнія часы тутака вынайшлі вялізныя паклады каменнага вугалю, жалеза і розных соляй, на якіх грунтуецца нямецкая хімічная прамысловасьць.

У залежнасьці ад рознастайнай паверхні і вялікага працягу краіны з захаду на ўсход клімат яе досыць разнародны. На захадзе клімат мякчэйшы, на ўсходзе астрэйшы; вярхі гор, апранутыя вечнымі хмарамі, адзначаюцца халаднаватым дажджыстым кліматам; даліны рэк і зачыненыя з усіх бакоў гарамі катліны маюць клімат сушэйшы і цяплейшы.

Найвышэйшая гара горсту Судэтаў Шнээкопэ мае сярэднюю гадавую тэмпэратуру $+0{,}2^0$, сярэднюю ліпеня $+9{,}0^0$, лютага $-7{,}3^0$. Дрэздэн у даліне Лабы мае адпаведна $+9{,}0^0$ для ўсяго году, $+18{,}2$ для ліпеня, $-0{,}1^0$ для студзеня. Кэльн на сярэднім Рэне $+10{,}1^0$, (год), $+18{,}6^0$ (ліпень), $+2{,}2^0$ (студзень).



Мал. 63.—Краявід у Сярэдняй Нямеччыне (провінцыя Саксонія). Араньне зямлі за дапамогай паравых плугоў.

У даліне Сярэдняга Рэну сьпее вінаград; у горах растуць толькі хваёвыя бары; па нізінах пераважваюць лясы дубовыя і букавыя.

Варункі для ральніцтва наагул добрыя, але багатыя паклады мінэралаў адцягваюць насельнікаў ад вёсак, і паўсюды сельская гаспадарка зьяўляецца другарадным заняткам, а насельнікаў вясковых меней, як гарадзкіх. Галоўным збожжом, як і ў Паўночна - Гэрманскай нізіне, зьяўляецца жыта, за ім ідзе авёс, але для пражыўленьня насельнікаў большую вагу мае бульба, асабліва ў густа залюдненых прамысловых акругах,

дзе зямля вельмі каштоўная і засяваць збожжа няма рахунку. Па ўраджайных раўнінах (на ўсход ад Гарцу і ў вадазборы Вышняга Вэзэру) сеюць шмат цукровых буракоў, паўсюды грае вялікую ролю гародніцтва і садоўніцтва. Гадоўля жывёлы мае меншую вагу, як на Паўночна-Гэрманскай нізіне, але й тут трымаюць многа авечак, быдла (асабліва на плоскаўзвышшы Гэсэн), сьвіней (у Вэстфаліі, Турынгіі, Саксоніі). Вэстфальскія кумпякі вывозяцца адгэтуль і за межы, а сасіскі і каўбасы лічацца нацыянальнай патравай. Аднак усе сельскія заняткі могуць лічыцца толькі падсобнымі, як у нас падсобнымі пры ральніцтве зьяўляюцца саматужныя промыслы. Багацьце Сярэдняй Нямеччыны грунтуецца на нетракапальнай і фабрычнай прамысловасьці, якая тут пашырылася болей, як ува ўсіх іншых частках Гэрманскай стараны. Поплеч з Паўночна-Заходняй Ангельшчынай, Бэльгіяй і некаторым краінамі ў Злучаных Штатах Паўночнай Амэрыкі Сярэдняя Нямеччына зьяўляецца аднэй з галоўных прамысловых краін сьвету. Здабываньне каменнага вугалю адбываецца бязмаль-што па ўсёй краіне, паклады яго раскіданы маленькімі і вялікімі акругамі паўсюды. Асабліва многа каменнага вугалю знаходзяць у вадазборы маленькай прытокі сярэдняга Рэну—рэчкі Рур, дзе яго здабываюць што-год болей за 50 мільёнаў тон.

Вялізныя запасы вугалю трапляюцца ў Саксонскіх Рудных горах, у Судэтах, у Паўночным Гэсэне, на крайнім захадзе каля Ахэну і ў нізінах, якія ўразаюцца ў краіну з поўначы, нібы затокі Паўночна-Гэрманскай нізіны, каля гарадоў Лейпцыгу і Кэльну.

Большая частка тутэйшага вугалю патрабляецца на месцы буйнымі фабрыкамі Сярэдняй Нямеччыны, але многа яго вывозіцца й за межы. Жалезнай руды ў краіне таксама знаходзяць многа.

Яе здабываюць ля р. Лян, прытокі Рэну, у Турынгіі, у Вэзэрскіх горах на поўнач ад горсту Гарц.

Нідзе на сьвеце няма такой колькасьці цынку, як у Сярэдняй Нямеччыне (у Заўэрляндзе і навокала Ахэну), многа тут і волава (у Рэнскіх Лупняковых горах і ў Гарцы), цыны (у Саксонскіх Рудных горах), медзі (у Рэнскіх Лупняковых горах, у Гарцы і на ўсход ад яго). Вельмі вялікую вагу маюць паклады солі як звычайнай, гэтак і так званай „адкідной“, на якой грунтуецца хімічная прамысловасьць Нямеччыны. (Найболей ведамы паклады солі каля Штасфурту на ўсход ад Гарцу). Ёсьць у краіне і нафта (у Вэзэрскіх горах). Наагул Сярэдняя Нямеччына мае ўсё, што патрэбна для буйной сучаснай прамысловасьці, і зразумела, фабрыкі расьлі ў ёй, асабліва перад вайной, як грыбы, а па колькасьці буйных гарадоў яна перавысіла нават Паўночна-Заходнюю Ангельшчыну. Паводле становішча жалезнай, хімічнай, баваўнянай і ваўнянай прамысловасьці краіна займае першае месца на контынэнце Эўропы. Выраб таннай вопраткі



пашыраўся з такой шпаркасьцю, што пагражаў выцісьнуць з сусьветнага рынку Ангельшчыну.

Апрача невялікай колькасьці вэндаў або сэрбаў-лужычанаў, якія захаваліся ў межах краіны (у Лужычанскіх горах), большасьць насельнікаў гаворыць на сярэдня-нямецкіх гаворках. (На захадзе—верхня-франкскай, на ўсходзе—верхня-саксонскай). Ад аднэй з гэтых гаворак (верхня-саксонскай) паходзіць і сучасная пісьменная нямецкая мова. Так званыя сярэднія немцы адзначаюцца ад паўночных, асабліва ад прусákаў, вясёлым, жвавым характарам, прыхільнасьцю да поэзіі і музыкі, задаволенасьцю жыцьцём, волялюбнасьцю і дэмократызмам. Гарыстая паверхня Сярэдняй Нямеччыны перашкаджала праз доўгі час утварэньню тут буйных дзяржаў, і аж да гэтага часу тут існуе шмат асобных дробных дзяржаўных адзінак, якія ўваходзяць у склад Нямецкай фэдэрацыі. Па сваім фізычным абліччы сярэднія немцы адразьняюцца ад паўночных цямнейшым колерам скуры, вачэй і валасоў і меншым ростам.

Тлумачыцца гэта падмешкай крыві кельцкіх народаў, якія даўней жылі ў Нямеччыне аж да вышнявіны Вэзэру і толькі з цягам часу анямечыліся.

Па вёсках жыве толькі меншасьць насельнікаў краіны ды й самыя вёскі тутака большыя, а хутары сустракаюцца радзей, як у Паўночнай Нямеччыне. Сялянскія панадворкі чатырохкутныя, па бакох панадворка будуюцца асобна пуні, гумны, ёўні і стайні. Хаты звычайна двохпаверхавыя, крытыя дахоўкай або гонтамі. Сярод гарадоў краіны сустракаюцца старасьвецкія нямецкія месты з вузкімі вуліцамі, старажытнымі 2-х паверхавымі будынкамі, дахі якіх канчаюцца вострымі вярхамі і вежамі.



Мал. 64.—Вуліца з старасьвецкімі будынкамі ў нямецкім горадзе. (Браўншвэйг).

У апошнія гады пабудована шмат гарадоў сучаснага тыпу з шырокімі вуліцамі і пляцамі, вялізнымі многапаверхавымі камяніцамі і многалічнымі фабрыкамі.

Асабліва многа такіх гарадоў у каменна-вугальных акругах, дзе часта гарады, фабрычныя мястэчкі, рудні, гуты і капальні зрастаюцца, як у

Паўночна-Ўсходняй Ангельшчыне або ў Бэльгіі, у адзін бязьмежны горад з лесам фабрычных комінаў, з кучамі вугалю, э пахам дыму і чаду, з гоманам і клумам, з лясканьнем і гулам машын. Гушчыня залюдненьня ў такіх месцах надзвычайна высокая і часамі дасягае да 1500 ч. на 1 кв. клм., таго часу, як сярэдняя шчыльнасьць насяленьня ў краіне ледзь даходзіць да 190.

Найгусьцей залюдненая акруга ляжыць на захадзе краіны ў вадазборы сярэдняга Рэну. Рэн—галоўная гэрманская рака, цячэ сюды з Вышня-Рэнскай нізіны і пераразае тут папярок Рэнскія Лупняковыя горы ў прыгожай вузкай даліне.



Мал. 65.—Краявід на Рэне.

Заўсёды маючы ў дастатку вады, Рэн зьяўляецца галоўнай прыроднай дарогай з Альп да Нямецкага мора. Швайцарыя, Нямеччына, Францыя і Голяндыя карыстаюцца гэтай ракой, як гандлёвай дарогай. Абапал ракі ў Рэнскіх Лупняковых горах захованы надзвычайныя запасы падземнага багацьця. Усё гэта выклікала згуртаваньне тутака многалічных прамысловых і гандлёвых гарадоў.

Гандлёвым асяродкам акругі зьяўляецца *Кэльн* (634000 нас.), што ляжыць у нізіне, якая ўдаецца паміж горстаў у Сярэднюю Нямеччыну з поўначы. Адгэтуль па Рэне пачынаецца асабліва вялікі параходны рух, так што горад зьяўляецца вельмі важнай рэчнай прыстаньню. Апроч таго, горад ляжыць на карацейшай чыгунцы з Бэрліну і Гамбургу ў Парыж. Кэльн мае шмат цікавых рэштак старасьветчыны.



Прыгожы кэльнскі сабор набыў славу аднаго з найпякнейшых будынкаў сьвету. Фабрычная прамысловасьць гораду складаецца з вырабу машын, чакаляды, одэколёну (eau de Cologne, пафранцуску—кэльнская вада).

На захад ад Кэльну на мяжы з Бэльгіяй ляжыць *Ахэн* (146000 нас.) асяродак здабываньня медзі і вугалю, а на поўдзень, на мяжы з Францыяй—*Саарбрукен* (105000 н.), асяродак Саарскіх каменна-вугальных пакладаў, захопленых Францыяй пасьля вайны.



Мал. 66.—Кэльн.

Значна большую вагу маюць гарады, якія ляжаць на поўнач ад Кэльну па рэчках Вупэр і Рур. Там гарады стаяць так блізка адзін ад аднаго, што месцам зьліваюцца ў цэлае мора фабрык і жылых будынкаў. Адны з гэтых гарадоў, як *Эльбэрфэльд* (157000 нас.) і *Бармэн* (156000 нас.), якія ўжо злучыліся ў адзін падвойны горад, апрацоўваюць пераважна баваўну, лён, шоўк і выробляюць крамніну; другія (Рэмшэйд, Золінгэн)—вырабляюць жалезныя прылады: нажы, сярпы, косы; трэція (Дортмунд 295000 н.) зьяўляюцца асяродкамі нетракапальнай прамысловасьці. На чале ўсіх гэтых га-

радоў стаіць *Эсэн* (439000 нас.) на Руры з самымі вялікімі фабрыкамі на сьвеце, якія належалі да фірмы Крупа і выраблялі зброю, бліндажы, гарматы, рэйкі, вагоны, паравозы і нават цэлыя морскія вайсковыя караблі. Да фабрык Крупа належаць свае вугальныя капальні, свае жалезныя і мядзяныя рудні ня толькі ў Нямеччыне, але нават у Гішпаніі і іншых краёх. Шпаркі рост Крупаўскіх фабрык лічыцца адным з найвялікшых дзіваў капіталістычнага сьвету. Моц і магутнасьць Нямеччыны, якая выявілася ў час вайны 1914—18 г., у значнай меры грунтавалася на вырабах гэтых фабрык. Пасьля вайны фабрыкі Крупа ўжо не выробляюць зброі.



Мал. 67.—Кэльнскі сабор.

Прыстаньню Рурскіх ваколіц на Рэне зьяўляецца *Дусэльдорф* (407000 нас.), які адначасна вывозіць тавары *Крэфэльду* (124000 нас., шоўкавыя вырабы), *Дуйсбургу* (244000 н.) і іншых гарадоў, што ляжаць на захад ад Рэну.

На ўсход ад Рэнскіх Лупняковых гор у вышнявіне Вэзэру плоскахваляватае ўзвышша Вышняга Гэсэну мае свой гандлёва-прамысловы ася-



родак—*Касэль* (162000 нас.), а на поўначы па-за Вэзэрам на мяжы з Паўночна-Заходняй Нямеччынай ляжыць падвойны горад *Ганоўэр* (310000 н.) з Ліндэнам (82000 нас.), вядомы вырабам машын, мэблі і каўчуковых тавараў.

На паўднёвы ўсход ад Гановэру сярод нізінных праcтораў уздымаецца самотны горст—Гарц.

На самым вышэйшым пункце гэтага горсту Брокене (1143 м.), заўсёды завінутым у хмары, асабліва часта бачылі т. зв. брокенскае зьявішча. Увечары чалавек, стоячы на версе гэтай гары, бачыць на хмарах свой цень надзвычайна вялікіх разьмераў, навокала якога разыходзяцца кругі ўсіх колераў вясёлкі. Зьявішча гэта тлумачыцца пераламленьнем праменяў заходзячага сонца, але выклікала шмат баек аб зданях, якія, па народных поглядах, жывуць на гэтай гары.

На ўсход ад Гарцу распасьціраецца ўраджайная раўніна Ніжняй Саксоніі, багатая пакладамі рознастайных соляй і засевамі цукровых буракоў. Асяродкам гэтай акругі зьяўляецца *Магдэбург* (286000 н.) на сярэдняй Лабе з буйнымі цукраварнямі і бравaрамі. На поўдзень ад Гарцу цягнецца Турынгская катліна, якая з поўначы абмяжована горстам Турынгскага Лесу.

Да рэволюцыі 1918 г. гэтая мясцовасьць складалася з 35 асобных кавалкаў, якія належалі да 11 дзяржаў Нямецкай імпэрыі. Цяпер яны аб'яднаціся ў адзіную Турынгскую самаўрадную рэспубліку.

Яшчэ далей на ўсход цягнуцца Саксонскія Рудныя горы, у акрузе якіх здабываецца шмат каменнага вугалю, серабра і цыны. Даліна Лабы з зрывістымі сьценкамі і прыгожымі ваколіцамі аддзяляе Саксонскія Рудныя горы ад Лабскіх пескавіковых гор, за якімі цягнуцца Лужычанскія горы, залюдненыя вэндамі. Акругі Саксонскіх Рудных, Лабскіх і Лужычанскіх гор складаюць самаўрадную рэспубліку Верхнюю Саксонію, густа залюдненую мясцовасьць, падобную да Рурскай каменна-вугальнай акругі, па колькасьці гарадоў, рудняў і капальняў. Найвялікшыя з тутэйшых гарадоў: *Хэмніц* (304000 нас.), які завуць Нямецкім Манчэстэрам за яго вялізныя баваўняныя фабрыкі, *Дрэздэн* (529000 нас.) на Лабе, даўная сталіца Саксоніі, слынная разьвіцьцём мастацтва і пісьменства і *Лейпцыг* (604000 нас.), гандлёвы асяродак краю, слынны сваімі кірмашамі, гандлем, школьнымі прыладамі і кнігамі.

На ўсход ад Лужычанскіх гор аж да вышнявіны Одэру цягнуцца Судэты, вялікі горст, урэзаны між Паўночна-Ўсходняй Нямеччынай і Чэскім масывам.

**Паўднёвая Нямеччына** займае прастору на поўдзень ад прытокі Рэну Майну аж да паўночных схілаў Альп. На захадзе гэтая краіна мяжуецца з Усходняй Францыяй, на ўсходзе яе мяжу складае горставы

ланцуг Чэскі Лес. Паверхня тут яшчэ болей match розанастайная, як у Сярэдняй Нямеччыне. Значныя горы чаргуюцца тутака з катлінамі-грабэнамі, па якіх працякаюць важныя суднаходныя рэкі.

Да гэтых грабэнаў належаць: Вышня-Рэнская нізіна, што аддзяляе Францыю ад Нямеччыны; Швабія, або вадазбор Нэкару, прытокі Рэну; Франконія, па якой цячэ Майн; нарэшце даліна Вышняга Дунаю. Грабэны гэтыя аддзяляюцца адзін ад аднаго горстамі, да якіх належаць: Шварцвальд (Чорны Лес), гранітнае ўзвышша, выцягнутае між Вышня-Рэнскім грабэнам і Швабіяй; Шваба-Франконская Юра, што апускаецца прыступкамі ў бок Швабіі і Франконіі, а ў бок Дунаю абрываецца вапняковым схілам, слынным сваімі пячорамі, зьнікаючымі рэкамі і іншымі карставымі зьявамі, нарэшце крышталічны горст Чэскі Лес, узграпічны між Нямеччынай і Чэхіяй.

Самая паўднёвая частка краіны, што ляжыць на поўдзень ад Дунаю, завецца Шваба-Баварскім плоскаўзвышшам, паволі павышаецца на поўдзень і пераходзіць у прыгор'і Альп. Гэтае плоскаўзвышша абвадняецца левымі альпійскімі прытокамі Дунаю, і на поўдні завалена адкладамі альпійскіх ледавікоў, сярод якіх раскіданы невялікія ледавіковыя вазёры.

Катліны Паўднёвай Нямеччыны (асабліва Вышня-Рэнскі грабэн і Франконія) адзначаюцца ўраджайнымі лёэсавымі грунтамі, прыемным сонечным клійматам і багатай расьліннасьцю.

Сярэдняя тэмп. году ў Нюрнбэрзе ў Франконіі+8,4°, сяр. студзеня—1,3°, ліпеня+18,7°.

Там добра ўзрастае вінаграднік і розныя пладовыя дрэвы, сьпеюць кіяхі і пшаніца, сустракаецца нават ядобны каштан.

Горы краіны не дасягаюць значнай вышыні (вярхі Шварцвальду ледзь перавышаюць 1400 м. н. р. м.), але на вярхох іх ёсьць сьляды даўнага зьледзяненьня, грунты іх горшыя, як па катлінах, клімат халаднейшы і вільгатнейшы, схілы парасьлі густымі лясамі.

(З гэтай прычыны яны і маюць назоў wald'аў або лясоў Шварц-вальд, яго працяг Одэн-вальд, Чэскі Лес).

Шваба-Баварскае плоскаўзвышша мае таксама параўнаўча халодны клімат і многа ападкаў і адзначаецца багацьцем на балоты і поплавы.

Сярэдняя тэмп. году ў асяродку плоскаўзвышша ў Мюнхэне +7,5°, сяр. студзеня—2,2°, ліпеня+17,5°. Ападкаў там 840 мілім.

Тут ужо ня можа расьці ані вінаграднік, ані ядобны каштан. Пладовыя дрэвы, кіяхі і пшаніца растуць дрэнна.

Наагул як паверхня, гэтак і клімат у Паўднёвай Нямеччыне яшчэ болей розанастайны, чым у Сярэдняй.



Насельнікі краіны—паўднёвыя немцы—вясёлы, простадушны і сумленны народ. Гэта бліжэйшыя родзічы альпійскіх немцаў, да якіх яны падобны і абліччам, і мовай, і звычаямі.

Тутэйшыя немцы належаць да чатырох асобных пляменьняў. На поўначы жывуць франкі, тыя самыя, што й на захадзе Сярэдняй Нямеччыны; у Вышня-Рэнскім грабэне і ў Шварцвальдзе жывуць алеманы, тыя-ж, што ў Швайцарыі; у вадазборы Нэкару і каля пачаткаў Дунаю швабы, на паўднёвым усходзе —баювары. У сярэднія вякі кожнае з гэтых пляменьняў мела тут сваё гэрцогства, амаль-што незалежную дзяржаву. Межы гэтых дзяржаў часта зьмяняліся. У апошнія перад вайной гады тут існавалі 2 каралеўствы—Баварыя і Вюртэмбэрг (Швабія), гэрцогствы Бадэн (Вышня-Рэнскі грабэн і Шварцвальд) і Гэсэн (Одэнвальд). Апроч таго, маленькія куточкі належалі да галоўнай нямецкай дзяржавы—Прусіі. Усе гэтыя дзяржавы ўваходзілі ў склад Нямецкай імпэрыі і былі ў поўнай залежнасьці ад Прусіі. Толькі Баварыя, асяродкам якой было паўднёвае плоскаўзвышша, была болей самастойнай. Па сваёй прыхільнасьці да дысцыпліны і старасьветчыны баварцы трошкі нагадваюць прусакаў. Гэтым, а таксама роўнай паверхняй Баварскага плоскаўзвышша тлумачыцца стварэньне імі значнай дзяржаўнай адзінкі, улада якой распасьціралася на Франконію і нават на левы бераг Рэну, і дзе да Баварыі належыць так званы Рэнскі Пфальц на мяжы Лётарынгіі і Рэнскіх земляў Сярэдняй Нямеччыны. У Нямецкай імпэрыі Баварыя была галоўнай дзяржавай пасьля Прусіі, а як старонка каталіцкай веры, зьяўлялася важнай процівагай лютэранскай Прусіі. Пасьля рэволюцыі 1918 году ўсе каралеўствы і гэрцогствы Паўднёвай Нямеччыны зрабіліся самаўраднымі рэспублікамі Нямецкай фэдэрацыі. З гэтых рэспублік Баварыя зьвязана з фэдэрацыяй слабей, як усе іншыя часткі Нямеччыны. Часова пасьля рэволюцыі Баварыя была нават зусім незалежнай Савецкай Рэспублікай, якую аднак задушылі правыя організацыі пры дапамозе Антанты.

Люднасьць у Паўднёвай Нямеччыне жыве значна радзей, чым у Сярэдняй. Большасьць насельнікаў займаецца тут сельскай гаспадаркай. Збожжа сеюць пераважна па нізінах і на Шваба-Баварскім плоскаўзвышшы. Жыта, якое грае ролю галоўнага гатунку збожжа ў Паўночнай і Сярэдняй Нямеччыне, тут засяваецца толькі па горных схілах. У грабэнах яго замянае пшаніца або часамі і кіяхі, на Шваба-Баварскім плоскаўзвышшы—ячмень, які йдзе там на піваварні. Хмель, патрэбны для вырабу піва, таксама засяваецца галоўным чынам на гэтым плоскаўзвышшы. У Вышня-Рэнскім грабэне, дзе гушчыня залюдненьня вельмі значная, вялікую вагу мае гароднiцтва і садоўніцтва. Пладовыя дрэвы там іншы раз растуць шэрагам па палёх пшаніцы, як у Лямбардзкай нізіне і іншых мясцовасьцях Італіі. Вінаграднi трапляюцца ў катлінах (Вышня-Рэнскай, Швабіі, Франконіі), і вінаграду тутака зьбіраюць значна болей, чым у Сярэдняй Нямеччыне. Па горах ральніцтва адыходзіць на другі плян, і на першае месца выходзяць гадоўля жывёлы і лясныя промыслы. Найлепшыя гатункі быдла пасьвяцца па лугох Шваба-Баварскага плоскаўзвышша.

Карысных мінэралаў у краіне значна меней, як у Сярэдняй Нямеччыне. Каменнага вугалю няма зусім, буры вугаль трапляецца толькі каля прыгор'яў Альп. У падгор'ях Чэскага Лесу ёсьць жалезная руда, месцам сустракаецца соль (у Бадэне і Вюртэмбэрзе) і слынны літографскі лупняк (у Франконскай Юры), які зьяўляецца спэцыяльнасьцю Паўднёвай Нямеччыны.

Буйная фабрычная прамысловасьць карыстаецца сярэдня-нямецкім апалам і мае значна меншую вагу, як у Сярэдняй Нямеччыне. Галоўныя фабрычныя акругі ляжаць у катлінах. Затое па ўзвышшах з даўных часоў пашырылася саматужная прамысловасьць (у Шварцвальдзе): выраб гадзінькаў, апрацоўка дрэва і мэталаў.



Мал. 68.—Старасьвецкі замак Гогенцолерн у Паўднёвай Нямеччыне.

Наагул нетракапальная і фабрычная прамысловасьць займае прыблізна столькі-ж працоўных рук, колькі і сельская гаспадарка. У паселішчах вясковага тыпу—вёсках і хутарох—жыве прыблізна столькі-ж людзей, як і па гарадох і мястэчках. Хутары спатыкаюцца часьцей, як вёскі, асабліва на Шваба-Баварскім плоскаўзвышшы. Сялянскія хаты тамака, як і ў Сярэдняй Нямеччыне, двохпаверхавыя, крытыя дахоўкай. Аднак у адзнаку ад сярэдня-нямецкіх двароў тут у аднэй хаце зьмяшчаюцца і людзкія пакоі і памяшканьні для жывёлы, сена і сельска-гаспадарчых прыладаў. На другім паверсе навокала ўсёй хаты цягнецца адкрытая вэранда.



Гарады Паўднёвай Нямеччыны красавалі ўжо ў сярэднія вякі, вялі бойкі гандаль і складаліся ў магутныя гандлёвыя хаўрусы гарадоў; рамёслы і прамысловасьць, навука і мастацтва дасягалі ў іх значнага разьвіцьця. У пазьнейшыя часы агульны заняпад Нямеччыны выклікаў заняпад і паўднёва-нямецкіх гарадоў. Толькі ў XIX в. ізноў яны пачалі расьці і адбудоўвацца адначасна з узрастаньнем прамысловасьці і гандлю ўва ўсёй Гэрманіі.

Згодна з гэтымі двума пэрыодамі ўзрастаньня большасьць тутэйшых гарадоў складаецца з дзьвёх частак: старасьвецкага гораду, у якім пераважваюць вузкія завулкі, готычныя цэрквы, сярэдня-вяковыя будынкі, крытыя дахоўкай, а часамі захаваліся і руіны даўнай гарадзкой сьцяны, і сучаснага гораду з многапаверхавамі камяніцамі, фабрыкамі, палацамі музэяў, вакзалаў і унівэрсытэтаў, з бульварамі й шырокімі вуліцамі.



Мал. 69.—Мюнхэн. Гарадзкая ратуша.

Найвялікшы горад краіны *Мюнхэн* (631000 нас.) ляжыць у асяродку Шваба-Баварскага плоскаўзвышша і гандлюе сельска-гаспадарчымі вырабамі гэтай акругі. Дзякуючы свайму унівэрсытэту і вышэйшай тэхнічнай школе, горад зьяўляецца важным культурным асяродкам. Як сталіца Бавары, ён меў у Паўднёвай Нямеччыне такую-ж вагу, як сталіца Прусіі, Бэрлін, на поўначы.

У вадазборы вышняга Майну (ў Баварскай Франконіі) ляжыць старасьвецкі прамысловы *Нюрнбэрг* (353000 нас.), слынны вырабам піва, дзіцячых цацак, алоўкаў і розных вучэбных прылад.

На ніжнім Майне ляжыць гандлёвы *Франкфурт* (433000 нас.), у якім крыжуюцца важныя дарогі з Вены ў Кэльн і Голяндыю, з Страсбургу ў Гамбург і Бэрлін.

На вышнім Нэкары (ў Швабіі) пануе *Штутгарт* (309000 нас.) з значнай прамысловасьцю і кніжным гандлем.

На захадзе краіны няма такіх буйных гарадоў, але там шмат другарадных гарадоў, з якіх некаторыя (*Бадэн-Бадэн* у Шварцвальдзе) вядомы, як здароўніцы, другія (*Гейдэльбэрг*), як культурныя унівэрсытэцкія гарады. Галоўны з іх *Мангэйм* (230000 нас.) на Рэне—апошні пункт, да якога даходзяць буйныя рэнскія параходы, важны гандлёвы асяродак.

Вышэй яго па Рэне ходзяць толькі маленькія плоскадонныя судны, і Рэн з сваімі балотнымі берагамі зьяўляецца там перашкодай для зносін паўзьбярэжнай люднасьці. Правы і левы берагі Рэну вышэй Мангэйму належаць да розных дзяржаў і розных географічных старонак.

## Чэскі масыў.

(Азнач яго географічнае палажэньне. З якімі краінамі ён мяжуецца на поўдні, на захадзе і на поўначы?).

На ўсход ад Паўднёвай Нямеччыны распасьціраецца Чэскі спрадвечны масыў. Калісь, яшчэ ў першыя часы жыцьця зямлі, тут існавала магутнае ўзвышша. Мільёны гадоў дажджы і рэкі руйнавалі і размывалі гэтую старонку, змывалі тыя пласты земных парод, з якіх складалася яе паверхня, але праз увесь гэты час старонка была сухазем'ем, толькі пакрысе рабілася ўсё ніжэй і ніжэй. Некалькі разоў мора залівала суседнія краіны, і Чэскі масыў рабіўся востравам, але хіба толькі маленькія часткі яго пераварочваліся ў затокі суседніх мораў. Большая частка краю ніколі не пакрывалася вадой. Не зьмянілася Чэская старана і тагды, як навокала яе ў Сярэдняй і Паўднёвай Нямеччыне пачалі ўтварацца горсты і грабэны. Горсты (Судэты, Саксонскія Рудныя горы, Чэскі Лес) утварыліся толькі на ўскрайках масыву, і ён зрабіўся катлінай, з усіх бакоў абкружанай горнымі сьценамі. Сучасны выгляд паверхні гэтай катліны залежыць ад уласьцівасьцяй земных парод, якія выступалі ў ёй на паверхню даўней. Там, дзе на паверхню выступалі цьвёрдыя граніты і іншыя скалы, якія дрэнна размываліся вадой, там утварыліся ўзгор'і. Наадварот, там, дзе павярхоўныя пласты былі мяккімі, вада змыла іх, а на іх месцы стварыліся нізіны.

Значныя ўзгор'і праходзяць па сярэдзіне краю на вадападзеле Лабы і Дунаю. Гэта так званыя Чэха-Мараўскія ўзгор'і, на паўночны захад ад якіх у вадазборы Вышняй Лабы ляжыць Богемія або ўласна-Чэхія, а на паўднёвы ўсход—нізіна ракі Маравы, аднэй з прыток Дунаю. З паўдня



Чэскі масыў аддзяляецца ад Венскай нізіны так званымі Аўстрыйскімі ўзгоркамі. Досыць значныя ўзгор'і праходзяць і па самай сярэдзіне ўласнай Чэхіі.

З гэтых сярэдня-чэскіх узгор'яў найболей вядомы Брды Лес, у якім каля мястэчка Пшыбрам знаходзяць многа рознага падземнага багацьця і ў тым ліку нават срэбную руду.

Дзякуючы горам, якія атачаюць Чэскі масыў і засланяюць яго ад заходніх і паўночных вятроў, клімат краю параўнаўча сухі з досыць цёплым летам. Ападкаў тут выпадае ня лішне многа (500—600 мілм.), але яны разьмяркованы роўна па порах году, і сухменяй тут ня бывае. Занадта гарачыя дні (з сярэдняй тэмпэратурай ночадзеньня ў+20° і болей) тут зьяўляюцца рэдкасьцю, але цяплыні хапае для ўзрастаньня ў большай частцы краіны вінаградніку і іншых далікатных расьлін. Узімку маразы чаргуюцца з адлігамі.

Сярэдняя тэмпэратура году ў Празе ў Богеміі+8,8°, сяр. тэмп. студзеня—1,2°, ліпеня+19,3°.

Расьліннасьць Чэскага краю складаецца з ліставых лясоў, у якіх пераважваюць бук і дуб. Зразумела, што й тут, як паўсюды ў Заходняй Эўропе, большая частка гэтых лясоў перавернена чалавекам на нівы і сенажаці, але па горах лясоў захавалася яшчэ даволі.

Галоўную масу насельнікаў краю складаюць чэхі, але па ўскрайках масыву жыве многа немцаў.

Чэхі параўнаўча з іншымі славянскімі народамі адзначаюцца высокай культурнасьцю, працаздольнасьцю, сумленнасьцю. Гэтым яны трохі нагадваюць немцаў. Гэта ўпарты, спакойны і энэргічны народ, нацыянальна-сьвядомы і здольны. Вельмі вялікую здольнасьць выявілі чэхі ў мастацтве, асабліва ў музыцы. Высока стаіць сярод чэхаў спорт. Тут між еншым утварыўся і адгэтуль распаўсюдзіўся па ўсіх славянскіх краёх слынны спартыўны хаўрус „Сокал", які меў на мэце фізычнае разьвіцьцё славянскай моладзі. На долю чэскага народу выпала шматвяковае змаганьне з немцамі, якія жывуць на поўнач, на захад і на ўсход ад чэхаў. Перажыткам гэтага гістарычнага змаганьня зьяўляецца нацыянальная варажасьць, якая й да гэтага часу засталася паміж немцамі і чэхамі Чэскага масыву.

Першапачатковымі насельнікамі краю лічацца кельты—плямя бояў. Прыблізна ў першыя часы хрысьцянскай эры з поўначы сюды надыйшло гэрманскае племя маркоманаў, але ў часы вялікіх перасяленьняў іх адгэтуль выцісьнулі славянскія народы—чэхі і маравы, якія тут асталяваліся і залажылі сваё дзяржавы: спачатку Мараўскае княства, потым Чэскае каралеўства. Будова паверхні спрыяла захаваньню чэхамі сваіх нацыянальных асаблівасьцяй. Пад заслонай ускрайных гор Чэскае каралеўства доўга бараніла сваю незалежнасьць ад націску су-